3 ок-1
1420

…РАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

№ 1

КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ

ОРГАН
НАРКАМАСЬВЕТЫ
І ЦП САЮЗУ
ПРАЦАСЬВЕТЫ
БССР

2240

ДЗЯРЖАЎНАЕ
ВЫДАВЕЦТВА
БЕЛАРУСІ

1933

ЗОК-1
1420

К-63.
3 ОК-1
1420

Пролетары ўсіх краін, злучайцеся!

КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ

ОРГАН
НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ
АСЬВЕТЫ
І ЦП САЮЗУ
ПРАЦАСЬВЕТЫ
БССР

СТУДЗЕНЬ • 1

Навукова-дасьледчы інстытут
Бібліятэка
камуністыч. выхаваньня
2240
Інв. 1933 г.
БССР
Бібліятэка імені Леніна

Менск ★ 1933
Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі

ЗЬМЕСТ

Стар.

Аб практычных мерапрыемствах па рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і ЦВК СССР аб перабудове работы масавай школы, ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў 3
Аб рэалізацыі пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб масавай школе, ВНУ і тэхнікумаў. 17
Х. КАЗАКОЎ—За поўную рэалізацыю пастановы Сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б у галіне масавай школы 27

За тэхніку пэдагагічнага працэсу

Л. ШАШКОЎ—Якім ёсьць і якім павінен быць урок. Стэнаграма уроку на фізыцы ў V групе 22-й Менскай ФЗС. 30
С. РАВІН.—Становішча геаграфіі ў IV групе школ БССР . . . 45
А. НЕМЦОЎ—Дапамога адстаючым у школах ФЗС і ШКМ. . . 62

Абмен вопытам працы

В. ЗАЙЦАЎ—Адна з перадавых 65

Масавая праца

М. С.—Тэхпрагaнда праз палітасьветныя ўстановы 71

Крытыка і бібліяграфія

М. ЦЫГАНАУ—„Маятнік". 85

Інфармацыя

Пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту Асьветы БССР ад 10-XII—32 г. 88
Палажэньне аб кіраўніцтве школай, правах і абавязках загадчыка, яго намесьніка ды іншых працаўнікоў школы 89
Палажэньне аб школьным савеце ФЗС і ШКМ БССР 90
Палажэньне аб Камітэтах Садзейнічаньня пры ўстановах сацыяльнага выхаваньня 99

Заказ № 322. 7.000 экз. ($6^1/_2$ арк.) Уп. Галоўлітбелу №а 1.

Друкарня імя Сталіна.

АБ ПРАКТЫЧНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАСТАНОЎ ЦК УСЕКП(б), ЦК КП(б)Б І ЦВК СССР АБ ПЕРАБУДОВЕ РАБОТЫ МАСАВАЙ ШКОЛЫ, ВНУ, ВТНУ І ТЭХНІКУМАЎ

(Пастанова IV Пленуму ЦК КП(б)Б па справаздачных дакладах Наркомасьветы, Наркомлёгпраму, Наркомцяжпраму і Наркомзему)

А. У ГАЛІНЕ МАСАВАЙ ШКОЛЫ

Заслухаўшы справаздачны даклад Наркомасьветы БССР і садаклад ЦКК РСІ аб практычных мерапрыемствах па выкананьні пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб масавай школе—пленум ЦК КП(б)Б констатуе наяўнасьць раду посьпехаў у будаўніцтве савецкай політэхнічнай школы ў БССР.

Толькі за гады першай пяцігодкі, з 1928—29 г. па 1932—33 г., сетка масавых пачатковых школ узрасла з 5 700 да 6 900, колькасьць вучняў з 503 185 чал. да 993 тыс., бюджэт школы ўзрос з 13 727 тыс. руб. у 1928—29 г. да 53 140 тыс. руб. у 1932 г.

На аснове завяршэньня ўсеагульнага першапачатковага абавязковага навучаньня ўведзена ў БССР у 1932 г. усеагульнае абавязковае сямігадовае навучаньне і організавана 40 восьмых груп. Ёсьць значныя зрухі ў галіне будаўніцтва школы нацменшасьцяй (рост колькасьці вучняў у яўрэйскіх школах з 26 531 у 1928—29 г. да 36 тыс. у 1932 г., у польскіх школах з 8 674 тыс. у 1928—29 г. да 17 тыс. у 1932 г., разгортваньне латыскай, літоўскай, украінскай школы).

Пленум ЦК лічыць, што ў выкананьні пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б дасягнуты толькі некаторыя зрухі ў галіне ліквідацыі карэннага недахопу школы—недастатковага аб'ёму агульнаадукацыйных ведаў. Новыя навучальныя програмы сталі некалькі вышэй па аб'ёме ведаў і больш сыстэматызаванымі па разьмеркаваньні вучэбнага матэрыялу ў параўнаньні з мінулымі гадамі. Узмацняецца вядучая роля настаўніка, умацоўваецца дысцыпліна і ўнутраны распарадак у школе.

Разам з тым пленум ЦК КП(б)Б з усёй катэгорычнасьцю падкрэсьлівае, што дасягнутыя зрухі па выкананьні пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб масавай школе зьяўляюцца зусім недастатковымі; што тэмпы перабудовы школы яшчэ астаюцца

нездавальняючымі і што карэнныя недахопы школы яшчэ не ліквідаваны.

Да гэтага часу яшчэ вельмі слаба пастаўлена конкрэтнае опэратыўнае кіраўніцтва і своечасовая мэтодычная дапамога школе з боку НКА і РайАНА.

У новых програмах ёсьць значныя недахопы, а ў некаторых (грамадазнаўства, літаратура, мова) прынцыпова-палітычныя памылкі. У радзе мэтодычных указаньняў НКА былі дапушчаны памылковыя ўстаноўкі, рэкомэндаваўся, як асноўны, так званы «ляборатарна-брыгадны мэтод» работы школ, які вёў да арганізацыі сталых брыгад, да скажэньняў у выглядзе абязьлічкі ў навучальнай рабоце, да зьніжэньня ролі пэдагога і ігнараваньня ў шматлікіх выпадках індывідуальнай вучобы кожнага вучня.

ДВБ і ДВС НКА не забясьпечылі своечасовага выданьня падручнікаў і програм для школ, у выніку чаго школы забясьпечаны падручнікамі толькі на 43.5 проц.

Пленум ЦК адзначае, што яшчэ да гэтага часу значная частка раённых і нізавых партыйных, савецкіх, профэсіянальных, комсамольскіх організацый, недаацэньваючы вялізарнага палітычнага значэньня барацьбы за рэалізацыю пастаноў ЦК партыі аб школе, адсоўваюць гэтую работу на другое месца і нярэдка проціпастаўляюць яе гаспадарчым кампаніям. Гэтыя раённыя партыйныя, савецкія, профсаюзныя і комсамольскія організацыі не падхапілі і не замацавалі энтузіязму рабочых і ўсіх працоўных мас на выкананьне пастаноў ЦК аб школе, у выніку чаго падрыхтоўка да новага навучальнага году ў значнай колькасьці раёнаў праведзена нездавальняюча і не забясьпечыла нормальнай работы школы. Пленум ЦК адзначае зусім нездавальняючую пастаноўку кіраўніцтва школьнай справай з боку Бярэзінскага, Чашніцкага, Цэрахоўскага, Аршанскага, Лепельскага і Петрыкаўскага РК КП(б)Б і РВК.

Пленум адзначае палепшаньне матэрыяльнага снабжэньня настаўніцтва па г. Менску, Дзяржынскім раёне і некаторых іншых у выніку выкананьня партыйнымі організацыямі гэтых раёнаў дырэктывы ЦК аб прымацаваньні настаўнікаў да ЗРК і аб парадку снабжэньня вясковых настаўнікаў. Аднак, у пераважнай большасьці раёнаў дырэктывы сакавіцкага пленуму ЦК у гэтай частцы выконваюцца зусім слаба.

Ухваляючы пастановы Бюро ЦК ад 31 ліпеня і ад 2 кастрычніка аб масавай школе, пленум ЦК падкрэсьлівае выключна важнае значэньне барацьбы за якасьць работы школ, неабходнасьць рашучага пералому ў справе хутчэйшай рэалізацыі ўказаньняў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе і прапануе Гаркомам і РК КП(б)Б правесьці на працягу сьнежня—студзеня месяцаў праверку рэалізацыі гэтых пастаноў, організаваўшы навакол гэтай справы шырокую савецкую грамадзкасьць.

Выходзячы з асноўнай палітычнай задачы, пастаўленай перад партыяй у другую пяцігодку XVII Усесаюзнай партконфэрэн-

цыяй—канчатковай ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў і кляс наогул, падоленьня перажыткаў капіталізму ў экономіцы і са-знаньні людзей, з неадкладнай гаспадарчай задачай—падрыхтоўкі высокакваліфікаваных і масавых кадраў для завяршэньня рэкан-струкцыі народнай гаспадаркі краіны,—пленум ЦК падкрэсьлівае, што важнейшай і рашаючай задачай у галіне народнай асьветы ўсіх партыйных, комсамольскіх, піонэрскіх, савецкіх і профсаюз-ных організацый, органаў нарасьветы, кожнай школы і кожнага настаўніка—зьяўляецца далейшая ўпорная барацьба за павы-шэньне пісьменнасьці вучняў, за грунтоўнае аўладаньне імі асновамі навукі, за выхаваньне з іх сьвядомых і актыўных будаў-нікоў бясклясавага соцыялістычнага грамадзтва, выпрацоўкі соцыялістычных адносін да вучобы, працы і грамадзка-практыч-най работы і п а с т а н а ў л я е:

Аб увядзеньні дзесяцігадовага навучаньня

1. У мэтах ажыцьцяўленьня програмы партыі аб увядзеньні абавязковага агульнага і політэхнічнага навучаньня ўсіх дзяцей і падросткаў да 17 год, а таксама ў мэтах хутчэйшага ўзьняцьця ўзроўню агульна-адукацыйнай і політэхнічнай падрыхтоўкі вуч-няў сярэдняй школы, пашырэньня падрыхтаваных контынгентаў для вышэйшай школы і ліквідацыі ўзроставай неадпаведнасьці паміж вышэйшай і сярэдняй школамі, даручыць НКА і Дзярж-пляну прыступіць да распрацоўкі пляну ўвядзеньня ў БССР усеагульнага навучаньня за 10-гадовую школу, улічваючы неаб-ходнасьць першачарговага разгортваньня дзесяцігодак у прамы-словых цэнтрах і важнейшых сельскагаспадарчых раёнах.

2. СНК распрацаваць мерапрыемствы па ахопе ўсіх падрост-каў ва ўзросьце ад 15 да 17 год як існуючай сыстэмай проф-тэхнічнай адукацыі (ФЗВ, ШВМП), так і сыстэмай школ для дарослых.

II. Аб програмах, падручніках і рэжыме школы

1. Пленум падкрэсьлівае вялізарнае прынцыповае значэньне выхаваньня ў савецкай школе сьвядомай пролетарскай дысцып-ліны. Школа павінна разам з пролетарскай грамадзкасьцю раз-гарнуць шырокую работу па аздраўленьні сямейна-бытавой абстаноўкі дзяцей, значна ўзмацніўшы пэдагогічную прапаганду сярод бацькоў, строга прытрымлівацца парадку і рэглямантацыі школьнай работы, не дапускаючы перагрузкі дзяцей. Неабходна разгарнуць сыстэму пэдагогічна-выхаваўчага ўзьдзеяньня на вучняў, дэзорганізуючых работу школ, належным чынам рэагуючы на кожны выпадак парушэньня дысцыпліны, прымяняючы ў край-нім выпадку выключэньне са школы. Павышэньне ва ўсёй рабоце школы кіруючай ролі настаўнікаў і яго аўторытэту зьяўляецца

неабходнай умовай у рабоце за дысцыпліну, адказнасьць за якую цалкам ляжыць на настаўніку.

2. Хутчэйшая ліквідацыя рэштак мэтодычнага прожэкцёрства і ў прыватнасьці скажэньняў брыгадна-ляборатoрнага мэтоду зьяўляецца важнейшай задачай НКА і ўсіх яго органаў. Разам з тым пленум падкрэсьлівае неабходнасьць рашучай барацьбы з імкненьнем звароту да старой славеснай школы, з ігнараваньнем самастойнай групавой, брыгаднай і індывідуальнай работы вучняў пад кіраўніцтвам настаўнікаў. Пры гэтым павінны ўсякім чынам разгортвацца колектыўныя формы вучобы, не практыкуючы арганізацыі сталых і абавязковых брыгад. Неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на моманты, ажыўляючыя заняткі і падымаючыя зацікаўленасьць дзяцей працай: дэмонстрацыя вопыту, прыбораў, схэм, малюнкаў і т. д.

3. Прапанаваць НКА і ДВБ, на падставе дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, забясьпечыць скончэньне прапрацоўкі програм і выданьне іх з такім разьлікам, каб не пазьней 1 студзеня 1933 г. у школы былі дасланы ўсе програмы. Забясьпечыць прапрацоўку гэтых програм настаўнікамі ў часе зімовага перапынку з 1-I па 15-I-33 г.

4. Баявой задачай НКА, профорганізацый, комсамолу і піонэрорганізацый павінна стаць барацьба за чыстату памяшканьня, цёплую школу, вэнтыляцыю кляс, за ўмывальнік, мыла, рушнік, перагатаваную ваду, за абсталяваньне настаўніцкай і інш. мерапрыемствы, ахоўваючыя і паляпшаючыя ўмовы працы дзяцей і настаўнікаў, а таксама за разгортваньне мерапрыемстваў па разьвіцьці фізкультуры сярод дзяцей у мэтах выхаваньня зьмены «моцнай, здаровай, з стальнымі нэрвамі і жалезнымі мускуламі» (Ленін).

5. Адзначаючы абсолютна нездавальняючае становішча з забесьпячэньнем школы падручнікамі асабліва школ нацменшасьцяй, прапанаваць ДВБ разгарнуць работу па выданьні падручнікаў так, каб не пазьней 1-I-33 г. усе школы былі забясьпечаны асноўнымі падручнікамі. Дабіцца складаньня стабільных падручнікаў па асноўных дысцыплінах.

Абавязаць органы НКАсьветы, загадчыкаў школ і ўсіх настаўнікаў усімі спосабамі прывучаць вучняў да беражлівых адносін да падручнікаў.

ЦК прапануе НКА ўзмацніць падрыхтоўку пэдкадраў для школ нацменшасьцяй; ДВБ і БАКТ'у дабіцца поўнага выкананьня пляну завозу літаратуры на мовах нацменшасьцяй.

6. Дзяржпляну і НКЛегпраму ў месячны тэрмін унесьці на Бюро ЦК свае прапановы аб расшырэньні поліграфічнай базы, асабліва па выданьні нацменлітаратуры. Наркамасьветы выдзеліць кадры для арганізацыі выданьня ў БССР падручнікаў на яўрэйскай і польскай мовах, а таксама ўмацаваць базу для выданьня ўсёй вучэбнай літаратуры.

III. Аб падрыхтоўцы кадраў для масавай школы

ЦК адзначае значны рост актыўнасьці настаўніка і павышэньне яго адказнасьці за работу, падкрэсьлівае «усё больш узрастаючую ролю настаўніка ў справе навучаньня дзяцей асновам навукі, выхаваньня ў іх сьвядомай дысцыпліны і комуністычных адносін да вучобы і працы» (з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 25 жніўня 1932 г.).

Адначасова ЦК констатуе, што ў сувязі з ўвядзеньнем усенавучу па масавай і сярэдняй школах і ліквідацыі малапісьменнасьці сярод дарослых, у рады настаўніцтва ўлілася шматтысячная армія маладых пэдагогаў, якія ня маюць дастатковай пэдагогічнай практыкі і ў значнай ступені—дастатковай пэдагогічнай кваліфікацыі.

Пленум ЦК прызнае нездавальняючай работу па падвышэньні кваліфікацыі настаўнікаў і прапануе:

1. НКА, ГК і РК КП(б)Б прыняць рашучыя захады да якаснага ўмацаваньня існуючых кароткатэрміновых курсаў.

Разам з гэтым прыступіць да паступовай замены кароткатэрміновай курсавой падрыхтоўкі настаўнікаў нормальнай падрыхтоўкай праз пэдтэхнікумы, пэдінстытуты і завочнае навучаньне.

Бюро ЦК заслухаць плян падрыхтоўкі—у адпаведнасьці з гэтым—пэдагогічных кадраў.

2. Наркомасьветы, ЦП саюзу працасьветы і РК КП(б)Б наладзіць сыстэматычную работу і аказаць усямерную дапамогу, асабліва маладым пэдагогам у падвышэньні іх кваліфікацыі, прыцягваючы да гэтай справы лепшых найбольш кваліфікаваных выкладчыкаў.

3. Катэгорычна прапанаваць усім РК КП(б)Б пад асабістую адказнасьць сакратароў РК на працягу дэкаднага тэрміну праверыць становішча матэрыяльнага снабжэньня настаўнікаў (продукты, прамтавары, зарплата) і забясьпечыць выкананьне раней даных дырэктыў па гэтым пытаньні. Даручыць Бюро ЦК заслухаць даклады некалькіх РК КП(б)Б аб выкананьні імі дырэктыў аб снабжэньні настаўніцтва і разгортваньні сярод яго масавапалітычнай работы.

4. Галоўсоцстраху, НКАЗ пры ўдзеле ЦП працасьветы організаваць у 1933 г. санаторый для настаўнікаў і два дамы адпачынку. Даручыць Бюро ЦК разгледзець конкрэтныя мерапрыемствы па ўзмацненьні работы асьветніцкай жывёла-будаўнічай коопэрацыі і забясьпечаньні яе стандартнымі дамамі. Пры пабудове новых школ будаваць і кватэры для настаўнікаў.

5. Адзначыць слабую работу органаў профсаюзў працасьветы, як у галіне мобілізацыі настаўніцтва на барацьбу за выкананьне дырэктыў ЦК аб школе, так і ў галіне абароны яго матэрыяльна-прававога становішча. Прапанаваць ГК і РК КП(б)Б правесьці

праверку работы саюзу працасьветы і прыняць безадкладныя захады да ўмацаваньня профорганізацый асьветнікаў моцнымі работнікамі, замацоўваючы іх на гэтай рабоце.

IV. Па матэрыяльным снабжэньні школ

Да гэтага часу матэрыяльнае становішча большасьці школ застаецца яшчэ нездавальняючым. Будаўніцтва па 426 об'ектах мінулых гадоў выканана ў сярэднім на 50 проц. Плян будаўніцтва гэтага году выканан толькі на 15 проц., прычым 18 школ зусім не распачаты будаўніцтвам.

Пленум адзначае недапушчальнае ігнараваньне з боку НКЛегпраму дырэктыў аб арганізацыі культпрамтрэсту і з боку НКЦяжпраму і Белсельпрамсаюзу аб вырабе політэхнічна-вучэбнага абсталяваньня, у выніку чаго школы нездавальняюча забясьпечаны політэхнічным і вучэбным абсталяваньнем. БКС ня выкананы пляны па забясьпечаньні школ сшыткамі, алоўкамі, пер'ямі і наогул неабходнымі прыладамі. Ня выканана пастанова ЦВК і СНК БССР аб перадачы школам усіх школьных будынкаў, якія скарыстоўваюцца цяпер установамі і прыватнымі жыхарамі, асабліва па гг. Менску, Віцебску і Гомелю. Адзначаючы гэтае абсолютна недапушчальнае зьявішча, пленум ЦК КП(б)Б прапануе:

1. ГК і РК КП(б)Б забясьпечыць скончэньне да 1 жніўня 1933 г. усіх ужо пачатых будаўніцтвам школьных будынкаў. СНК у адпаведнасьці з гэтым забясьпечыць школьнае будаўніцтва будматэрыяламі. Лічыць скончэньне пачатага школьнага будаўніцтва першачарговым і ўдарным. РК КП(б)Б і РВК мобілізаваць усе наяўныя мясцовыя ўнутраныя рэсурсы для выкананьня гэтай дырэктывы.

2. Катэгарычна прапанаваць усім гарсаветам і РВК на працягу месячнага тэрміну аслабаніць усе школьныя будынкі, занятыя для іншых патрэб, выселіўшы з іх установы, організацыі і асоб, якія ня маюць дачыненьня да школ. СНК праверыць выкананьне гэтай дырэктывы.

3. Даручыць Бюро ЦК разгледзець мерапрыемствы па забесьпячэньні школ БССР політэхнічным абсталяваньнем і вучэбнымі дапаможнікамі.

4. Прапанаваць БКС наладзіць нормальнае снабжэньне школ неабходнымі канц-прыладамі (алоўкі, пер'я, ручкі, чарнільніцы, крэйда), а таксама вучэбнымі дапаможнікамі (карты, глёбус, наглядныя табліцы і інш.), як шляхам цэнтралізаванага завозу, так і вырабу іх у БССР.

Пленум падкрэсьлівае, што для выкананьня задач, пастаўленых у другой пяцігодцы, правільная і чоткая пастаноўка работы школ набывае выключнае політычнае значэньне і хутчэйшая рэалізацыя дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе, на аснове барацьбы на два фронты ў будаўніцтве політэхнічнай

школы, упорная барацьба за далейшае павышэньне комуністычнага выхаваньня, за пісьменнасьць і належны аб'ём ведаў вучняў, зьяўляюцца баявой задачай усёй парторганізацыі.

Б. ПА ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ І ТЭХНІКУМАХ

Заслухаўшы справаздачныя даклады Наркомасьветы, Наркомзему, Наркомлегпраму, Упаўнаркомцяжпраму і садаклад ЦКК РСІ аб праведзеных мерапрыемствах па выкананьні рашэньняў ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і ЦВК СССР аб перабудове вышэйшай школы і тэхнікумаў, пленум ЦК адзначае наяўнасьць раду значных дасягненьняў у будаўніцтве вышэйшай школы і тэхнікуму БССР.

За гады першай пяцігодкі, з 1927—28 г. па 1932—33 г., сетка вышэйшых навучальных устаноў вырасла з 4 да 32, сетка тэхнікумаў вырасла з 30 да 130.

Значна вырас лік студэнтаў вышэйшай школы і тэхнікумаў: з 10073 чал. у 1927—28 г. да 47330 чал. у 1932 г. Значна павялічылася колькасьць пролетарскай колгаснай моладзі ў ВНУ, ВТНУ і тэхнікумах: з 50 проц. у 1931 г. да 66 проц. у 1932 г. Павялічыўся лік студэнтаў з асноўных карэнных нацыянальнасьцяй БССР, асабліва беларусаў. Растуць асыгнаваньні на вышэйшую і сярэднюю школу: з 9219 тыс. руб. у 1928—29 г. да 37671 тыс. руб. у 1932 г.

Пленум ЦК адзначае, што ў выкананьні пастаноў партыі і ўраду аб вышэйшай школе і тэхнікумах БССР ёсьць некаторы, праўда, яшчэ зусім недастатковы перадом у павышэньні ведаў, узмацненьні самастойнай работы, умацаваньні навучальнай дысцыпліны студэнтаў, некаторае ўзмацненьне ўвагі з боку наркоматаў, гаспадарчых органаў, кіраўніцтва ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў да організацыі вучэбнага процэсу, перабудовы програм, навучальных плянаў і мэтодаў выкладаньня.

Разам з тым, пленум ЦК асабліва падкрэсьлівае, што тыя нязначныя зрухі, якія ёсьць у перабудове вышэйшай школы і тэхнікумаў БССР, зьяўляюцца зусім недастатковымі, тэмпы і размах перабудовы зусім нездавальняючымі і не адпавядаючымі ўзросшым запатрабаваньням народнай гаспадаркі краіны.

У сувязі з гэтым пленум ЦК лічыць работу наркоматаў: НКЗему, НКЛП, НКАсьветы, Цяжпраму, НКСнабу ў практычным выкананьні апошніх пастаноў партыі і ўраду аб вышэйшай школе нездавальняючай.

Пленум ЦК адзначае, што асноўныя недахопы ў рабоце ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў, указаныя ў апошніх пастановах ЦК партыі і ЦВК СССР, аднабаковая ўвага да колькаснага росту сеткі і вучняў, пры зусім недастатковай увазе да пытаньняў якасьці навучальнай падрыхтоўкі, празьмернае драбленьне ВНУ і спэцыяльнасьцяй, наяўнасьць фактаў мэтодычнага прожэкцёрства

ў мэтодах навучаньня, скажэньні і буйныя недахопы ў практыцы правядзеньня брыгадна-лябараторнага мэтоду, які ўжываўся як усеагульны і абавязковы, што прыводзіла да значнага зьніжэньня якасьці навучаньня, буйныя недахопы ў правядзеньні бесьперапынна-вытворчай практыкі,—мелі і маюць яшчэ месца ў рабоце вышэйшай школы БССР.

Да гэтага часу не перагледжана сетка вышэйшых школ і тэхнікумаў, не ўстаноўлены профілі навучальных устаноў, не перагледжаны вучэбныя пляны і програмы, не разгорнута работа па стварэньні вучэбнай і навукова-тэхнічнай спэцыяльнай літаратуры, зусім недастаткова ўдзяляецца ўвагі падбору кваліфікаваных кадраў профэсуры і выкладчыкаў.

Пленум ЦК КП(б)Б адзначае таксама зусім недастатковую ўвагу з боку значнай колькасьці гарадзкіх і раённых партыйных, комсамольскіх організацый да задач перабудовы вышэйшай школы і тэхнікумаў, недаацэнку вялізарнага палітычнага і народнагаспадарчага значэньня проблемы стварэньня высокакваліфікаваных кадраў для соцыялістычнага будаўніцтва.

Пленум ЦК КП(б)Б адзначае, што ажыцьцяўленьне сусьветна-гістарычных задач другой пяцігодкі, задач завяршэньня рэконструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, стварэньня навейшай тэхнічнай базы для ўсіх галін народнай гаспадаркі,—прад'яўляюць павышаныя запатрабаваньні да тэорэтычнага ўзроўню савецкіх спэцыялістаў—інжынэраў, тэхнікаў, агрономаў, ад якіх патрабуецца «ўсё больш высокая кваліфікацыя, аўладаньне глыбокімі ведамі навуковых асноў сучаснай тэхнікі, веданьня сыстэмы савецкай гаспадаркі і яе плянаваньня і практычнага азнаямленьня з пастаноўкай спэцыялізаваных вытворчасьцяй ва ўмовах перадавой тэхнікі» (з пастановы ЦВК СССР).

Выходзячы з вышэйуказанага, пленум ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

У галіне барацьбы за якасьць вучобы ў ВНУ і тэхнікумах

1. Абавязаць партыйныя організацыі, наркоматы максымальна разгарнуць работу па карэннай перабудове падрыхтоўкі пролетарскіх спэцыялістаў і работы ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў, паставіўшы асноўнай і цэнтральнай задачай у гэтай барацьбе—якасьць рыхтуемых спэцыялістаў. Вакол гэтага павінна быць мобілізавана ўвага ўсіх організацый і асабліва навуковых работнікаў. У адпаведнасьці з гэтым прапанаваць Культпропу і Аддзелу кадраў ЦК разам з народнымі комісарыятамі і Дзяржплянам у дэкадны тэрмін прадставіць на разгляд Бюро ЦК мерапрыемствы па ўпарадкаваньні сеткі ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў, пад кутом гледжаньня ліквідацыі лішняга паралелізму, надта дробнай спэцыялізацыі і карлікавага характару паасобных ВНУ, устанавіўшы

поўную адпаведнасьць сеткі ВНУ і профілей рыхтуемых у іх спэцыялістаў запатрабаваньням народнай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва БССР, устанавіўшы тэрмін навучаньня ў кожным ВНУ ў адпаведнасьці з пастановай ЦВК СССР.

2. ДВС Наркомасьветы распрацаваць вучэбныя пляны і тыповыя праграмы з тым, каб ВНУ, ВТНУ і тэхнікумы пачалі працаваць па іх з 1 студзеня 1933 г. шляхам арганізацыі раду факультацыйных дысцыплін, надаць вучэбным плянам пры іх агульнай стабільнасьці максымальную гібкасьць, якая-б давала магчымасьць праяўленьня ініцыятывы профэсарска-пэдагогічнага складу і студэнцтва.

3. ДВС НКА распрацаваць указаньні адносна ўстанаўленьня адзінай сыстэмы ўліку пасьпяховасьці кожнага студэнта.

4. Тэхвыдату і Дзяржвыдавецтву Беларусі забясьпечыць хутчэйшае выданьне тэхнічнай літаратуры і інш. падручнікаў для вышэйшай школы і тэхнікумаў на белмове як арыгінальнай, так і перакладной.

5. Даручыць Культпропу і Аддзелу кадраў ЦК КП(б)Б, разам з адпаведнымі гаспадарчымі наркоматамі, намеціць рад практычных мерапрыемстваў па ўпарадкаваньні праходжаньня студэнтамі вытворчай практыкі ў напрамку забесьпячэньня адзінага вучэбнага працэсу тэорыі і практыкі з такім разьлікам, каб кожная ступень вытворчай практыкі была падначалена адпаведнай частцы тэарэтычнага курсу; скарыстаць для вытворчай практыкі найбольш магутныя ў тэхнічных адносінах прадпрыемствы, устанавіць стражэйшы ўлік якасьці праходжаньня бесьперапыннай вытворчай практыкі, шляхам рэгулярнага контролю з боку катэдраў, заключных праверак, тэхнічных справаздач кожнага студэнта.

6. Разгарнуць работу па арганізацыі пры ВНУ, ВТНУ лябараторый, вытворчых габінэтаў, вучэбных майстэрань і дапаможных гаспадарак для праходжаньня студэнтамі першапачатковых відаў вытворчага навучаньня.

Дзяржпляну ўстанавіць патрэбнасьць у прадметах абсталяваньня лябараторый, майстэрань і т. д. і ў месячны тэрмін унесьці на разгляд СНК прапановы аб арганізацыі іх вырабу ў БССР і завозе з іншых цэнтраў СССР.

7. Пленум адзначае слабасьць работы аддзелаў кадраў наркоматаў, што ў значнай ступені тлумачыцца іх неўкомплектаванасьцю кваліфікаванымі работнікамі. Пленум падкрэсьлівае, што аддзелы кадраў наркоматаў павінны ўзмоцніць штодзеннае мэтодычнае кіраўніцтва ВНУ і тэхнікумамі і лічыць неабходным стварыць пры іх мэтодычнае бюро, для чаго мобілізаваць ня менш 20 чалавек мэтодыстаў для мэтодычнай працы ў аддзелах кадраў гаспадарчых наркоматаў. Правядзеньне гэтага мерапрыемства ўсклясьці на Культпроп і Аддзел кадраў ЦК.

У галіне забясьпечаньня ВНУ і ВТНУ навуковымі кадрамі

1. ЦК адзначае, як буйнейшае дасягненьне—стварэньне ў БССР значных кадраў (звыш 1600 чал.) навуковых работнікаў, павялічэньне сярод іх партыйнай і пролетарскай праслойкі і якасны рост навуковых работнікаў, якія ў сваёй масе аддана працуюць пад кіраўніцтвам компартыі на карысьць соцыялістычнаму будаўніцтву. Пастанова ЦВК СССР знайшла актыўную падтрымку з боку асноўнай часткі навуковых работнікаў і спрыяла ўздыму іх актыўнасьці. ЦК абавязвае дырэктароў і партыйныя організацыі ВНУ садзейнічаць далейшаму ўздыму актыўнасьці навуковых работнікаў, накіроўваючы яе на кардынальнае палепшаньне працы ВНУ адпаведна сучасным задачам соцыялістычнага будаўніцтва. Забясьпечыць уважлівыя і беражлівыя адносіны да навуковых работнікаў, якія прымаюць удзел у соцбудаўніцтве, поўнасьцю выконваючы ўказаньні т. Сталіна аб тым, што «ў пэрыод павароту гэтай інтэлігенцыі ў бок савецкай улады, нашы адносіны да яе павінны выражацца, галоўным чынам, у політыцы прыцягненьня і клопатаў аб ёй». Адначасова неабходна весьці далей рашучую барацьбу з тымі адзінкамі сярод навуковых работнікаў, якія прабуюць скарыстаць сваю навуковую і выкладчыцкую работу супроць дыктатуры пролетарыяту.

2. Пленум указвае на неабходнасьць сур'ёзнай пастаноўкі справы узбраеньня марксысцка-ленінскай мэтодолёгіяй і пролетарскага выхаваньня навуковых работнікаў. Праводзячы далей і ўздымаючы на больш высокі тэорэтычны ўзровень крытыку усякіх скажэньняў і адхіленьняў ад марксысцка-ленінскай тэорыі, не дапускаць спрашчэнскага падыходу да яе і ні ў якім разе неператвараць крытыку ў шальмаваньне і дробязныя прычэпкі. Марксысцка-ленінская крытыка памылак навукова-тэхнічных работнікаў павінна выходзіць з таго, каб ня толькі не адштурхоўваць, а, наадварот, дапамагаючы выпраўляць свае памылкі, прыцягваць на свой бок сапраўдных работнікаў навукі і тэхнікі.

3. У мэтах павышэньня якасьці работы вышэйшай школы, забясьпечаньня вядучай ролі профэсара ў пэдагогічным працэсе і стварэньня стымулаў для павышэньня навуковай кваліфікацыі, ЦК КП(б)Б абавязвае ДВС «жорстка захоўваць устаноўлены парадак прысваеньня навуковай годнасьці (асыстэнт, доцэнт, профэсар), не па займаемай пасадзе, а па сапраўднай кваліфікацыі, якая вызначаецца навуковымі працамі» (з пастановы ЦВК СССР).

4. Даручыць Культпропу і Аддзелу кадраў ЦК разам з БАН і адпаведнымі наркоматамі правесьці прымацаваньне навуковых работнікаў да пэўных ВНУ і ВТНУ, дапускаючы сумяшчэньне толькі для высокакваліфікаваных работнікаў па вострадэфіцытных спэцыяльнасьцях.

5. Адзначаючы, што за апошнія гады навукова-дасьледчая работа катэдраў ВНУ надзвычайна аслабла, а па радзе ВНУ зусім не вядзецца, лічыць неабходным максымальнае разгортваньне гэтай работы, якая зьяўляецца неабходнай умовай узьняцьця тэорэтычнай якасьці выкладаньня, забясьпечыць у бюджэце на 1933 г. неабходныя сродкі на разгортваньне навукова-дасьледчай работы ў ВНУ. Абавязаць БАН і ДВС забясьпечыць кіраўніцтва гэтай работай, а таксама організаваць друкаваньне навуковых работ.

6. Адначасова ЦК лічыць неабходным ажыцьцявіць рад мерапрыемстваў па павышэньні кваліфікацыі навуковых работнікаў і стварыць неабходныя ўмовы для далейшага росту кадраў навуковых работнікаў. Культпропу і Аддзелу кадраў ЦК на працягу месячнага тэрміну разам з Дзяржплянам, БАН і наркоматамі распрацаваць сыстэму падрыхтоўкі асьпірантаў, выходзячы з пастановы ЦВК СССР. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўмацаваньне працы БДУ, як навучальнай установы, якая рыхтуе высокакваліфікаваных спэцыялістаў і пэдагогаў па агульнатэорэтычных дысцыплінах. У мэтах узьняцьця якасьці выпускаемых асьпірантаў забараніць з 1 студзеня 1933 г. выпуск асьпірантаў без абароны навуковай дысэртацыі.

У галіне ўстанаўленьня ўнутранага распарадку

1. Адзначаючы наяўнасьць яшчэ і цяпер фактаў парушэньня адзінаначальля ў ВНУ, ВТНУ і тэхнікумах, факты ўмешваньня з боку партыйных, комсамольскіх і іх профэсіянальных організацый у опэратыўную работу і кіраўніцтва ВНУ і тэхнікумаў (Энэргаінстытут, лесатэхнічны інстытут), адрыў студэнтаў ад вучобы рознымі даручэньнямі і кампаніямі, прызначэньне розных сходаў у вучэбныя гадзіны і т. д., пленум ЦК прапануе ГК і РК КП(б)Б, парторганізацыям ВНУ і тэхнікумаў весьці рашучую барацьбу з фактамі парушэньня адзінаначальля, прыцягваючы вінаватых да суровай партыйнай адказнасьці, забясьпечыўшы поўнае выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб адзінаначальлі і распарадку ў вышэйшай школе і тэхнікумах.

2. Даручыць дырэктарам ВНУ і ВТНУ неадкладна праверыць склад кіраўнікоў катэдраў, аддзяленьняў і факультэтаў, паставіўшы на чале іх высокакваліфікаваных навуковых работнікаў; організаваць работу катэдраў так, каб загадчык катэдры мог несьці поўную адказнасьць за работу катэдры, каб была забясьпечана ідэолёгічная вытрыманасьць, высокая навуковая якасьць як програм, так і самога выкладаньня.

ДВС, разам з сэкцыяй навуковых работнікаў, з прыцягненьнем наркоматаў, не пазьней 15 студзеня распрацаваць новае палажэньне аб катэдрах.

Катэгорычна прапанаваць дырэктаром інстытутаў і наркоматам забясьпечыць поўнае правядзеньне ў жыцьцё рашэньняў ЦВК СССР аб унутраным распарадку і рэжыме ў ВНУ і тэхнікумах.

У галіне комплектаваньня ВНУ і тэхнікумаў

1. Констатуючы недавыкананьне намечаных контынгентаў набору, асабліва па сельскагаспадарчым ВНУ, значнае зьніжэньне партыйнай праслойкі і некаторае зьніжэньне адноснай вагі беларусоў, што зьяўляецца вынікам недастатковай увагі і зусім дрэннай падрыхтоўкі да новага комплектаваньня з боку раду наркоматаў, дырэктароў ВНУ (пэд. ВНУ, хіміка-тэхнолёгічны інстытут, плянава-экономічны інстытут, фінансава-экономічны інстытут і інстытутаў па ліні НКЗ: прадзільных культур, буйнай рагатай жывёлы, вэтэрынарны) і мясцовых партыйных організацый, пленум ЦК прапануе Аддзелу кадраў і Культпропу разам з Дзяржплянам не пазьней 1 лютага 1933 г. разгледзець і ўнесьці на зацьверджаньне бюро ЦК контрольныя лічбы набору ў 1933 г. і рад конкрэтных прапаноў па забясьпечаньні іх выкананьня.

2. Адзначаючы вялікую ролю рабфаку у справе падрыхтоўкі ўласнай інтэлігенцыі рабочай клясы і недастатковую ўвагу да іх з боку наркоматаў і дырэкцыі інстытутаў, ЦК прапануе забясьпечыць органічную сувязь рабфакаў з інстытутамі, да якіх яны прымацаваны, узгадненьне паміж імі вучэбных плянаў і програм, устанавіўшы пераемнасьць навучаньня, а таксама, забясьпечыць кваліфікаванымі кадрамі і вучэбным абсталяваньнем.

Папярэдзіць наркоматы, што падрыхтоўка і правядзеньне новага прыёму праводзіцца ў строгай адпаведнасьці з забясьпечаньнем вучэбнай і жыльлёвай плошчай.

У галіне ўмацаваньня матэрыяльнай базы ВНУ і тэхнікумаў

1. Адзначаючы як ненормальнае зьявішча невыкананьне плянаў будаўніцтва вучэбнай і інтэрнацкай плошчы, а таксама соцыяльна-бытавых установ для студэнтаў, прапанаваць СНК забясьпечыць гэтае будаўніцтва так, каб усе распачатыя об'екты былі скончаны не пазьней першага паўгодзьдзя 1933 г.

2. Адзначаючы празьмернае павялічэньне адміністрацыйна-тэхнічнага апарату ВНУ і тэхнікумаў, прапанаваць ЦКК РСІ правесьці праверку і неабходнае скарачэньне, скарыстаўшы гэтыя сродкі на палепшаньне вучэбнай работы і абсталяваньне лябораторый.

3. Пленум ЦК адзначае невыкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб палепшаньні матэрыяльнага снабжэньня студэнцтва і зусім слабую ўвагу да гэтай справы з боку наркоматаў, гаспадарчых організацый і БКС, у сувязі з чым матэрыяльнае становішча студэнцтва застаецца нездавальняючым. Выходзячы з гэтага, пленум прапануе:

а) БКС організаваць для буйных ВНУ або груп ВНУ закрытыя коопэрацыі і неадкладна наладзіць работу іх па самазагатоўках і стварэньня ўласнай харчовай базы (сьвінагадоўля, трусагадоўля, рыбная гаспадарка і т. д.);

б) комітэту загатовак вызначыць раёны для самазагатовак ЗК ВНУ;

в) наркоматам і гаспадарчым організацыям выдзеліць неабходную суму абаротных сродкаў;

г) БКС і дырэктарам ВНУ прыняць меры да палепшаньня работы сталовак, якасьці абедаў, ліквідаваць чаргі, палепшыць санітарыю;

д) гарсаветам, Белсампрамсаюзу і наркоматам неадкладна організаваць пральні, пашывачныя і пачыначныя майстэрні для абслугоўваньня студэнцтва;

е) даручыць СНК разгледзець пытаньне аб палепшаньні матэрыяльнага снабжэньня студэнцтва пэдагогічных і с.-г. ВНУ.

ЦК КП(б)Б указвае наркоматам і дырэктарам ВНУ на неабходнасьць рашучага павароту да пытаньняў матэрыяльна-бытавога становішча студэнтаў, што зьяўляецца неабходнай умовай палепшаньня якасьці работы ВНУ і тэхнікумаў.

У галіне партыйна-масавай работы

1. Асноўным зьместам партыйна-масавай работы павінна зьявіцца: мобілізацыя студэнцтва і навуковых сіл на поўнае ажыцьцяўленьне рашэньняў партыі і ўраду аб вышэйшай школе і тэхнікумах; барацьба за падвышэньне якасьці вучобы і авангарднай ролі ў гэтым комуністаў і комсамольцаў; усямернае ўмацаваньне адзінаначальля; узьняцьце ролі і значэньня профэсарска-выкладчыцкага пэрсоналу.

Парторганізацыі ВНУ павінны ў сваёй рабоце весьці барацьбу з дробнабуржуазнай расхлябанасьцю, за высокую працоўную дысцыпліну, разгарнуўшы рашучую барацьбу супроць вылазак клясававарожых элемэнтаў і іх агентуры, супроць правых і «левых» опортуністаў.

Пленум ЦК завастрае ўвагу парторганізацый на неабходнасьць узмацненьня політыка-выхаваўчай работы сярод студэнцтва і выкладчыцкага пэрсоналу.

2. Пленум ЦК адзначае, што ў выніку рашучага і пасьлядоўнага правядзеньня КП(б)Б ленінскай нацыянальнай політыкі ў барацьбе з вялікадзяржаўным расійскім шовінізмам як галоўнай небясьпекай на даным этапе, беларускім шовінізмам, контррэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам, у барацьбе з яўрэйскім і польскім шовінізмамі,—КП(б)Б дабілася буйнейшых посьпехаў у справе стварэньня пролетарскіх кадраў спэцыялістаў, навуковых работнікаў з карэнных нацыянальнасьцяй і ў першую чаргу з беларусоў, дабілася буйнейшых посьпехаў у стварэньні і ўмацаваньні пачатковай і вышэйшай школы БССР.

Пленум ЦК разам з гэтым адзначае, як зусім недапушчальнае і нецярпімае зьявішча—паслабленьне ўвагі з боку паасобных

ВНУ, ВТНУ (пэдінстытуты, ВХТІ, будаўнічы і некаторыя іншыя) да справы праввядзеньня беларусізацыі.

Пленум ЦК адзначае наяўнасьць раду праяўленьняў вялікадзяржаўнага шовінізму па раду ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў і зусім недастатковае разгортваньне барацьбы з гэтымі праяўленьнямі з боку дырэкцыі і партстудэнцкіх організацый.

Пленум ЦК таксама адзначае наяўнасьць фактаў праяўленьня мясцовага шовінізму па раду ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў і недастатковую барацьбу з гэтымі праявамі з боку організацый гэтых навучальных устаноў.

Пленум разам з гэтым адзначае наяўнасьць раду істотных недахопаў у справе беларусізацыі і комплектаваньня апаратаў раду наркоматаў, асабліва ў сэнсе ўмацаваньня беларускімі кадрамі.

Даручыць Бюро ЦК на працягу месячнага тэрміну праверыць работу раду цэнтральных і раённых організацый у галіне беларусізацыі і карэнізацыі апаратаў савецкіх, гаспадарчых і прафсаюзных органаў і распрацаваць практычныя мерапрыемствы па іх замацаваньні.

Пленум ЦК падкрэсьлівае, што справа беларусізацыі зьяўляецца аднэй з важнейшых першапачатковых задач парторганізацый і што ўсякая недаацэнка гэтай задачы будзе сустракаць з боку партыі самы рашучы адпор.

Пленум ЦК заастрае ўвагу райкомаў партыі, кіраўніцтва ВНУ, тэхнікумаў і выкладчыкаў масавай школы на неабходнасьць рашучага палепшаньня выкладаньня роднай мовы і дасканалага аўладаньня ёю ўсімі студэнтамі і выкладчыкамі.

Даручыць Беларускай Акадэміі Навук паскорыць распрацоўку беларускага правапісу.

Пленум ЦК з усёй катэгорычнасьцю падкрэсьлівае неабходнасьць неаслабнай і бязьлітаснай барацьбы, павышэньня і ўзмацненьня пільнасьці да ўсякіх праяўленьняў і вылазак з боку як вялікадзяржаўнага шовінізму—галоўнай небясьпекі ў нацыянальным пытаньні на даным этапе, так і супроць нацыянал-опортунізму, контррэволюцыйнага нацыянал-дэмократызму, шовінізму яўрэйскага і польскага, неабходнасьць рашучай барацьбы з прымірэнчымі адносінамі да спроб скажэньняў ленінскай нацыянальнай політыкі партыі.

3. Пленум адзначае, што комсамолам да гэтага часу слаба разгорнута работа па рэалізацыі пастаноў ЦК аб перабудове масавай сярэдняй і вышэйшай школы. Барацьба за ўздым якасьці работы ўсіх зьвеньняў савецкай школы зьяўляецца важнейшай задачай, якая стаіць перад комсамолам. Пленум ЦК прапануе ЦК ЛКСМБ узмацніць кіраўніцтва комсамольскімі організацыямі ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў, піонэрскімі організацыямі ў масавай школе і мобілізаваць увагу ўсёй комсамольскай організацыі на актыўны ўдзел у выкананьні дырэктыў партыі і ўраду аб школе.

4. Пленум ЦК зьвяртае ўвагу ўсіх партыйных, савецкіх, профэсіянальных і комсамольскіх організацый на тое, што барацьба

за карэннае палепшаньне справы народнай асьветы, на павышэньне якасьці вучобы, як цэнтральнай задачы сучаснага пэрыоду ў рабоце ўсіх зьвеньняў савецкай школы, за ўзмацненьне сувязі з вытворчасьцю, узмацненьне дысцыпліны, сапраўднае заахвочваньне ініцыятывы і энэргіі кожнага выкладчыка і вучняў у іх працы, палепшаньне матэрыяльна-бытавога становішча вучняў — патрабуюць неаслабнай увагі ўсіх партыйных, савецкіх і профэсіянальных організацый, максымальнай падтрымкі ўсёй партыйнай, савецкай грамадзкасьці, конкрэтнага опэратыўнага кіраўніцтва, аснаванага на веданьні справы як масавай, так і вышэйшай школы БССР.

Пленум ЦК указвае, што пасьпяховае ажыцьцяўленьне задач, якія стаяць перад пачатковай, сярэдняй і вышэйшай школай БССР, патрабуе неаслабнай і бязьлітаснай барацьбы з рэакцыйнымі праваопортуністычнымі элемэнтамі, што ёсьць у школе, з «лявацкімі» опортуністычнымі перагібамі, з дробнабуржуазнай разбэшчанасьцю і нядбайнасьцю, за павышэньне клясавай пільнасьці, памятаючы, што «новыя посьпехі соцыялізму рабочая кляса забясьпечыць толькі ў барацьбе з рэшткамі капіталізму, даючы бязьлітасны адпор супраціўленьню гінучых капіталістычных элемэнтаў, перамагаючы буржуазныя і дробнабуржуазныя прадрассудкі сярод працоўных і вядучы настойлівую работу па соцыялістычным іх перавыхаваньні» (з рэзолюцыі XVII партконфэрэнцыі).

АБ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАСТАНОВЫ СЬНЕЖАНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б АБ МАСАВАЙ ШКОЛЕ, ВНУ І ТЭХНІКУМАХ

(Пастанова Аб'яднанага паседжаньня Калегіі НК Асьветы і Прэзыдыуму ЦП Саюзу Працасьветы ад 21-XII 1932 года)

Пастанова Сьнежаньскага Пленуму ЦК КП(б)Б ставіць перад НКАсьветы, яго органамі на мясцох, перад організацыямі саюзу Працасьветы, усімі працаўнікамі культурнага фронту (масавая школа, ВНУ, тэхнікумы, выдавецтва) важнейшую баявую задачу— перабудаваць усю сваю працу так, каб сапраўды забясьпечыць ліквідацыю карэннага недахопу школы, узьняцьцё на належную вышыню якасьці падрыхтоўкі спэцыялістых, палепшаньне якасьці падрыхтоўкі пэдагагічных і навукова-пэдагагічных кадраў, узмацненьне матар'яльнай базы культурна-асьветных установ і матар'яльнага становішча пэдагагічных кадраў.

Пастанова Пленуму на раду з адзначэньнем маючыхся дасягненьняў зусім правільна і рашуча адзначае, што «маючыяся брухі па выкананьні пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб масавай

Навукова-Даследчы Інстытут Камуністычнага выхаваньня Бібліятэка 2270
Инв. 1953 г. Бр 1234

школе зусім недастатковы; тэмпы перабудовы школы зусім нездавальняючыя», што «да гэтай пары яшчэ вельмі і слаба пастаўлена канкрэтна-апэрацыйнае кіраўніцтва і своечасовая мэтадычная дапамога школе з боку НКА і РайАНА».

Пленум ЦК КП(б)Б таксама правільна адзначыў нездавальняючую работу НКА, ВНУ і тэхнікумаў па рэалізацыі пастановы ЦВК СССР ад 19/ІХ 1932 г.

Гэтыя важнейшыя пастановы зьяўляюцца праграмай разгорнутай барацьбы за культурную рэвалюцыю і павінны паслужыць пераломам ва ўсёй рабоце масавай школы, ВНУ і тэхнікумаў; павінны мабілізаваць на барацьбу за ўсеагульную пісьменнасьць, за народна-гаспадарчыя і культурныя кадры ўсю масу асьветнікаў, навуковых працаўнікоў, студэнцтва, разам з усёй пралетарскай грамадзкасьцю.

Калегія НК Асьветы і Прэзыдыум ЦП Саюзу Працасьветы абавязваюць усіх заг. РайАНА і ГарАНА, гарадзкія і раённыя саюзы працасьветы, дырэктароў ВНУ і тэхнікумаў, загадчыкаў школ і курсаў давесьці пастановы пленуму да кожнага настаўніка, навуковага працаўніка, студэнта і курсанта і ў першую чаргу прапрацаваць іх на зімовых настаўніцкіх конфэрэнцыях.

У выкананьне пастаноў пленуму ЦК КП(б)Б, Калегія НК Асьветы і прэзыдыум ЦП Саюзу Працасьветы **п а с т а н а ў л я ю ц ь:**

Па масавай школе

Плянаваму сэктару НКА

1. Пераапрацаваць плян увядзеньня ўсеагульнага навучаньня за 10-ці гадавую школу, улічваючы неабходнасьць першачарговага разгортваньня 10-годак у прамысловых цэнтрах і важнейшых сельскагаспадарчых раёнах. Работу скончыць да 25/1—33 г.

2. Сумесна з фінансавым сэктарам забясьпечыць адпаведнымі сродкамі па мясцовым бюджэтам 1933 г. існуючую сэтку груп III-га канцэнтру і разгарнуць з пачатку навучальнага 1933 году гэтую сэтку з такім разьлікам, каб ахапіць ёю ня менш 3.600 кантынгэнтаў.

У дэкадны тэрмін разьмеркаваць гэтую сэтку па прамысловых цэнтрах і важнейшых сельскагаспадарчых раёнах і прадставіць ў Калегію НКА для зацьверджаньня.

3. Сумесна са школьным сэктарам НК Асьветы на працягу дэкаднага тэрміну распрацаваць плян ахопу перарасткаў (15—17 г.) сыстэмы школ для дарослых, разьмеркаваўшы гэтыя школы па крыніцам фінансаваньня, з улікам удзелу ў фінансаваньні грамадзкіх, гаспадарчых і прафэсыянальных арганізацый.

4. Да 1-га лютага 1933 г. сумесна з сэктарамі кадраў і фінансавым пераапрацаваць плян падрыхтоўкі пэдагагічных кадраў пад кутом гледжаньня выкананьня пастановы Пленуму аб паступовай

замене каротка-тэрміновай курсавой падрыхтоўкі настаўніка нармальнай праз стацыянарную сецьпэд. устаноў (Пэд. ВНУ, тэхнікумы) і завочнае навучаньне. Вывучыць і скласьці асобны плян па нацпэдкадрах, на падставе гэтых-жа прынцыпаў.

Школьнаму сэктару НКА

1. Даручыць аддзелам народнае асьветы і раённым саюзам працасьветы зараз-жа прыступіць да падрыхтоўчай работы па скліканьню канфэрэнцый з тым, каб паставіць работу апошніх у нармальныя ўмовы (памяшканьні, кватэры, культ. абслугоўваньне і інш.).

Школьнаму Сэктару НКА забясьпечыць прысутнасьць сваіх прадстаўнікоў на канфэрэнцыях ва ўсіх раёнах, скарыстоўваючы для гэтае мэты сілы НКА, ЦП Саюзу Працасьветы і лепшых выкладчыкаў навучальных устаноў.

2. У мэтах аховы і палепшаньня ўмоў працы дзяцей і настаўнікаў, а таксама для палепшаньня ўтрыманьня школьных памяшканьняў у чыстаце, распрацаваць спэцыяльныя інструкцыі па гэтаму пытаньню, якія апусьціць у раёны, забясьпечыўшы давядзеньне да кожнае школы не пазьней 20—25-га студзеня 1933 г.

Фінансаваму Сэктару НКА дабіцца значна большых асыгнаваньняў на вучэбна-гаспадарчыя выдаткі і абсталяваньне школ.

т. Казакову сумесна з Плянавым сэктарам у 5-ці дзённы тэрмін распрацаваць мерапрыемствы па прыцягненьню сродак грамадзкіх прафэсіянальных і гаспадарчых арганізацый на палепшаньне ўмоў працы школы.

3. Абавязаць аддзелы нарасьветы, гар. і райсаюзы Працасьветы, заг. школ і ўсіх настаўнікаў павесьці рашучую барацьбу за сьвядомую дысцыпліну сярод вучняў. Усім школам распрацаваць канкрэтныя пляны выхаваўчае работы. Школьнаму сэктару сумесна з НДІ Камвыхаваньня абсьледваць ня менш 20—25 школ па пытаньню аб становішчы сьвядомай дысцыпліны, вынікі досьледаў паставіць на Калегіі НКА не пазьней 1/III 1933 г.

4. На працягу 1-га кварталу 1933 г. заняцца вывучэньнем нагрузкі настаўнікаў, работ настаўніцкіх брыгад, а таксама распрацаваць рад мэтадычных лістоў па пытаньнях: работа настаўнікаў над прывучэньнем вучняў да розных відаў самастойных прац; правядзеньне экскурсій; праверка ведаў вучняў; гадавыя іспыты; мэтадычная дапамога з боку настаўнікаў і брыгадзіраў.

5. З мэтай вывучэньня і перанясеньня вопыту работы ўзорных школ на іншыя школы, прапанаваць:

а) на працягу лютага і сакавіка месяцаў 1933 г. правесьці агляд усіх узорных школ БССР; працу паасобных школ вывучыць дэталёва; вынікі агляду прадставіць ў Калегіі НКА 20/III—33 г.;

б) да 15-га студзеня 1933 г. скласьці прыкладны плян тэм па асобных дысцыплінах для ўзорных школ, па якому апошнія павінны пэрыядычна друкаваць канспэкты правядзеньня гэтых тэм у школах;

в) абавязаць усіх загадчыкаў АНА сумесна з загадчыкамі ўзорных школ даць да 10/I—33 г. скласьці плян працы па дапамозе масаваму настаўніцтву, уключаючы такія моманты, як узорныя лекцыі, нарады па паасобных пытаньнях, зьместу і мэтодыцы вучэбнай і выхаваўчай работы, справаздачы ўзорнай школы на настаўніцкіх канфэрэнцыях і г. д.;

г) да 10/I—33 г. даць арганізацыйна-мэтадычныя паказаньні аб узорных лекцыях, якія ўвесьці ў кожным раёне;

д) прапанаваць т. **Казакову** і т. **Хомо** безадкладна арганізаваць на старонках часопісу **«Камуністычнае выхаваньне»** пэдагогічную кансультацыю для настаўнікаў у выглядзе асобнага аддзелу:

6. Адзначаючы невыкананьне Школьным сэктарам пастаноў Калегіі ў сэнсе прапрацоўкі статуту, правілаў унутранага распарадку і інш., устанавіць канчатковы тэрмін прадстаўленьня апошніх на зацьверджаньне Калегіі:

а) статут школы—25/I—33 г.;

б) правілы ўнутранага распарадку ў школе—10/I—33 г.;

в) мерапрыемствы па пэдпрапагандзе—20/I—33 г.;

г) інструкцыю аб сыстэме мэтадычнай работы з новымі кадрамі настаўнікаў—25/I—33 г.;

д) да 15/I—33 г. сумесна з ДВС распрацаваць якасныя і колькасныя паказчыкі па азначэньню пасьпяховасьці вучняў;

е) да 20/I—33 г. распрацаваць пытаньне аб адзінаначальлі ў школе.

Сэктару кадраў НКА

1. У 1933 г. значна шырэй разгарнуць працу па падвышэньню кваліфікацыі настаўніцтва, асабліва маладых настаўнікаў з курсавой падрыхтоўкай, з гэтай мэтай:

а) да 5/I—33 г. даць паказаньні ўсім заг. АНА і гар. і райсаюзам Працасьветы аб арганізацыі 8-мі месячных курсаў для перападрыхтоўкі настаўнікаў, аб іх камплектаваньні, забесьпячэньні, кіраўніцтве і выкладчыцкім пэрсанале;

б) прапанаваць РайАНА і завочным сэктарам пэдустаноў да канца 1932 г. ахапіць усіх настаўнікаў, ня маючых закончанай пэдагагічнай асьветы завочным навучаньнем;

в) даць 1/II—33 г. рэарганізаваць працу Інстытуту Падвышэньня Кваліфікацыі настаўніцтва ў напрамку арганізацыі больш працяглай падрыхтоўкі і камбінаваньня вочна-завочнай, дакурсавой, курсавой і пасьлякурсавой падрыхтоўкі;

г) працу з настаўнікамі, якія павінны перасоўвацца ў 1933 г. з 1-га канцэнтру ў II-гі, пачаць не пазьней 1/III—33 г. з тым, каб

курсавая падрыхтоўка зьяўлялася момантам, завяршаючым пэўны этап дакурсавой падрыхтоўкі;

д) заслухаць меркаваньні сэктару кадраў і Інстытуту Падвышэньня Кваліфікацыі на Калегіі НКА не пазьней 20/I—33 г. па пытаньням рэарганізацыі.

Дзяржаўнаму Вучонаму савету НКА

1. Не пазьней 25/I—33 г. здаць ў друк прыватныя мэтодыкі па асноўных дысцыплінах (працоўнае навучаньне, матэматыка, грамадазнаўства, мова, прыродазнаўства, фізыка, гісторыя). Абавязаць ДВБ забясьпечыць выданьне мэтодык не пазьней 15/III—33 г.

2. Цалкам забясьпечыць выкананьне пастановы Калегіі НКА ад 3/IX 1932 г. аб выданьні літаратуры па пэдпрапагандзе, тэрмінам выкананьня 20/I—33 г.

3. Да 15/I—33 г. распрацаваць пытаньне аб адзінай сыстэме пасьпяховасьці кожнага вучня.

4. Распрацаваць мэтадычны ліст аб забесьпячэньні правільнага і сваячасовага пераключэньня вучэбнай работы школы на новыя праграмы. Тэрмін выкананьня 5/I—33 г.

5. Распрацаваць навучальны плян школы, з тым, каб не пазьней 1/I спусьціць яго ў школы.

Прапанаваць ДВБ:

1. Забясьпечыць выданьне і адсылку на месцы праграм масавай школы не пазьней 28/XII—32 г.

2. Безадкладна прыступіць да стэрыатыпнага выданьня асноўных падручнікаў з тым, каб з 15/I—33 г. школы былі імі (падручнікамі) забясьпечаны.

ДВС далейшую працу па складаньню падручнікаў праводзіць, выходзячы з задач стварэньня стабільных падручнікаў.

Сэктару забесьпячэньня НКА

1. Да 15/I—33 г. праверыць становішча з забесьпячэньнем школ і інш. навучальных устаноў апалам. Прапанаваць заг. АНА гар. і райсаюзам Працасьветы на працягу зімовага перапынку забясьпечыць школы апалам, а таксама стварыць харчовыя фонды пры тых школах, дзе яшчэ не арганізаваны гарачыя сьнеданьні для вучняў, скарыстаўшы для гэтых мэт усе мясцовыя рэсурсы.

2. Безадкладна дабіцца выдзяленьня спэцыяльных норм фондаў і кантынгэнтаў для забесьпячэньня настаўнікаў (хлеб, цукар, крупы, прамтавары), наглядаючы за сваячасовым давядзеньнем іх да раёнаў; з гэтай мэтай ўстанавіць штомесячны кантроль за адгрузкай у раёны памянёных прадуктаў.

3. У мэтах палепшаньня матар'яльнага становішча настаўнікаў,

кранавацъ заг. АНА, гар. і райсаюзам Працасьветы разгарнуць сыстэму саманарыхтовак.

Сумесна з Фінсэктарам узьняць перад СНК пытаньне аб уключэньні ў каштарыс спэцыяльных сродкаў на арганізацыю сьвінарнікаў і іншых адкормачных пунктаў для палепшаньня харчаваньня настаўнікаў.

4. Паставіць пытаньне ў Камісію Выкананьня пры СНК БССР аб невыкананьні пастановы СНК БССР ад 4/IX—32 г. аб забесьпячэньні школ кіпяцільнікамі і інш. інвэнтаром.

5. Сумесна з Культпромтрэстам і адпаведнымі наркаматамі распрацаваць рэспубліканскі плян вытворчасьці палітэхнічнага і лябараторнага абсталяваньня і навучальных дапаможнікаў, які 20/I—33 г. унесьці на разгляд Калегіі.

6. Сумесна з Культпромтрэстам распрацаваць патрэбнасьць у палітэхнічным, лябараторным і навучальным абсталяваньні для тэхнікумаў і ВНУ сыстэмы НКА і 20/II—33 г. унесьці ў Дзяржплян для зацьверджаньня.

7. Да 1/I—33 г. даць заяўкі адпаведным арганізацыям на ручнікі, рукамыйнікі, спэцвопратку для вытворчага навучаньня, мыла і інш. і дабіцца выдзяленьня ў 1-м квартале 1933 г. пэўных фондаў.

8. Даць паказаньне Гар. і РайАНА, Гар. і Райсаюзам Працасьветы аб мабілізацыі грамадзкіх сродкаў і натуральных фондаў на забесьпячэньне школ і навучальных устаноў ручнікамі, рукамыйнікамі, кіпяцільнікамі і інш.

9. Да 20/II—33 г. заключыць дагавор з Спорттаварыствам «Дынамо» аб забесьпячэньні школ спорт. прыладамі.

10. Сумесна са школьным сэктарам НКА у дэкадны тэрмін распрацаваць сыстэму вучоту і мерапрыемствы па захаваньні падручнікаў, дапаможных прылад, навучальнага і гаспадарчага абсталяваньня ва ўсіх навучальных установах, падпарадкаваных НКА (масавая школа, тэхнікумы, ВНУ).

Будаўнічаму сэктару НКА

1. У галіне школьнага будаўніцтва лічыць асноўнай задачай адпаведных сэктароў НКА (Школьнага, Будаўнічага, Фінансавага)—сканчэньне будаўніцтва распачатых аб'ектаў, сканцэнтраваньня адпаведных фінансавых сродкаў і будаўнічых матар'ялаў на пэўнай групе аб'ектаў, забясьпечваючы фактычную рэалізацыю гэтых аб'ектаў будаўніцтва; да 10/I—33 г. Буд. сэктару НКА скласьці праграму сваёй працы на 1933 г., як па масавай школе, гэтак і па кадрам, і прадставіць на зацьверджаньне Калегіі.

2. Устанавіць штомесячнае прадстаўленьне справаздач з боку АНА аб ходзе будаўніцтва па кожнаму аб'екту, капіталаўкладаньню і аб'ёму выкананых работ. На працягу 1-га кварталу 1933 г. забясьпечыць усе новыя аб'екты праэктамі, паясьняльнымі запіскамі і тэхнічнымі разьлікамі.

У сувязі з пэрспэктывай увядзеньня ўсенавучу за 10-ці годку, распрацаваць праэкт будынку 10-ці гадовай палітэхнічнай школы.

3. Узяць пад асобы нагляд пабудову санаторыяў і дамоў адпачынку для настаўнікаў, а таксама пры пераглядзе плянаў новага будаўніцтва, улічваць пабудову кватэр для настаўнікаў.

4. Узьняць перад адпаведнымі арганізацыямі пытаньне аб пабудове стандартных дамоў для настаўнікаў: Менск—2, Гомель—2, Віцебск—2, Магілеў—2; у астатніх гарадох—па аднаму стандартнаму дому.

У астатнім—усім сэктарам кіравацца ранейшай пастановай Калегіі НКА і Прэзыдыуму ЦП Саюзу Працасьветы ад 25/VIII-32 г.

II. Па ВНУ і тэхнікумах

1. Сэктару кадраў НКА да 10/I—33 г. удасканаліць і прадставіць на зацьверджаньне Калегіі профілі спэцыялістых, якія рыхтуюцца ў БДУ, выходзячы з устаноўкі Пленуму ЦК КП(б)Б аб тым, што БДУ рыхтуе высока-кваліфікаваных спэцыялістых і пэдагогаў па агульна-тэорытычных дысцыплінах; таксама прадставіць профілі спэцыялістых, рыхтуемых Палітасьветінстытутам і Кансэрваторыяй.

2. Лічыць неабходным адмяніць існаваўшую сыстэму канцэнтраванай пэдпрактыкі па Пэд. ВНУ і тэхнікумах у адпаведнасьці з пастановай ЦВК СССР ад 19/IX—32 г., арганізаваць пэдагагічную практыку на аснове падпарадкаваньня кожнай ступені пэдпрактыкі праходжаньню адпаведнай часткі тэорытычнага пэд. курсу.

ДВС уключыць пэд. практыку ў агульна-вучэбны плян.

Сэктару кадраў НКА і дырэктарам Пэд. ВНУ і тэхнікумаў устанавіць парадак праходжаньня практыкі на кожным курсе.

Для пэд. практыкуму прымацаваць: да Менскага Пэд. Інстытуту—Менскі Белпэдтэхнікум і Дашкольны Тэхнікум; да Віцебскага Пэд. Інстытуту—Віцебскі Пэд. Тэхнікум; да Гомельскага Пэдінстытуту—Гомельскі Белпэдтэхнікум; да Магілеўскага Пэдінстытуту—Магілеўскі Белпэдтэхнікум.

Абавязаць загадчыкаў Віцебскага, Гомельскага і Магілеўскага Гар. АНА прымацаваць для пэд. практыкі да адпаведных інстытутаў па аднэй найбольш буйнай шматгрупнай школе, якія разгортваюцца ў 10-ці годку, на правох практыкавальных школ дадзеных інстытутаў, а Менскаму Гар. АНА да МПІ прымацаваць для пэд. практыкі адну беларускую і адну яўрэйскую шматгрупную школу.

3. Абавязаць дырэктароў Пэд. ВНУ і тэхнікумаў:

а) да зімовага перапынку правесьці ўнутраны распарадак і рэжым у сваіх навучальных установах у адпаведнасьці з пастановамі ЦВК і СНК СССР ад 19/IX—32 г. і ад 17/XI—32 г.

Сэктару кадраў НКА на працягу лютага месяцу правесьці праверку ажыцьцяўленьня гэтых дырэктыў;

б) сумесна з кіраўнікамі катэдр да 20/II—33 г. вывучыць мэтады выкладаньня (з улікам усіх асаблівасьцяй кожнай дысцыпліны кантынгэнтаў студэнцтва і наяўнасьці адпаведнага абсталяваньня) і ўжыць ў адпаведнасьці з імі разнастайныя мэтады, якія-б лепш забясьпечвалі выкананьне пастаноў Партыі і Ўраду аб якаснай падрыхтоўцы спэцыялістых;

в) да 15/III—33 г. перабудаваць сыстэму ўліку пасьпяховасьці студэнцтва ў адпаведнасьці з дадзенымі паказаньнямі, канчаткова зьліквідаваўшы рэшткі калектыўных залікаў, устанавіўшы індывідуальныя залікі для кожнага студэнта, з поўнай адказнасьцю за іх прафэсарска-выкладчыцкага складу;

г) узьняць на належную вышыню акадэмпасьпяховасьць студэнцтва; поўнасьцю ліквідаваць да 1/III—33 г. «хвасты» незданых залікаў за мінулы год і апошні сэмэстр;

д) не пазьней 15/I—33 г. устанавіць тэмы і тэрміны дыплёмных работ для студэнтаў, падлягаючых выпуску ў 1933 годзе;

е) арганізаваць строгі кантроль за наведваньнем лекцый і інш. заняткаў, як з боку студэнцтва, так і з боку прафэсарска-выкладчыцкага складу; павесьці рашучую барацьбу з расхлябанасьцю, прагуламі, спазьненьнямі, з выпадкамі хуліганства, прыстасаваўшы, па меры неабходнасьці, адпаведны пункт пастановы ЦВК СССР ад 19/IX—32 г. аб налажэньні адміністрацыйных пакараньняў;

ж) да 15/I—33 г. распрацаваць правілы ўнутранага распарадку, забясьпечыўшы іх выкананьне ва ўсіх аўдыторыях, габінэтах, лябараторыях, інтэрнатах, студэнцкіх клюбах і інш.

4. Прапанаваць сэктару кадраў НКА ў ніжэйвызначаныя тэрміны прадставіць на зацьверджаньне Калегіі НКА:

а) статут Пэд. ВНУ і пэд. тэхнікумаў (тэрмін—1/II—33 г.);

б) інструкцыю аб пераводах з курсу на курс, аб выпусках і атэстацыях канчаючым Пэд. ВНУ (тэрмін 1/III—33 г.);

в) парадак зацьверджаньня з боку НКА загадчыкаў катэдр, дэканаў факультэтаў і загадчыкаў аддзяленьняў ВНУ (тэрмін 15/I—32 г.).

г) формы атэстатаў БДУ, пэд. інстытутаў, пэд. тэхнікумаў, дашкольнага, палітасьветнага тэхнікуму і інш. (тэрмін 15/II—33 г.).

5. Фінсэктару НКА пры канчатковым зацьверджаньні каштарысаў Пэд. ВНУ і ў асаблівасьці Гомельскага, Віцебскага і Магілеўскага Пэдінстытуту, значна павялічыць асыгнаваньні на абсталяваньне габінэтаў, лябараторыяў і розных дапаможных майстэрань, усклаўшы пры гэтым пэрсанальную адказнасьць за 100 проц. выдаткаваньне гэтых сродкаў па прамому прызначэньню на дырэктароў Інстытутаў.

6. Сэктару кадраў НКА на працягу 2-х дэкаднага тэрміну распрацаваць праэкт прымацаваньня навуковых працаўнікоў да ад-

лаведных ВНУ сыстэмы НКА і прадставіць у адпаведныя органы на зацьверджаньне.

7. Абавязаць НДІ Кам. выхаваньня кіраваць навукова-дасьледчай працай Пэд. ВНУ шляхам разгляду плянаў іх навукова-дасьледчай працы, удзелу Пэд. ВНУ і вывучэньні і распрацоўцы асобных дасьледчых тэм у галінах нарасьветы, даваемых з боку НДІ. Фінсэктару НКА прадугледзіць па каштарысах ВНУ спэцыяльныя сродкі на гэтыя мэты.

8. З мэтай падвышэньня кваліфікацыі навуковых працаўнікоў Пэд. ВНУ, значна павялічыць у 1933 годзе практыку пасылкі ў навуковыя камандыроўкі навуковых працаўнікоў за межы БССР у буйныя навуковыя цэнтры СССР.

9. ДВС праверыць і канчаткова зацьвердзіць не пазьней 15/I—1933 году склад загадчыкаў катэдр Пэд. ВНУ.

10. Сэктару кадраў НКА да 15/I—33 г. перагледзіць лічбы прыёму па Пэд. ВНУ і пэд. тэхнікумаў у 1933 годзе, прыводзячы іх у суадпаведнасьць з рэальнымі мажлівасьцямі разьмяшчэньня (вучэбна-інтэрнатная плошча), абслугоўваньня габінэтамі і лябараторыямі і наяўнасьці кадраў для кадраў. Да 15/I—33 г. даць пэўныя ўстаноўкі ў галіне карэнізацыі прыёмаў.

11. Сэктару кадраў НКА да 1/II—33 г. перагледзіць прымацаваньне рабфакоў да Пэд. ВНУ у напрамку забесьпячэньня сапраўднай і сталай сувязі паміж ВНУ і рабфакамі. Да 1/III—33 г. вывучыць пытаньне аб мэтазгоднасьці арганізацыйна-адміністрацыйнага падпарадкаваньня рабфакаў дырэктарам ВНУ.

12. Сэктару кадраў НКА на працягу 2-х месячнага тэрміну перагледзіць і замацаваць выкладчыцкі і кіруючы склад пэдрабфакаў.

13. Сэктару кадраў НКА і Фінсэктару да 10/I—33 г. перагледзець склад і штаты адміністрацыйна-тэхнічнага апарату ВНУ і тэхнікумаў у бок скарачэньня, павялічыўшы за яго кошт вучэбныя выдаткі.

14. У мэтах палепшаньня матар'яльна-бытавога становішча пэдагагічнага студэнцтва прапанаваць сэктару забесьпячэньня НКА і дырэктарам пэд. устаноў:

а) да 10/I—33 г. дабіцца праз адпаведныя органы вызначэньня для Пэд. ВНУ і тэхнікумаў раёнаў для саманарыхтовак;

б) на працягу бліжэйшага тэрміну дабіцца поўнага прыраўнаньня Пэд. ВНУ, пэдрабфакаў і пэдтэхнікумаў да норм забесьпячэньня індустрыяльных навучальных устаноў;

в) дабіцца атрыманьня прыгародных гаспадарак і саўгасаў.

15. У гэтых-жа мэтах, палепшаньня матар'яльна-бытавога становішча пэд. студэнцтва, прапанаваць сэктару кадраў НКА і Фінсэктару:

а) вызначыць па бюджэту 1933 г. для кожнай навучальнай ўстановы пэўную суму для зваротнага фонду па саманарыхтоўках;

б) прадугледзіць па каштарысах ВНУ, тэхнікумаў і рабфакаў некаторыя сумы на першапачатковую дапамогу пашывачным і пачыначным майстэрням;

в) павялічыць па бюджэту з 1933 г. асыгнаваньні на палепшаньне бытавых запатрабаваньняў студэнцтва (агульныя памяшканьні, курортная дапамога і г. д.).

16. Прызнаць неабходным арганізацыю пры ВНУ і пэдтэхнікумах прален, парыкмахэрскіх і інш., аб чым даць паказаньні навучальным установам.

17. Сэктару кадраў НКА і Фінсэктару да 20/III—33 г. распрацаваць пытаньне аб палепшаньні матар'яльнага становішча прафэсарска-выкладчыцкага складу пэд. навучальных устаноў (дыфэрэнцыраваная аплата і інш.).

18. Прыняць да ведама выкананьне ДВС наступных дырэктыў:

а) аб мэтадах выкладаньня ў вышэйшай школе (мэтадычны ліст мэтад. канфэрэнцый);

б) паказаньні па ўстанаўленьню адзінай сыстэмы ўліку пасьпяховасьці кожнага студэнта.

19. Прапанаваць ДВС:

а) не пазьней 1/I—33 г. зацьвердзіць навучальныя пляны ВНУ і тэхнікумаў і не пазьней 5/I—33 г. тыповыя праграмы для ВНУ і Тэхнікумаў;

б) да 10/I—33 г. падрыхтаваць пытаньне аб правядзеньні Усебеларускай канфэрэнцыі па пытаньню арганізацыі вытворчай практыкі і канкрэтныя прапановы ўнесьці на зацьверджаньні Калегіі;

в) да 15/I—33 г. перапрацаваць палажэньне аб катэдрах.

20. Сумесна з Акадэміяй Навук БССР распрацаваць пытаньне аб арганізацыі навукова-дасьледчай работы ў ВНУ і ВТНУ, работу скончыць да 1-II—33 г.

21. Да 20/III—33 г. скончыць перагляд навуковых працаўнікоў па наданьні ім навуковай годнасьці, жорстка захоўваючы палажэньне СНК БССР аб навуковых працаўніках.

У астатнім кіравацца ранейшай пастановай Калегіі аб рэалізацыі пастаноў ЦВК СССР.

Старшынствуючы на паседжаньні

Нам. Наркомам Асьветы **Бялуга.**

Сэкратар калегіі НКА **Абрамава.**

Х. Казакоў

За поўную рэалізацыю пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б у галіне масавай школы

Вялізарныя задачы другой пяцігодкі, задачы пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, ставяць перад партыяй і рабочай клясай са ўсёй вастратой пытаньне падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў для ўсіх галін сацыялістычнай будоўлі. БССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партый, пры дапамозе іншых Саюзных Рэспублік дабілася вялікіх дасягненьняў ў справе будаўніцтва савецкай палітэхнічнай школы. Калі ў 1927-28 г. пачатковых школ было 5 700, дык у 1932-33 г. лік іх павялічваецца да 6 900, колькасьць вучняў узрасла з 503 185 у 1928-29 г. да 993.000 у 1932-33 навучальным годзе. Расьце сетка нацыянальных школ: яўрэйскіх, польскіх, украінскіх, латыскіх і інш. У 1932 г. уведзена усеагульнае абавязковае навучаньне за сямігодку, адчыненьнем 40 восьмых груп прыступлена да ўвядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня дзяцей і падлеткаў да 17-ці гадовага ўзросту. Але сучасны этап сац. будаўніцтва, калі з кожным днём растуць гіганты індустрыі, якія будуюцца па апошняму слову тэхнікі, адбываецца сацыялістычная рэканструкцыя ўсёй народнай гаспадаркі, ставіць перад намі ва ўсю веліч і другую задачу—задачу якасьці працы школы: на колькі школа ўзбройвае дзяцей ведамі, на колькі ў школах праводзіцца сапраўдная сувязь навучаньня з вытворчай працай, як школа праводзіць камуністычнае выхаваньне. «Карэнны недахоп,—гаворыцца ў пастанове ЦК УсеКП(б)—аб пачатковай і сярэдняй школе ад 5-га верасьня 1931 г.—у даны момант заключаецца ў тым, што навучаньне ў школе не дае дастатковага аб'ёму агульна-адукацыйных ведаў і нездавальняюча вырашае задачу падрыхтоўкі для тэхнікумаў і для вышэйшых школ упаўне пісьменных дзяцей, добраўладаючых асновамі навук. (Фізыка, хэмія, матэматыка, родная мова, геаграфія і г. д.)»

Увесь 1931-32 навучальны год прайшоў пад кутом погляду выкананьня пастаноў ЦК аб школе і ў выніку гэтай барацьбы мы дабіліся пэўных зрухаў, павялічыўся процант пасьпяховасьці вучняў з 85,3 проц. у першым паўгодзьдзі да 89,4 проц. у другім паўгодзьдзі 1931-32 г., узмацнілася дысцыпліна ў школе, павялічылася адказнасьць настаўнікаў за пастаноўку навучаньня і іншае. У шэрагу раёнаў мы маем надзвычайна добрыя ўзоры працы школ, якія пасьпяхова вялі барацьбу за павышэньне якасьці вучобы. У многіх раёнах—Слуцкі, Любанскі, Жыткавіцкі, Менскі, Сеньненскі і інш., дзе партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі, органы Нарасьветы мабілізавалі пралетарскую грамадзкасьць

на выкананьне задач, пастаўленых партыяй у галіне культурнага будаўніцтва школы, прышлі да новага навучальнага году упаўне падрыхтаванымі да заняткаў. Аднак трэба сказаць, што па пытаньні якасьці працы школы, мы маем толькі зрухі. Сьнежаньскі пленум ЦК КП(б)Б падкрэсьліў, што «ў выкананьні пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б дасягнуты толькі накаторыя зрухі ў галіне ліквідацыі карэннага недахопу школы—невыстарчальнага аб'ёму агульна-асьветных ведаў»... І далей, што «наяўныя зрухі па выкананьні пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб масавай школе зусім невыстарчальныя, тэмпы перабудовы школы ўсё яшчэ застаюцца нездавальняючымі і што карэнны недахоп школы яшчэ не ліквідаваны». Гэта абавязвае партыйныя, прафэсыянальныя арганізацыі, органы НКА, асьветніцкія масы, удзесяцярыць увагу да працы школы.

Пленум абавязаў НКА і ДВБ работу па прапрацоўцы новых праграм разгарнуць такім чынам, каб яны не пазьней 1-га студзеня 1933 году былі даведзены да ўсіх школ. У час зімовага перапынку гэтыя праграмы павінны быць прапрацаваны ўсімі настаўнікамі. На канфэрэнцыях патрэбна будзе паставіць шэраг дакладаў па мэтадычных пытаньнях з тым, каб высока-кваліфікаваныя пэдагогі маглі перадаць свой вопыт маладым настаўнікам па паасобных пытаньнях з мэтодыкі выкладаньня мовы, матэматыкі, грамадазнаўства і г. д. Зімовы перапынак павінен быць поўнасьцю скарыстаны партыйнымі, прафэсыянальнымі арганізацыямі і ўсёй асьветніцкай масай для падрыхтоўкі да заняткаў ў другім паўгодзьдзі: складаньне плянаў—квартальных, рабочых, нарыхтоўка апалу для школ, стварэньне натуральных харчовых фондаў для арганізацыі гарачых сьнеданьняў у школах і інш.

Шэраг недахопаў і скажэньняў мы маем у пытаньні мэтадаў работы. У радзе раёнаў маюць месца выпадкі арганізацыі пастаянных вучэбных брыгад, ужываюцца такія мэтады, якія не дапамагаюць працы, а перашкаджаюць ёй. Пленум завастрыў увагу НКА і яго органаў на мясцох на неабходнасьць хутчэйшай ліквідацыі гэтых скажэньняў. З вялікай упартасьцю патрэбна і надалей весьці змаганьне з «імкненьнем звароту да старой славеснай школы, ігнараваньнем самастойнай групавой брыгаднай і індывідуальнай работы вучняў пад кіраўніцтвам настаўніка. Пры гэтым павінны ўсяляк разгортвацца калектыўныя формы вучобы, не практыкуючы арганізацыі сталых брыгад». (Пленум ЦК КП(б)Б). Мала ў нашых школах зварачваецца ўвагі на такія пытаньні, як выкананьне санмінімуму, у школах назіраецца бруд, адсутнічаюць вешалкі, вучні сядзяць у вопратцы і інш. Усе гэтыя моманты ў іх агульнай складанасьці маюць вялікае значэньне, выкананьне іх стварае ўмовы для нармальнай працы школ і тым самым садзейнічае ліквідацыі карэннага недахопу школы. А таму пленум рашуча падкрэсьлівае, што «баявой задачай НКА, прафарганізацыі, камсамолу і піянэр-арганізацыі павінна стаць барацьба за чыстату памяшканьня, цёплую школу, вентыляцыю кля-

саў, за ўмывальнік, мыла, ручнік, перагатаваную ваду, за абсталяваньне настаўніцкай і іншыя мерапрыемствы, якія ахоўваюць і паляпшаюць умовы працы, дзяцей і настаўнікаў».

Правядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня патрабавала падрыхтоўкі вялікай колькасьці пэдагагічных кадраў, у шэрагі настаўніцтва ўліліся тысячы маладых настаўнікаў, якія ня маюць выстарчальнай пэдагагічнай практыкі і ў значнай ступені выстарчальнай пэдагагічнай асьветы. Гэтыя настаўнікі патрабуюць з боку НКА і яго органаў на мясцох мэтадычнай дапамогі, а такая дапамога ў нас нярэдка пастаўлена дрэнна. У радзе раёнаў абмяжоўваюцца толькі гутаркамі аб аказаньні мэтадычнай дапамогі маладым настаўнікам. Задача АНА, раймэтбюро наладзіць сыстэматычную дапамогу па мэтадычных пытаньнях маладому настаўніцтву шляхам арганізацыі нарад, узорных лекцый, пробных лекцый, літаратурай і інш.

Пленум ЦК, адзначыўшы значнае паляпшэньне матар'яльна-бытавых ўмоў настаўніцтва Менску, Дзяржынскага раёну і іншых раёнаў, падкрэсьліў, што «ў пераважнай большасьці раёнаў дырэктывы Сакавіцкага пленуму ЦК у гэтай частцы выконваюцца зусім слаба». У сьнежні месяцы г. г., згодна дырэктывы пленуму, будзе праводзіцца масавая праверка выкананьня пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб масавай школе, задача раённых партыйных арганізацый уцягнуць у гэту праверку шырокія колы настаўніцтва рабочых, калгасьнікаў, камсамольцаў і зьвярнуць асаблівую ўвагу пры гэтай праверцы на палепшаньне матар'яльна-бытавых умоў настаўнікаў.

Задачы, пастаўленыя партыяй у галіне будаўніцтва палітэхнічнай школы, могуць быць з посьпехам выкананы, калі партыйныя і профэсыянальныя арганізацыі, органы Нарасьветы, па баявому мабілізуюць шырокую пралетарскую грамадзкасьць навакол задач падняцьця якасьці працы школ, калі пытаньні школы ня будуць адсоўвацца на другі плян, калі гэтыя арганізацыі ў сваёй штодзеннай працы будуць заняты клопатамі аб школе. «Пленум падкрэсьлівае, што для выкананьня задач, пастаўленых у другой пяцігодцы, правільная і выразная пастаноўка работы школы набывае выключнае палітычнае значэньне і хутчэйшая рэалізацыя дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе на аснове барацьбы на два франты ў будаўніцтве палітэхнічнай школы, упартая барацьба за далейшае павышэньне камуністычнага выхаваньня, за пісьменнасьць і належны аб'ём ведаў вучняў, зьяўляецца баявой задачай усёй партыйнай арганізацыі».

ЗА ТЭХ*ніку*
ПЭДАГАГІЧНАГА ПРАЦЭСУ

Л. Шашкоў

Якім ёсьць і якім павінен быць урок

„Асноўнай формай арганізацыі вучэбнай работы ў пачатковай і сярэдняй школе павінен зьявіцца ўрок з данай групай вучняў, са строга вызначаным раскладам заняткаў і цьвёрдым складам вучняў. Гэта форма павінна ўключыць у сябе пад кіраўніцтвам настаўніка, агульнагрупавую, брыгадную і індывідуальную работу кожнага вучня з ужываньнем рознастайных мэтадаў навучаньня. Пры гэтым павінны ўсяляк разьвівацца калектыўныя формы вучэбнай работы, не практыкуючы арганізацыі пастаянных і абавязковых брыгад" (З пастановы ЦК ад 26-VIII 1932 г.)

У мэтах праверкі рэалізацыі пастановы ЦК аб школе, Навукова-Дасьледчым Інстытутам Камуністычнага Выхаваньня быў арганізаваны агляд шэрагу школ горада Менску. У гэтым артыкуле мы жадаем падзяліцца вынікамі агляду 22-й Менскай ФЗС, які працягваўся 3 дні. Давялося пабываць на 10-ці ўроках розных настаўнікаў І і ІІ канцэнтру.

Назіраньне за 10-цю ўрокамі на працягу трох дзён даюць магчымасьць зрабіць некаторыя вывады аб зьмесьце, мэтадах правядзеньня гэтых урокаў і дысцыпліне ў часе іх.

Было-б сьмешным адмаўляць тыя дасягненьні, якія мае наша школа, было-б сьмешным адмаўляць той факт, што асноўная маса настаўнікаў перабудавала сваю работу, перабудавала мэтады выкладаньня ў адпаведнасьці з пастановай ЦК аб школе. Нарэшце, было-б зусім няправільным адмаўляць некаторыя дасягненьні ў справе палепшаньня працоўнай дысцыпліны ў школе пасьля пастановы ЦК. Аб гэтых дасягненьнях гутарка будзе крыху пазьней. А зараз спынімся на момантах адмоўнага парадку, якія нам прышлося назіраць у справе правядзеньня 10-ці ўрокаў па розных дысцыплінах.

Першым такім момантам, міма якога ні ў якім выпадку нельга прайсьці, мы адзначаем, што значная колькасьць ўрокаў пачалася са спазьненьнем на 5 і нават на 10 хвілін. Так, напрыклад, урок па грамадазнаўству ў 5-й групе, з прычыны

спазьненьня настаўніка, пачаўся на 5 хвілін пазьней. Другі ўрок у 3-й групе таксама пачаўся са спазьненьнем на 5 хвілін з тае прычыны што ў настаўніцкай разглядаўся якісьці канфлікт і настаўнік там затрымаўся.

Урок па фізкультуры ў 4-й групе пачаўся са спазьненьнем на 10 хвілін з прычыны разгрузкі звычайнай клясы для правядзеньня фізкультуры. Разгрузка клясы якраз працягвалася 10-хвілін. Значыцца, фізкультурай займаліся ўсяго толькі 35 хвілін замест вызначаных 45 па раскладу.

Другім, і трэба сказаць агульным недахопам, у адносінах да ўсіх 10-ці ўрокаў, мы адзначаем, што ўсе яны былі распачаты бяз беглага кароткага паўтарэньня таго, аб чым гаварылася дзецям ў папярэдні разы. Бяз гэтай увязкі пачаў свой урок грамадавед, географ, фізык і настаўнікі 1-га канцэнтру. Мы лічым, што такое беглае паўтарэньне мінулага матар'ялу магло-б адыграць сваю ролю і даць пэўныя станоўчыя вынікі ў справе замацаваньня ведаў атрыманых вучнямі на папярэдніх уроках. Апрача таго, гэта паўтарэньне дало-б магчымасьць выявіць, як вучнямі засвоены матар'ял папярэдняга ўроку. Нарэшце, гэта ўсё аблегчыла-б справу засваеньня матар'ялу, што даецца вучням на бягучым уроку; была-б пэўная ўвязка (приемственность) паміж гэтымі ўрокамі.

Трэці недахоп заключаецца ў тым, што ў справе правядзеньня назіраемых урокаў ня была скарыстана, магчымая ва ўмовах школы, сума мэтадаў выкладаньня. Возьмем урок гісторыі ў 5-й групе. На гэтым уроку ішла гутарка аб фэўдалізьме ў старажытным Эгіпце, ішла гутарка аб маёнтках фэўдалаў, бойках паміж імі, пірамідах ды іншае. Зразумела, што ўсё гэта вучням 5-е клясы давалася ня лёгка. Ім вельмі цяжка было перанесьціся ў такое далёка мінулае, як старажытны Эгіпет. Але-ж настаўнік, ня гледзячы на ўсё гэта, карыстаўся адным мэтадам жывога слова— у той час, як у школе меліся карціны, на якіх намалёваны маёнткі і піраміды, пра якія ён схалястычна апавядаў вучням. Апрача таго, у справе правядзеньня такога ўроку можна было-б скарыстаць звычайную геаграфічную карту для таго, каб паказаць або напомніць (калі вучні ўжо праходзілі па геаграфіі Эгіпет) месца знаходжаньня апошняга. Гэта ўсё разам узятае аблегчыла-б дзецям працэс засваеньня вучнямі новага гістарычнага матар'ялу. Выкладчык гісторыі, на ўроку якога мы былі, не дадумаўся гэтыя наглядныя дапаможнікі скарыстаць, абмежаваўся адным жывым словам. Ён відаць «забыўся», што ў пастанове ЦК Партыі аб школе якраз падкрэсьліваецца неабходнасьць заўсёды выкарыстоўваць, пры правядзеньні ўроку, пэўную суму рознастайных мэтадаў выкладаньня. Вызваліў з бяды паважанага гісторыка загадчык школы, які праз 10-15 хвілін зьявіўся на ўрок пасьля яго пачатку і, ўбачыўшы, што ён праходзіць страшэнна нудна, доўга ня думаючы праявіў сваю ўласную ініцыятыву, прынёс карціны, аб якіх вышэй мы ўжо гаварылі.

Калі зьявіліся гэтыя дапаможнікі работа значна ажывілася. Вучні вельмі цікавіліся маёнткамі, пірамідамі і з вялікай ахвотай разглядалі малюнкі.—І можна з упэўненасьцю сказаць, што факт прыцягненьня наглядных дапаможнікаў меў свой станоўчы ўплыў на засваеньні ведаў.

Выкладчык геаграфіі таксама скарыстаў ня ўсю магчымую колькасьць мэтадаў. Яго ўрок быў праведзены ў пераважнасьці лекцыйным мэтадам, з прыцягненьнем карты. У той час, калі магчыма было прыцягнуць яшчэ дыяграмы, плякаты. Бо гутарка якраз ішла аб стане паасобных галін прамысловасьці ў розных капіталістычных краінах. Разам з гэтым рабілася параўнаньне гэтых асобных галін прамысловасьці з адпаведнымі галінамі у СССР. І тут дыяграмы маглі-б адыграць сваю станоўчую ролю. Пры правядзеньні ўроку па гісторыі і геаграфіі зусім ня ставіліся перад вучнямі паасобныя запытаньні, хоць-бы больш лёгкія, якія абуджалі-б у дзяцей напружанае, уважлівае слуханьне лекцыі настаўніка. Інакш кажучы, настаўнікі не скарысталі гутаркі як мэтаду выкладаньня, які магчыма і зусім неабходна было-б выкарыстаць.

У пастанове ЦК аб школе даецца зусім выразная ўстаноўка па пытаньні спалучэньня і ўзаемаадносін паміж тымі гатовымі ведамі, што даюцца вучням настаўнікамі і тымі ведамі, якія павінны здабывацца самімі вучнямі ў працэсе сваёй самастойнай работы над падручнікам, у лябараторыі ды інш.

У пастанове ЦК УсеКП(б) ад 25/8-32 г. гаворыцца, што «настаўнік абавязан сыстэматычна, пасьлядоўна выкладаць сваю дысцыпліну, усямерна прывучаючы дзяцей да работы над падручнікамі і кнігай, да рознага роду самастойных пісьмовых работ, да работы ў габінэце, лябараторыі, вучэбнай майстэрні, шырока ўжываючы разам з гэтымі асноўнымі мэтадамі рознага роду дэманстрацыі вопытаў і прыбораў, экскурсій на завод, у музэй, поле, лес і г. д.); пры гэтым выкладчык павінен усямерна дапамагаць дзецям пры затрудненьнях у іх вучэбных занятках. Трэба сыстэматычна прывучаць дзяцей да самастойнай работы, шырока практыкуючы розныя заданьні ў меру аўладаньня пэўным курсам ведаў».

З гэтае вынятку, узятай з пастановы ЦК УсеКП(б) аб школе, з усёй выразнасьцю выцякае, што настаўнік у першую чаргу дае гатовыя веды вучням і апошнія самі здабываюць іх у працэсе самастойнай работы пад кіраўніцтвам настаўніка.

Тут таксама паказваецца на тое, што настаўнік перш за ўсё сыстэматычна выкладае свой прадмет, а сьледам за гэтым павінна быць арганізавана самастойная прапрацоўка вучнямі ўсяго таго, аб чым зараней ён ім гаварыў. Настаўнік тое ці іншае праграмнае пытаньне, альбо цэлую падтэму растлумачвае (ізлагае) вучням, а потым арганізоўвае самастойную прапрацоўку вучнямі таго праграмнага матар'ялу, які ўжо ў асноўным ім растлумачаны. Самастойная прапрацоўка матар'ялу можа ісьці, скажам па гра-

мадазнаўстве—па падручніку, альбо можа іськці, скажам, па хэміі—у лябараторыі па дэманстраваньні розных досьледаў самімі вучнямі пад кіраўніцтвам настаўніка. Самастойная прапрацоўка і дэманстраваньне досьледаў можа быць, як гэта сказана ў пастанове ЦК Партыі, індывідуальнай, г. зн. кожны вучань працуе самастойна, а можа быць і калектыўнай, гэта азначае, што могуць быць арганізаваны па таму або іншаму праграмнаму пытаньню ці тэме, часовыя і не абавязковыя брыгады, якія, прапрацаваўшы пэўныя пытаньні, альбо выканаўшы пэўнае канкрэтнае заданьне, абвяшчаюцца распушчанымі, а потым ізноў, калі патрэбна, гэтыя брыгады могуць быць створаны ўжо ў розным складзе вучняў. Паколькі мы закранем пытаньне арганізацыі брыгаднай работы, неабходна сказаць, у сувязі з гэтым і аб тым,—як-жа ў брыгадзе павінна быць арганізавана работа. Да пастановы ЦК Партыі, вельмі часта, унутры брыгады была арганізавана работа такім парадкам, што ня толькі абгаварваліся калектыўныя незразумелыя пытаньні, але мела месца калектыўнае чытаньне. Сутнасьць гэтай калектыўнай чыткі заключалася ў тым, што адзін чытае, а ўсе астатнія слухаюць. Такі парадак работы зьніжаў якасьць, вымагаў раўнаньня на адстаючых вучняў і іншае. Зараз, калі мы ствараем брыгады, павінны арганізаваць іх працу такім чынам, што ў брыгадзе абгаварваюцца толькі паасобныя, незразумелыя пытаньні і моманты, якія ў брыгадзіраў узьнікаюць пры індывідуальнай прапрацоўцы вызначанага матар'ялу.

У часе прыватных гутарак з настаўнікамі і пры даваньні апошнім кансультацый у НДІ Кам. выхаваньня, вельмі часта паўстае пытаньне аб парадку чаргаваньня тлумачэньняў настаўніка і самастойнай работы вучняў. Часта паўста пытаньне аб тым як доўга можна тлумачыць вучням, скарыстаўшы суму рознастайных мэтадаў. У гэтым пытаньні ня можа быць аніякіх закасьцянеўшых норм. Чаргаваньне залежыць ад цэлага шэрагу акалічнасьцяй, складанасьці пытаньня (якое растлумачваецца вучням) адзінарнасьці, або здвоенасьці ўроку. Калі ні калі, асабліва пры здвоенасьці ўроку, тлумачэньні настаўніка могуць цягнуцца цэлую гадзіну, а потым можа быць арганізавана самастойная работа вучняў, якая працягваецца і на наступным уроку, незалежна ад таго, праз колькі дзён ён будзе адбывацца. Назіраньне за шматлікімі ўрокамі паказала, што жывым словам настаўніка ня была арганізавана ні індывідуальная, ні колектыўная самастойная прапрацоўка матар'ялаў па падручніку, альбо ў лябараторыі. Гісторык гэтага не рабіў з прычыны адсутнасьці падручнікаў, географ не рабіў гэтага па тэй простай прычыне, што вельмі захапіўшыся жывым словам, якое нагадвала сабою прафэсарскую лекцыю ў ВУЗ'е, толькі раздаў падручнікі, як зазьвінеў званок. Жывое слова—рэч нядрэнная, але-ж злоўжываць гэтай справай ні ў якім разе нельга; неабходна скарыстаць, пры правядзеньні таго або іншага ўроку і іншыя мэтады. Жывое слова, як мэтад—рэч патрэбная, але-ж ня трэба забываць, што гэта не вядучы, не

унівэрсальны мэтад, а толькі адзін з мэтадаў, з ліку тых разнастайных мэтадаў, якія павінны быць выкарыстаны.

Часамі гэта забываюць і злоўжываюць жывым словам, забываюць, што і пастанова ЦК аб школе патрабуе ад настаўніка карыстацца заўсёды сумай мэтадаў, а не адным якім-небудзь, як гэта мы часта можам бачыць на практыцы. Ня ўся сума магчымых мэтадаў была скарыстана на сваіх уроках настаўнікамі III-й і IV-й групы.

Выключэньнем зьяўляецца выкладчык фізыкі, які на сваіх уроках скарыстаў значна большую колькасьць мэтадаў, чым іншыя настаўнікі. Ён растлумачваў вучням сам, ужываў гутарку з вучнямі, у працэсе сваіх тлумачэньняў дэманстраваў дэсьледы і, нарэшце, замалёўваў крэйдай на дошцы паасобныя прыборы па фізыцы.

Але разам з тым і выкладчык фізыкі, які зьяўляецца выключэньнем, не скарыстаў, як і ўсе іншыя выкладчыкі, яшчэ дасьледчага мэтаду, які мог-бы выражацца ў самастойнай прапрацоўцы тэарытычнага матар'ялу, у правядзеньні пагрупна (па 4-5 вучняў у групе) самастойных досьледаў пад сваім пільным кіраўніцтвам. Зусім зьяўляецца неабавязковым усякі досьлед, незалежна ад яго складанасьці, праводзіць самому настаўніку, зрабіўшы вучняў пасыўнымі сузіральнікамі. А гэты выкладчык, фізыкі, на 2-3-х уроках якога прышлося быць, дэманстраваў сам усе досьледы. Трэба таксама зазначыць, як на адмоўны момант, што памянёны выкладчык невыстарчальна аўладаў вуснай беларускай мовай, ужываў шмат русіцызмаў, што ставіць мінус у сэнсе навучаньня вучняў граматычна і лёгічна выказваць думкі, пераняты ад настаўніка. Нарэшце, нельга не адзначыць, што выкладчык фізыкі робіць тую-жа самую памылку, як і ўсе іншыя, што не ўвязвае матар'ялу бягучага ўроку з матар'ялам папярэдніх урокаў. Але тым ня менш урок па фізыцы, які нам прышлося назіраць і нават застэнаграфаваць (стэнаграма ніжэй дадаецца), па свайму зьместу і тых мэтадах, якімі ён праводзіўся, зьяўляецца самым лепшым, самым каштоўным у параўнаньні з усімі іншымі, якія прышлося бачыць ў гэтай Менскай школе.

Д ы с ц ы п л і н а. Вялікае значэньне набывае дысцыпліна на ўроку, ад гэтага залежыць яго эфэктыўнасьць. Мы добра разумеем, што пытаньне барацьбы за працоўную дысцыпліну наогул, і ў прыватнасьці пытаньне барацьбы за гэтую дысцыпліну ў часе ўрокаў, не зьяўляецца такім простым, такім лёгкім; горш таго не заўсёды ясна ўяўляем сябе канкрэтныя шляхі і мэтады барацьбы за працоўную дысцыпліну наогул, і ў прыватнасьці на ўроку. Вельмі часта мы забываем асноўны шлях барацьбы за працоўную дысцыпліну ў часе занятак.

Што-ж мы лічым асноўным шляхам барацьбы за дысцыпліну ў часе ўрокаў? Па нашай думцы, такім шляхам зьяўляецца зусім правільная, зусім добрая арганізацыя ўроку. А пад добрай арганізацыяй ўроку мы разумеем перш за ўсё сур'ёзную падрыхтоўку

самога настаўніка, прапрацоўка і сур'ёзнае, глыбокае прадумваньне ўсяго прыпаднасімага вучням матар'ялу. Зразумела, што настаўнік ня можа абмежавацца прапрацоўкай па падручніку (які даецца дзецям), а павінен прапрацаваць значна большую колькасьць літаратуры, якая адносіцца да таго або іншага ўроку. У паняцьце добрай падрыхтоўкі настаўніка і арганізацыі ўроку мы адносім сур'ёзнае прадумваньне і падбор, той сумы мэтадаў, якая вымагаецца тым або іншым праграмным пытаньнем, або цэлай тэмай, а таксама падбор і падрыхтоўка адпаведных досьледаў. Паасобныя настаўнікі, як паказвае наша назіраньне і стэнаграма 3-х урокаў, «забываючы» гэты асноўны шлях барацьбы па цэламу шэрагу прычын, робяць ўпор на другарадны шлях барацьбы за працоўную дысцыпліну на ўроку, упор на запужваньне, прыкрываньне, выстаўленьне паасобных вучняў з клясы, абапіраюцца на паасобныя заўвагі па адрасе тых вучняў, якія сябе дрэнна трымаюць у часе ўроку. Мы ад гэтай сумы мер, за выключэньнем запужваньня і прыкрываньня, не адмаўляемся і ня можам пакульшто адмовіцца, але-ж лічым іх не рашаючымі, не асноўнымі ў справе барацьбы за працоўную дысцыпліну ў часе ўроку. Мы іх лічым мерамі другараднага парадку. Асноўным шляхам барацьбы за працоўную дысцыпліну ў часе ўроку трэба лічыць арганізацыю ўроку, належны падбор і глыбокае прадумваньне сумы мэтадаў, глыбокае прадумваньне сыстэмы спосабаў і прыёмаў у межах кожнага паасобку мэтаду. Вось, што неабходна лічыць правільным падыходам да вырашэньня праблемы працоўнай дысцыпліны ў часе ўроку. Правільнасьць нашага пункту гледжаньня па пытаньні барацьбы за працоўную дысцыпліну ў часе ўроку мы можам падмацаваць прыкладамі з школьнай практыкі.

Вышэй ўжо адзначалася, што самым лепшым урокам, як з пункту гледжаньня яго зьместу, так і з пункту гледжаньня мэтадаў яго правядзеньня, зьяўляецца ўрок па фізыцы, хоць і ён мае такіясякія, намі адзначаныя недахопы.

І трэба сказаць, што і дысцыпліна на гэтых уроках фізыкі была самай лепшай; а гэта таму, што выкладчык фізыкі належным чынам падрыхтаваўся сам: прадумаў праграмны матар'ял, падабраў, і відаць прадумаў, пэўную суму мэтодаў і сыстэму прыёмаў у межах кожнага мэтоду, падабраў і прадумаў пэўную колькасьць досьледаў; дзякуючы гэтаму настаўнік фізыкі змог аўладаць клясай, змог трымаць апошнюю ў коле свае ўвагі, змог зацікавіць і прыкаваць ўвагу дзяцей да ўсяго таго, аб чым ім гаварыў, да тых досьледаў, што дэмонстраваў у часе ўроку. Выкладчык фізыкі змог, нарэшце, устанавіць правільныя суадносіны паміж сабой і дзецьмі, змог дабіцца актыўных узаемадзеяньняў між вучнямі і сабою, якія выражаліся ва ўзаемнай дачы пытаньняў, ва ўжываньні гутаркі, замацаваньні вучнямі ў сваіх сшытках паасобных фізычных прыбораў, аб якіх гаварылася на ўроку і якія замалёўваліся настаўнікам на дошцы. І трэба сказаць, што на ўроках фізыкі, амаль ня было сумуючых вучняў, ня было выпадкаў парушэньня дысцы-

пліны ў часе ўроку і выкладчык фізыкі, як правіла, не прыбягаў да запужваньня вучняў, выкрыкваньня і выстаўленьня з клясы.

Зусім іншы малюнак можна было наглядаць на ўроках гісторыі, грамадазнаўства, геаграфіі; на гэтых уроках мелі месца выпадкі парушэньня дысцыпліны: хаджэньня вучняў па клясе, размовы паміж сабою, і самае галоўнае, што на гэтых уроках было шмат незацікаўленых вучняў. Яны ня слухалі зусім таго, аб чым ім гаварыў настаўнік. Тут ня было актыўнага ўзаемадзеяньня паміж вучнямі і настаўнікам. А гэта ў значнай ступені можна растлумачыць тым, што настаўнікі памянёных дысцыплін ня былі гатовы да правядзеньня ўрокаў, ня думалі над матар'яламі і мэтадамі выкладаньня. Вынікі ад такіх урокаў, зразумела, ня могуць быць добрымі. Асабліва адрозьніваецца сваёй неарганізаванасьцю ўрок па расійскай мове ў III групе. Перш за ўсё адзначым, што ўрок гэты пачаўся, таксама, з некаторым спазьненьнем. Настаўнік на гэты ўрок зьявіўся непадрыхтаваным. Аб непадрыхтаванасьці настаўніка сьведчыць такі факт, што апошні, зьявіўшыся на ўрок, ня ведаў што рабіць, з чаго пачаць. Адрасаваўся па гэтаму пытаньню да вучняў і з іх дапамогай ўстанавіў, што на апошнім уроку ім быў зададзен якісьці верш для вуснага вывучэньня і штэ верш на дадзеным уроку павінен быў вучнямі, па чарзе, вусна пераказвацца. Факт гэты быў калектыўна ўстаноўлен, пасьля чаго пачаўся пераказ. Вусны пераказ гэтага вершу вучнямі цягнуўся хвілін 15—20,—а пасьля пачалося галоснае чытаньне таксама па чарзе, якойсьці вершаванай казкі. У чытаньні прымала ўдзел каля 10-ці вучняў.

Цікава тое, што як у часе вуснага пераказу, так і ў часе галоснага чытаньня 50 проц. вучняў ня ўдзельнічалі ў чытаньні, не сачылі сьледам за чытаньнем вучняў, а займаліся прыватнымі гутаркамі, лістаньнем кніжок, хаджэньнем па клясе, маляваньнем і інш. Прачытаўшы вершаваную казку, настаўнік прапануе вучням завучыць яе напамяць, але вучні заяўляюць пратэст, указваючы на тое, што гэта казка зьяўляецца вялікай, цяжкай і г. д. Настаўнік спрабуе пераканаць вучняў, але вельмі няўдала. У выніку пытаньне застаецца нявырашаным. Робіцца пераход да разбору незразумелых вучням слоў. Настаўнік тлумачыць слова «чорт». У сувязі з гэтым паўстае пытаньне: ці ёсьць на белым сьвеце чэрці? Частка вучняў (⅓) выказваецца за тое, што чэрці маюцца, другая частка выказваецца, што чарцей няма. У клясе падымаецца шум, гам. Настаўнік прапануе тым вучням, якія думаюць што ёсьць, падняць рукі; галасуе за тое, што ёсьць чэрці ⅓ частка клясы.

У заключэньне ўроку, настаўнік прыкладае ўвесь свой пэдагагічны «талент», каб давесьці, што чарцей няма, але ў сувязі з тым, што набліжаўся канец уроку, вучні амаль тлумачэньняў настаўніка ня слухалі. У часе яго тлумачэньняў (да-рэчы вельмі няўдалых) вучні складалі сшыткі, падручнікі і надзявалі вопратку, а зрабіўшы

гэта яны сталі за партамі і з вялікай нецярплівасьцю чакалі званка. У клясе, у гэты час, стаяў страшэнны шум, настаўнік-жа, ня гледзячы на ўсё гэта, усё тлумачыў ды тлумчыў, што чарцей на белым сьвеце няма. Нарэшце, празьвінеў званок і дзеці рынуліся гурбай да выхаду. І гэта яшчэ ня ўсё... На працягу ўсяго гэтага ўроку з калідору даносіўся страшэнны крык, размовы, якія перашкаджалі нармальнаму ходу занятак і ўзбуджалі дзяцей. У працэсе ўроку, пэрыядычна, праз кожныя 5—7 хвілін адчыняліся дзьверы клясы і паказваліся з калідору галовы вучняў з выкрыкамі. Частка вучняў сядзела ў шапках, мела месца хаджэньне па клясе, надзяваньне і разьдзяваньне вопраткі, размовы паміж сабою, і, нават перад канцом уроку, самавольны ўход з клясы 2—4-х вучняў. Настаўнік на ўсё гэта не зварачваў ніякай увагі.

Такі зьмест уроку, гэтая дысцыпліна ў часе яго.

Паўстае пытаньне, што і каму мог даць такі ўрок. Зразумела, што такі ўрок ня мог даць дзецям нічога цікавага і каштоўнага.

Такім чынам, з пратакольнага запісу відаць, што ўрок па расійскай мове ў III групе ня можа быць прызнаны здавальняючым, ні па зьместу даваемага вучням матар'ялу, ні па мэтадах правядзеньня яго і, нарэшце, па тэй нікуды нявартай дысцыпліне, якую прышлося наглядаць ў часе ўроку.

Урок пачаўся з вуснага пераказу вершу; рэч гэта нядрэнная. Мы, зразумела, ня супроць завучваньня напамяць невялікіх вершаў і вуснага пераказу іх ў часе ўроку, але мы супроць бяссэнсоўнага завучваньня і пераказу. Мы супроць такога вуснага пераказу, калі амаль ніхто з вучняў ня слухае пераказваючага.

А на памянёным уроку мы ўсё гэта маглі бачыць. Вучні адзін за другім бяссэнсоўна пераказвалі і пераказваючага амаль ніхто ня слухаў. Настаўнік не растлумачваў вучням незразумелых слоў, ня ставіў перад імі запытаньняў па вершы, з тым, каб высьветліць, як яны пераказвалі верш, ці разумеюць яго сутнасьць.

Галоснае чытаньне ў клясе па чарзе, таксама рэч нядрэнная. Добра пастаўленае чытаньне дае магчымасьць навучыць дзяцей правільна і выразна чытаць.

Але такое чытаньне, якое мы назіраем на ўроку ў III групе, зразумела, нікуды нявартa. Добрая частка вучняў не сачыла за чытаньнем свайго таварыша, ня слухала чытаемага, займалася размовамі і рознымі прыватнымі гутаркамі, перашкаджаючы, як чытаючаму, так і астатнім, у якіх было жаданьне слухаць і сачыць за ім.

Ясна, што такое чытаньне не магло даць нічога карыснага. Тут мы мелі дарэмную трату часу. Тлумачучы незразумелыя словы, у прыватнасьці слова чорт, настаўнік дапушчае дзьве вельмі сур'ёзныя памылкі. Першая памылка заключаецца ў тым, што настаўнік ставіць пытаньне двухсэнсоўна (ёсьць ці не чэрці) у той час, як ён павінен зусім цьвёрда заявіць, што ніякіх чарцей ніколі ня было і няма, што гэта ёсьць выдумка.

Другая памылка заключаецца ў тым, што настаўнік дапушчае галасаваньне сярод дзяцей, і гэтым самым у вачох дзяцей ставіць пад сумненьне пытаньне выдумкі існаваньня чарцей.

Дысцыпліна ў часе вуроку была надзвычайна кепская і гэта ў значнай ступені залежыла—ад таго, што ўрок па свайму зьместу быў вельмі і вельмі ня цікавым, быў вельмі дрэнна арганізаваным. Сам настаўнік ня быў падрыхтаваны да ўроку. Ён ня змог аўладаць вучнямі, ня змог устанавіць правільныя ўзаемаадносіны паміж сабою і імі. Зусім не рэагаваў на факты парушэньня працоўнай дысцыпліны ў часе ўроку.

У заключэньне спынімся на пытаньні запісу вучнямі ўроку.

У школах існуюць двох радоў запісы. Да першага—адносіцца запіс вучнямі ў сваіх сшытках, пад дыктоўку настаўніка. Да другога роду—мы адносім самастойны запіс вучняў у працэсе тлумачэньняў настаўніка. Прагляд гэтых запісаў паказвае, што вучні ў першым, і асабліва ў другім выпадках, у працэсе запісваньня дапушчаюць вялікую колькасьць граматычных памылак, скажаюць тэрміны. Запісы гэтыя носяць вельмі прымітыўны характар і ніякай каштоўнасьці сабой не прадстаўляюць. Апрача таго, па нашай думцы, такое запісваньне прыносіць шкоду дзецям. Шкоднасьць гэта заключаецца ў тым, што вучні завучваюць паасобныя скажонныя тэрміны, завучваюць няправільна з граматычнага боку напісаныя словы. Нам думаецца, што самастойны запіс вучняў у працэсе тлумачэньняў настаўніка не павінен мець месца ў школе. Запіс-жа пад дыктоўку настаўніка магчыма, як выключэньне, ужываць толькі ў тых выпадках, калі адсутнічаюць падручнікі. Лепш за ўсё гэты запіс пад дыктоўку праводзіць праз запісваньне на дошцы.

Але і запіс на дошцы можна практыкаваць у клясе, калі там маецца добрая дошка, калі яна стаіць у зручным месцы, пры наяўнасьці невялікай колькасьці вучняў у групе; нарэшце, калі сам настаўнік можа добра, зусім выразна (каліграфічна) пісаць на дошцы.

Калі-ж гэтыя ўмовы адсутнічаюць, дык лепш проста вучням дыктаваць, не запісваючы на дошцы. Пры гэтым, мы лічым, што сшыткі вучняў з такімі запісамі павінны абавязкова пэрыядычна правярацца настаўнікам і выпраўляцца памылкі.

Стэнаграма ўроку па фізыцы

(Вурок праведзены ў 5-ай групе 22-ой Менскай Ф. З. С. 22|XI—32 г.

— **Выкладчык**—Цяпер я Вам раскажу пра ціск вадкасьці на дно пасудзіны. Мы ў мінулы раз разглядалі ціск вадкасьці на бакавыя сьцены, а цяпер—на дно пасудзіны.

Вось возьмем пасудзіну, нальлем туды вады. Ад чаго будзе залежыць ціск вадкасьці на дно? (малюе на дошцы). Ціск вадкасьці



Мял. 1.

на дно будзе залежыць ад велічыні налітай вады, вышыні, значыць, сталба. Калі я больш нальлю вады, то большы будзе ціск, а калі я нальлю менш вады, то меншы будзе ціск на дно.

Гэта можна даказаць простым досьледам такога парадку. Калі мы ў стакане зробім дзьве дзюрачкі: адну зьверху, а другую унізу, то вада будзе пралівацца, зьверху вада праліваецца струёй, якая будзе адхіляцца далей. Чаму—таму, што на гэтай плошчы будзе большы ціск і наадварот, чым глыбжэ, тым ціск будзе большы, а ўнізу слаі вадкасьці будуць менш давіць, меншы



Мал. 2.

будзе ціск, і струя будзе адхіляцца значна менш. Чым вышэй столб, тым ціск будзе большым, і наадварот, чым ніжэй столб, тым ціск будзе меншым.

Ціск вадкасьці на дно будзе залежыць ад велічыні і высаты сталба вадкасьці. Што ціск на дно залежыць ад велічыні дна і вышыні сталба вадкасьці, можна даказаць досьледам, альбо прыборам Паскаля. Зразумела, у мяне няма такога прыбора, у мяне прасты прыбор. Вы тут бачыце два сасуды: адзін вузкі, другі шырокі, я хачу даказаць, што ціск вадкасьці залежыць ад плошчы дна і высаты сталба вадкасьці. Вось у мяне ёсьць два сасуды. Вазьму адзін сасуд, прывінчу яго, нальлю вады, т. як дно будзе аднолькавае ў гэтых двух сасудах, я вады нальлю на аднолькавую вышыню, а вышыня ў мяне будзе вымярацца прывескам—такім указацелем, тут павешу гіркі, я атрымаю наступнае (робіць вопыт): вада будзе стаяць на аднолькавай вышыні, хаця колькасьць вады будзе розная, а трымацца будзе на аднолькавай вышыні, таму што дно будзе аднолькавае. А цяпер я зраблю так—прывінчу сюды гэтую пасудзіну (паказвае як гэта рабіць).

— Як называецца гэты прыбор?

— **Вучні**—прыбор Паскаля.

— Для даказацельства чаго?

— **Вучні**—для даказацельства таго, што ціск большы на дно, чым на бакі.

— Хто можа сказаць тачнее?

— **Вучні** (адказ не запісан з прычыны нячутнасьці).

— Вось я наліў сюды вады (налівае ваду ў вялікі сасуд), вада будзе выцякаць да тэй пары, пакуль не застановіцца на тым-жа самым узроўні, бязумоўна гэта прыблізна. Вось застанавілася вада. Мы глядзім прыблізна на якой вышыні. Вось на такой вышыні.

— **Вучні**—трошкі вышэй...

— Можа трошкі вышэй, але-ж гэта прыблізна

— **Вучань**—зараз хопіць, якраз.

— Так, цяпер я выльлю гэтую ваду і прывінчу другую пасудзіну, меншага разьмеру, але гірак ня буду зьнімаць, значыць вага будзе аднолькавая. Вы бачыце, дно аднолькавае, гіркі не зьнімаю. Саабразіце, на якой вышыні будзе стаяць вада ў гэтай трубцы. Як відаць, на аднолькавай вышыні. Калі вышэй, то вада выцячэ і будзе цеч да тэй пары, пакуль ня стане на гэтую вышыню.

— **Вучань**—гэты сасуд быў шырэйшы, а гэтая пасудзіна меншая.

— Тут больш вады, а тут менш, мы гэта зараз разьбярэм. Вада выцячэ да такой вышыні; калі я нальлю вышэй, то ціск будзе большы, вада будзе выцякаць і застановіцца прыблізна на гэтай вышыні, будзе трымацца на гэтай вышыні (паказывае на прыборы).

— Зразумелі вы гэта?

— **Вучні**—да!

— Вы зарысуеце гэты досьлед, а цяпер разьбярэм такім чынам, чаму тут так атрымоўваецца. Я вам намалюю гэтыя пасудзіны на дошцы (малюе на дошцы).



Мал. 3 і 4.

Вы сказалі, што вадкасьць будзе стаяць на аднолькавай вышыні. Тут вышыня і тут вышыня павінна быць аднолькавая, але тут як быццам нейкая супярэчнасьць: адзін сасуд шырэйшы, у ім вадкасьці больш, у другім сасудзе вадкасьці менш, а ціск аднолькавы. Гэта называецца «гидростатический пародокс». Эта супярэчнасьць кажучаяся на від.

Гэта можна растлумачыць такім чынам. Тут вадкасьць, якая наліта ў шырокую пасудзіну, давіць на бакавыя сьцены, і гэты ціск зьнішчаецца супраціўленьнем бакавых сьценак... і атрымоўваецца як быццам столбік. Тут столбік вужэй (паказвае на малюнак), а тут якраз наадварот, атрымоўваецца, што ціск, які тут давіць на дно, ён перадаецца вадкасьцю ўнутры вадкасьці ўверх, на сьценкі, потым адкідываецца, як мячык, адхіляецца, і гэты ціск у сваю чаргу давіць у другі раз і г. д., таму ціск тут утвараецца большы...

Як тут, так і там атрымоўваецца той-жа самы столбік, аднаго ціску, аднаго разьмеру. Гэты досьлед і сасуд Паскаля гаворыць аб тым, што ціск вадкасьці залежыць ад плошчы дна, ад вышыні сталба вадкасьці, але не залежыць ад формы пасудзіны. У мяне зараз пад рукамі маецца толькі такая пасудзіна, я мог-бы яшчэ прывесьці і другую форму, ад формы пасудзіны ціск вадкасьці на дно не залежыць ад плошчы дна.

Гэты закон Паскаля «давление на дно» прымяняецца, як прынцып у гідраўлічных машынах, у вадзяных машынах, у гідраўлічным прэсе. Я вам намалюю, у мяне мадэлі няма. Вы можаце бачыць гідраўлічны прэс на дражджавых заводах, дзе прасуюць дрожджы, гідраўлічны прэс ужываецца на заводах і фабрыках, сена могуць прасаваць гідраўлічным прэсам, хлопак, сок можна

...інстытут ... імя ... сельскагаспадарчага навучаньня

выжымаць з ягад гідраўлічным прэсам, і ў справе друку можна бачыць прэс, але не вадзяны, а вінтовачны, адным словам, калі што небудзь трэба прасаваць, то прасуюць такім прыборам, такой машынай, якая называецца прэсам.

Вось я вам намалюю просты гідраўлічны прэс. Возьмем дзьве злучаныя пасудзіны, якія вам ужо вядомы.



Мал. 5.

Вы мне скажыце, як будзе стаяць вадкасьць у гэтых дзьвух пасудзінах, дайце поўны адказ.

— **Вучні**—будзе стаяць на аднолькавай вышыні.

— Правільна, калі мы маем вадкасьць у дзьвух злучаных пасудзінах, то гэтая вадкасьць у гэтых дзьвух пасудзінах будзе стаяць на аднолькавай вышыні. Калі палажыць адно кілё на поршань, як будзе перадавацца ціск па закону Паскаля?

— **Вучань**—ціск вады будзе перадавацца аднолькава на дно, на аднолькавай вышыні.

— **Другі вучань**—у вадкасьці ціск перадаецца аднолькава ва ўсе бакі з аднолькавай сілай.

— Гэты закон трэба фармуліраваць ясна, адчотліва. Закон Паскаля гаворыць нам, што ціск у вадкасьцях перадаецца раўнамерна і з аднолькавай сілай ва ўсе бакі. Паўтарыце вы.

— **Вучань**—закон Паскаля, калі мы маем у якой-небудзь пасудзіне ваду, то ціск будзе давіць з аднолькавай сілай на ўсе бакі.

— Не давіць, а перадавацца.

— **Вучань**—перадавацца з аднолькавай сілай ва ўсе бакі.

— Вось калі напрыклад у гэтай пасудзіне дно ў 10 раз шырэй (паказывае на дошку), значыць ціск будзе ў колькі разоў больш.

— **Вучань**—у 10 разоў.

— Калі я тут палажу які-небудзь груз (паказвае на дошку) скажам у 1 кілё, то сілай у 1 кілё я ўтварыў ціск у 10 кілё, а ў

гідраўлічных прэсах на фабрыках і заводах, там у сто і больш разоў павялічваецца ціск.

— **Вучань**—чаму гэта тут адно кілё, а тут 10...

— На кожны квадратны санцімэтр давіць 1 кілё, а тут (паказвае на дошку)—колькі квадратных санцімэтраў?

— **Вучань**—10.

Калі на адзін квадратны санцімэтр адно кілё, то на 10 ў 10 разоў больш, бо плошча будзе ў 10 раз больш.

Можна яшчэ задаць такое пытаньне—што выігрываецца ў сіле? Калі я апушчу ўсё гэта (паказвае на дошку) на 5 санцімэтраў ніжэй, то вы разьбярыце—на колькі тут паднімецца вада?

— **Вучань**—на ½ санцімэтра.

— Чаму?

— **Вучань**—5 трэба разьдзяліць на 10.

— Столб вады разьмеркаваць на большую плошчу. Калі-б я апусьціў тут на 1 санцімэтр, то ў гэтай пасудзіне (паказвае на дошку) на колькі-б узьнялася-бы вада?

— **Вучні**—на 10.

— Чаму?

— **Вучань**—таму, што гэта ў 10 раз вужэй.

Цяпер я вам намалюю гідраўлічны прэс другой формы, якія прымяняюцца на фабрыках альбо заводах, гэта больш складаны тып. (Малюе на дошцы).



Мал. 6.

Бярэцца вузкая пасудзіна, устаўляецца ў пасудзіну поршань, а што такое поршань, вам вядома, я вам паказываў; да поршня прымацоўваецца рычаг, які прымацоўваецца на падстаўцы.

Бярэцца другая пасудзіна, шырэйшая, у гэтую пасудзіну ўстаўляецца трубка, унізу гэтай пасудзіны маецца кляпан, які адчыняецца ўверх. Ад першай пасудзіны больш вузкай адходзіць трубка, якая ідзе да другой пасудзіны больш шырокай, і другая трубка адходзіць і ідзе ў другі бок у калёдзіц, альбо рэзэрвуар, як там у вас напісана ў кніжцы, і там таксама на дне вузкай пасудзіны маецца кляпан, які адчыняецца ўверх. У рэзэрвуары знаходзіцца вада. У большы цыліндр устаўляецца поршань, які плотна прыганяецца да сьценак цыліндра. Тут ціск атрымоўваецца такім чынам: калі я буду паднімаць за канец гэтага рычага (паказвае на малюнак), то поршань будзе падымацца ўгару, а што будзе пад поршнем у цыліндры?

— Вучні—будзе набірацца вада з калодца.

— Чаму?

— Вучні—таму, што будзе пуста.

— Тут адчыняецца кляпан, воздух будзе давіць на ваду, і гэтая вада будзе па гэтай трубачцы ўваходзіць у першую вузкую пасудзіну. Цяпер, што будзе, калі я буду апускаць рычаг і разам з гэтым поршань уніз у цыліндр? Зачыніцца кляпан у гэтым-жа вузкім цыліндры, і вада па другой трубцы будзе ўваходзіць у другі цыліндр больш шырокі, адчыняючы кляпан. І такім чынам паднімаючы і апускаючы рычаг, я буду пераганяць ваду па трубке ў шырокую пасудзіну і вада будзе паднімаць поршань і паложым на поршань які-небудзь груз, тое, што я прасую. Як зрабіць разьлік, з якой сілай я буду надаўліваць.

Перш за ўсё, наколькі гэтая пасудзіна шырэй, чым гэтая пасудзіна (паказвае на малюнак). Калі гэтая пасудзіна ў 10 разоў шырэй, то ціск будзе ў 10 разоў больш,—гэта па-першае; па-другое—гэты рычаг будзе якога роду. Гэты рычаг першага роду. Пры рычаге першага роду на колькі выігрываецца ў сіле?

— Вучні (адказваюць, але адказу ня чуваць).

— Які вы ведаеце першы закон адносна рычагоў?

— Вучні (адказваюць, але адказу ня чуваць).

— Калі гэтая плошча ў 10 разоў большая, то сіла—таксама большая ў 10 разоў, то тут ціск (паказвае на малюнак) больш у 100 разоў. Калі я буду нажымаць на рычаг з сілай ў 1 кілё, то тут будзе сьціскацца груз у 100 кілё.

Цяпер мы паўтарым, аб чым мы сёньня гаварылі.

— Вучні—мы сёньня гаварылі аб законе Паскаля.

— Ад чаго залежыць ціск вадкасьці?

— Вучань—ад велічыні дна.

Ад плошчы дна пасудзіны і яшчэ ад чаго? Ад формы пасудзіны залежыць?

— Вучань—ад формы не залежыць.

— Ад чаго-ж залежыць яшчэ? Залежыць ад плошчы дна і ад вышыні сталба вадкасьці, а не залежыць ад формы пасудзіны. Гэты закон трэба формуліраваць точна, чотка.

І потым, далей, якія машыны мы разглядалі?

— Вучань—гідраўлічны прэс.
— Раскажыце мне па схэме, як дзейнічае гэты прэс, і для чаго прымяняецца гідраўлічны прэс.
— Вучні—прасаваць сена, ягады, а салому можна?
— Салому можна, дрожджы, адным словам, калі трэба штонебудзь сьціснуць, спрасаваць.
(Выклікае да дошкі аднаго вучня і пытаецца ў яго). А вось, што тут намалёвана?
— Вучань—тут калодзец, тут вузкая пасудзіна, тут шырокая пасудзіна.
— Для чаго патрабуецца рычаг?
— Вучань—паднімаць поршань уверх і апускаць уніз.
— Што вы яшчэ тут бачыце?
— Вучань—адна трубка ідзе з вузкай пасудзіны да шырокай пасудзіны, а другая ў калодзец.
— Колькі маецца кляпанаў тут?
— Вучань—два кляпаны.
— Адчыняюцца кляпаны ўверх, а скажыце як працуе гэтая машына?
(Запытваецца ў другога вучня).
— Другі вучань—калі я буду паднімаць рычаг, то ў мяне кляпан адчыняецца.
— Чаму?
— Вучань—пад напорам вады.
(Далейшы адказ вучня не запісан з прычыны нячутнасьці).
А як разьлічыць, з якой сілай гідраўлічная машына працуе, як зрабіць разьлік, хто скажа? З якой сілай сьціскае, з якой сілай трэба давіць на рычаг.
(Адказ вучня не запісан з прычыны нячутнасьці).

Званок

Вы прачытаеце па кнізе «Фізыка Брохэса» на стар. 41, 40 і 42, 45; па «Фізыцы Цингера» на расійскай мове—прачытаеце на стар. 122.

С. Равін

Становішча геаграфіі ў IV групе школ БССР

I. Агульныя заўвагі

Геаграфія зьяўляецца ў нашай школе да некаторай ступені мэтадычна запушчаным прадметам: раней прадмет быў паглынены комплексным матар'ялам; настаўнікі вельмі мала звярочвалі ўвагу на мэтодыку выкладаньня данага прадмету. Панавала чамусьта думка, што геаграфію можна выкладаць без спэцыяльнай падрыхтоўкі. Падручнікі і добрая геаграфічная карта амаль што адсутнічалі ў школе. Аб папулярнай геаграфічнай літаратуры ня ведалі нават настаўнікі. У выніку, вучні выходзілі з вельмі

слабымі ведамі па фізычнай і палітычнай геаграфіі, а арыентыроўка на карце была зусім дрэнная. Пасьля пастановы ЦК ад 5/IX 31 г. маем некаторы зрух, але «карэнны недахоп» па данаму прадмету яшчэ ня ліквідаваны. Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 25/VIII 1932 г. канстатуе яшчэ вялікія недахопы ў праграмах па геаграфіі, канстатуе адсутнасьць арыентыроўкі на карце» з боку вучняў і прапануе надалей забясьпечыць веды па карце СССР, асноўных паняцьцяў фізычнай геаграфіі, прыроднай і эканамічнай геаграфіі СССР, як у цэлым, так і кожнай з рэспублік, краёў і вобласьцей.

У малодшых групах (3 і 4) нашай школы даецца прапэдэўтычны курс геаграфіі, які павінен забясьпечыць дакладна акрэсьленую колькасьць ведаў па фізычнай геаграфіі і геаграфіі СССР, што павінны служыць базай для лепшага засваеньня сыстэматычнага курсу ў старэйшых групах школы.

З гэтага пункту погляду НДІ Камвыхаваньня правёў дасьледваньне аб'ёму ведаў вучняў 3 і 4 груп. Мы хацелі высьветліць на падставе сабранага вопыту школ, наколькі вучні атрымалі дакладна акрэсьленае кола ведаў, наколькі вучні падрыхтаваны да праходжаньня сыстэматычнага курсу геаграфіі ў старэйшых групах, наколькі мэтазгодна складзена праграма па геаграфіі ў 3-й і 4-й групах.

Абсьледваньнем у 4 групе мы ахапілі 11 груп, з агульнай колькасьцю 288 вучняў; сабралі матар'ял па наступных 6 тэмах:

1. Месца СССР на зямной кулі; 2) паліт-адміністрацыйная карта СССР; 3) тундра; 4) тайга; 5) галоўныя прамысловыя раёны СССР і 6) галоўныя сельскагаспадарчыя раёны СССР.

Усяго мы сабралі ад вучняў 4636 адказаў на розныя запытаньні па пералічаных тэмах курсу.

II. Агульныя вынікі дасьледваньня

Зводка ведаў вучняў 4-х груп па прынцыпе арытмэтычнай сярэдняй дае наступныя паказчыкі:

		Дасьл. вучн.	% пасьпях.
1	Веды карты (асабліва граніц СССР)	152	76,2
2	Веды паліт-адміністрац. карты СССР . . .	75	74,8
3	Веды па тэме „Тундра“	120	50,0
4	Веды па тэме „Тайга“	49	53,3
5	Веды галоўных прам. раёнаў СССР . . .	1/9	40,1
6	Веды галоўных сельскагаспадарчых раёнаў СССР	59	51,4

Адсюль мы бачым, што найлепшыя вынікі маюцца па першых двух тэмах; слабейшыя вынікі—па апошніх чатырох. Чым магчыма растлумачыць лепшыя вынікі па першых двух тэмах?

Нам думаецца, тым, што гэтыя тэмы ў праграме чотка распрацаваны.

Гэтыя тэмы распрацаваны такім чынам, што для настаўніка іншы аб'ём ведаў, якія патрабуюцца, а менавіта—вучні павінны ведаць граніцы СССР на Захадзе (Фінляндыя, Эстонія, Латвія і г. д.), на поўдні і ўсходзе (Турцыя, Пэрсія, Аўганістан і г. д.). Таксама чотка акрэсьлены патрабаваньні да вучняў па наступнай тэме: «Паліт-адміністрацыйная карта СССР»; тут павінны вучні ведаць усе 7 самастойных рэспублік і іх галоўныя гарады. Зусім інакш у астатніх тэмах. Там праграмы нячотка паказваюць, якія іменна галоўныя прамысловыя раёны трэба прайсьці з вучнямі; дзякуючы гэтаму мы сустракаемся з фактамі, што настаўнікі выкладаюць гэтыя тэмы па рознаму; можна сказаць, што ў кожнай школе даюць вучням іншыя веды, знаёмяць з іншымі геаграфічнымі фактамі. У некаторых школах 4-я група праходзіць СССР амаль, як у 6-й групе: вучням даецца шмат фактаў і назваў, з якімі дзеці ня могуць справіцца.

Атрымоўваецца несыстэматычнае праходжаньне курсу, беспарадачная сума назваў, якія вучні паўтараюць часам зусім някрытычна. Паясьнім адным прыкладам: на пытаньне—у якіх галоўных раёнах мы больш усяго здабываем вугаль,—былі такія адказы: у Донбасе, Урале, Іркуцку, Кузьнецку, Сахаліне, Сібіры, Падмаскоўным, Чэрэмхаўскім, Кузбасе, Якуцкай, Янісо і Тупсі (Туапсэ).

Гэтыя адказы яскрава паказваюць, што няма ў вучняў чоткіх ведаў па данаму запытаньню; тут Урал высоўваецца на віднейшае месца ад Кузбасу. Кузбас, Кузьнецк і Сібір адзначаюцца, як тры на Янісеі, у Туапсэ... Вучань атрымаў шмат паняцьцяў, але беспаасобныя месцы здабычы вугалю. Адначасова даюцца зусім няправільныя бяссэнсоўныя адказы—быццам вугаль здабываецца сыстэмна, у выніку чаго мае блытаніну ў ведах. Вучні, такім чынам, зусім слаба падрыхтаваны да далейшага вывучэньня СССР. Яны не замацавалі асноўных ведаў паказанай тэмы і ім трэба добра ведаць 4 галоўныя раёны: Донбас, Кузбас, Падмаскоўны і Караганду. На падставе гэтых нямногіх фактаў, вучні змогуць у наступных групах вывучаць і іншыя раёны здабычы вуглю. Вось асноўны недахоп работы. Прычым, тут віна ня толькі мэтадаў работы настаўніка, але і нявыразнасьці пабудовы самой праграмы. Як абстаіць справа засваеньня ведаў у розных школах?

Наступная табліца дае адказ на гэтае запытаньне:

		М. 25	М. 39	М. 7	Засл.	Барыс. 2-х комп	Барыс. 8 ФЗС	Койдан. школ
1	Месцы СССР (граніцы)	76,1	79,4	—	66,8	79,8	—	—
2	Тундра	—	61,2	49,8	—	—	28,1	—
3	Галоўныя прам. раёны	—	—	48,9	44,5	34,3	46,5	76,6

Мы бачым, што па геаграфіі Менскія школы даюць лепшыя паказчыкі, чым раённыя. Па матэматыцы мы атрымалі адваротнае зьявішча: Менскія школы аказаліся на апошнім месцы. Тут меў уплыў той факт, што ў Менску школы лепш абсталяваны геаграфічнымі прыладамі, чым раённыя школы.

Па лініі паасобных школ трэба падкрэсьліць, што найлепшыя паказчыкі дае IV група Менскай 25 узорнай ФЗС. Апрача таго, што даная група выявіла высокія паказчыкі ведаў (91—96 проц.), вучні паказваюць значую сыстэматычнасьць ведаў: большасьць з іх пералічваюць заходнія граніцы СССР пасьлядоўна і акуратна (Фінляндыя, Эстонія, Латвія, Польшча, Румынія), ня блытаюць нашых заходніх суседзяў з паўднёвымі або ўсходнімі (Турцыя, Манголія), што часта сустракаецца ў іншых групах. Тое-ж самае трэба сказаць і аб ахайнасьці, акуратнасьці і парадку, якія бачым у вучнёўскіх работах гэтай групы; напр., на запытаньне—якія галоўныя гарады ўсіх саюзных савецкіх рэспублік ты ведаеш,—вучні ў большасьці пішуць зусім правільна і чотка:

1) РСФСР—МАСКВА
2) БССР—МЕНСК
3) УССР—ХАРКАЎ
4) ЗСФСР—ТЫФЛІС
5) УЗССР—САМАРКАНД
6) ТуркССР—АШХАБАД
7) ТаджССР—СТАЛІНАБАД.

Так чотка напісаны адказ (да таго-ж, напісана чыста і прыгожа, хаця вучні адразу пісалі начыста) сьведчыць аб значных дасягненьнях як у аўладаньні геаграфічнымі ведамі, так і аб культуры работы. Гэтыя прыклады добрай работы мы ставім, як узор іншым групам, дзе тыя самыя адказы пішуцца ў большасьці без парадку і бесталкова [1]).

III. Аналіз ведаў па розных тэмах

Агульныя вынікі, паказаныя ў табліцы, не даюць дастатковага разуменьня якасьці засваеньня ведаў. Пераходзім да дэталёвага аналізу ведаў вучняў па паасобных пунктах:

Па тэме «Месца СССР на зямным шары» мы далі вучням заданьне напісаць, з якімі капіталістычнымі краінамі наш СССР мяжуецца на захадзе, поўдні і ўсходзе. (Трэба заўважыць, што ў часе адказу вучні ня мелі перад сабой геаграфічнай карты). Яны адказалі больш правільна аб заходніх граніцах. Горш стаіць справа з паўднёвымі і ўсходнімі граніцамі. З 152 вучняў Польшчу адзначылі 143 (94 проц.); аб Румыніі і Латвіі ўжо ведаюць менш—111 вучняў (73 проц.), а Эстонію і Фінляндыю

[1]) Таксама высокія якасныя і колькасныя паказаньні ведаў дае IV група Менскай 39 ФЗС.

лічэ менш—101 вучань (66 проц.). Такім чынам, ад 27 проц. да 34 проц. вучняў ня ведаюць граніц з Румыніяй, Эстоніяй, Латвіяй і Фінляндыяй.

Але справа ня толькі ў тым, што 27—34 проц. ня ведаюць нашых Заходніх граніц,—нават тыя вучні, якія правільна называюць Польшчу, Румынію, Латвію і г. д., адначасова даюць зусім няправільныя адказы. Так, 62 вучні (40 проц. усіх дасьледваных) паставілі замест Латвіі Літву, а па аднэй групе (Менская 39 ФЗС) усе вучні напісалі, што мы мяжуемся з Літвой. Тут відавочна настаўнік сам не разабраўся як належыць у нашых заходніх граніцах і няправільна вучыў сваю групу.

Вялікая колькасьць вучняў уставілі ў лік дзяржаў, якія мяжуюць з намі на захадзе—Францыю, Пэрсію і г. д.; такім чынам, хаця яны і пералічылі частку граніц правільна, але адказ вучняў атрымліваўся часта бяссэнсоўным. Вось некаторыя факты: 6 вучняў паказваюць, як заходнюю граніцу—Францыю, 3 вучні—Германію, 9—Пэрсію, 5—Турцыю, 5—Аўстралію, 3—Чэхаславакію, 3—Азію, 4—Зах. Эўропу, 4—Зах. Азію, 2—Амэрыку, 2—Афрыку і г. д. Такіх адказаў на 152 вучні мы налічылі цэлых 55 (у 40 вучняў), г. зн. 26 проц. усіх вучняў даюць сапраўды блытаныя адказы. Гэта сьведчыць аб недастатковай рабоце над картай, аб слабай самастойнай рабоце па данаму прадмету. Адным толькі нагляданьнем насьценнай карты без самастойнага практыкаваньня вучні ня змогуць засвоіць гэтых ведаў. Асабліва дрэнна стаяць веды па данным пытаньні ў Заслаўскай ШКМ; з 31 вучняў толькі Польшчу—засвоілі ўсе; Румынію ведаюць толькі 6 вучняў. Эстонію—5, Фінляндыю—7, Латвію—25; замест гэтага вучні часта мяжуюць СССР з Францыяй, Германіяй, Чэха-Славакіяй і г. д.

Вось адзін з многалікіх прыкладаў: «На захадзе мы гранічым з Польшчай, Літвой, Эстоніяй, Германіяй, Італіяй і г. д.». Часта вучні асацыіруюць Польшчу з Францыяй, таму што чулі аб тым, што Польшча разам з Францыяй рыхтуюць інтэрвэнцыю на наш Саюз... Тым больш трэба было-б на занятках па геаграфіі ўнесьці чоткасьць у рабоце.

Наступны недахоп, які мы адзначаем па данаму пункту—гэта адсутнасьць сыстэматычнасьці і парадку ў ведах. Вучні бяз усякай сыстэмы пералічваюць назвы капіталістычных краін, напр.: «Фінляндыя, Эстонія, Румынія, Латвія, Польшча». Здаецца ўсё правільна, але назвы дадзены бяз усякага парадку—зусім мэханічна пералічаны. Вучні кіруюцца зрокавай памяцьцю, якой трэба карыстацца ў геаграфіі, асабліва пры рабоце над картай. Яны проста завучвалі мэханічна і таксама мэханічна пісалі адказ. Такі адказ тыповы для шмат вучняў, дае паменшаную вартасьць, хаця-б вучні і пералічылі поўнасьцю ўсе межы. Ён паказвае недахоп работы па геаграфіі: перавагу мэханічнага завучваньня над работай з картай. У геаграфіі мы павінны прывучыць дзяцей арыентавацца па карце пры ўсякіх магчымых момантах: ўсё, што вучні праходзяць, яны павінны замацаваць з дапамогаю

карты. Гэта мае месца ня толькі на лекцыях геаграфіі, але і іншых дысцыплін. Калі вучні сустракаюцца з якой-небудзь назвай мясцовасьці—трэба прышчапіць ім звычку знаходзіць яе на карце. Такая звычка—гэта сапраўдная культура работы па геаграфіі.

Тое-ж самае ў большай ступені мы бачым пры пералічэньні меж па поўдні і ўсходзе СССР. Калі заходнія граніцы вучні лепш памятаюць, (таму, што Польшча недалёка ад нас, што яшчэ ў 3-й групе яны вучылі аб мяжы з Польшчай і Латвіяй)—то з Турцыяй, Пэрсыяй, Аўганістанам, Манголіяй, Кітаем вучні менш знаёмы. Тут веды выключна залежаць ад мэтаду работы ў групе. Па гэтаму пункту маем горшыя паказчыкі, чым было паказана раней: з 152 вучняў аб Турцыі, Пэрсіі і Кітаі пішуць толькі 80, 87, 88 вучняў (53 проц., 58 проц.), аб Аўганістане і Манголіі толькі 60, 70 вучняў (40—46 проц.); палова ўсіх вучняў ня ведае аб гэтых межах, альбо ведае зусім туманна, збочліва, мае якіясьці ласкуткі ведаў. Такія веды ніякім чынам ня могуць нас здаволіць. Калі-б з агульнай колькасьці выключыць вучняў 2-й групы, якія наогул адказалі добра (Менская 25 ФЗС—IV і Менская 39—IV), то тады карціна будзе яшчэ горшай: з 93 вучняў толькі 36—40 (24—26 проц.) ведаюць аб Турцыі і Пэрсіі і толькі 20—26 в. (13—17 проц.) ведаюць аб Аўганістане і Манголіі (большая частка вучняў ня ведае гэтых меж). У гэтай колькасьці вучняў яшчэ знаходзіцца частка, якая хаця ў асноўным пералічыла ўсё краіны, але не ў геаграфічным парадку. Такім чынам, проц. вучняў з няпоўнымі ласкутачнымі ведамі акажыцца яшчэ большым. Прыводзім прыклады вучнёўскіх адказаў:

«СССР граічыць на далёкім усходзе—з Кітайшчынай, а на поўдні—з Амэрыкай.

«З Індыйскім акіянам, Турцыяй; на ўсходзе—Далёкі ўсход».

«На поўдні з Турцыяй, Пэрсіяй, Манголіяй, Манчжурыяй, а з далёкім усходам—Афганістан».

«На ўсходзе—з Японіяй, на доўгім далёкім усходзе з Пэрсыяй».

«Кітай, Карэя, Аўстралія» і г. д.

Гэтыя вынікі зьяўляюцца яскравымі прыкладамі, наколькі вялікая яшчэ блытаніна ў вучняў, пераходзячая ў некаторых у сумбур, наколькі слабая была самастойная і сыстэматычная прапрацоўка вучнямі прадмету. Настаўнік павінен у гэтым напрамку ўпарта праводзіць дырэктывы ЦК аб школе. Нам трэба рашучым чынам змагацца за дакладныя і канкрэтныя веды па геаграфіі.

* * *

Крыху іншую карціну мы маем пры аналізе ведаў вучняў па тэмах: «Асноўныя прамысловыя раёны», «Асноўныя сельскагаспадарчыя раёны СССР». Паміж іншым, мы задалі вучням наступныя запытаньні: а) назаві галоўныя раёны, дзе здабываецца вугаль,

б) дзе здабываюць жалезную руду і в) дзе здабываюць нафту. Перш за ўсё трэба адзначыць няяснасьць і нячоткасьць праграмы па гэтаму разьдзелу. Праграма не паказвае, якія канкрэтна веды павінны атрымаць вучні, якія раёны трэба добра ведаць, а якія можна і не праходзіць. Частка настаўнікаў заграмаджаюць вучняў лішнімі ведамі, геаграфічнымі тэрмінамі, якія вучням IV гр. не патрэбны. У выніку гэтага атрымоўваецца, што вучні апэруюць вялікай колькасьцю назваў, якія пішуць часта бяз усякага парадку.

Па-другое, настаўнік недастаткова падкрэсьлівае значэньне і важнасьць для нашай народнай гаспадаркі таго або іншага раёну. Вучні не адзначаюць паасобныя раёны па сваім значэньні, але пішуць мэханічна, што раней прыдзе ў галаву. Вось як яны адказваюць:

«Галоўныя раёны, дзе здабываюць вугаль, напрыклад Крывы-рог, на Урале, на Сібіры, Кузьнецкбасэйн, Данецкі басэйн і Падмаскоўны раён». У гэтым адказе пералічаны галоўныя вугальныя раёны (Данбас, Кузбас, Падмаскоўны), але яны пастаўлены на апошнім месцы. Урал, напрыклад,—па думцы данага вучня, мае большае значэньне ў здабываньні вуглю, чым Данбас. Далей, у дадзеным выпадку вучні блытаюць раёны, дзе здабываюць вугаль—з раёнамі, дзе здабываюць руду або нафту:

«Вугаль здабываецца ў Баку, Кузьнецкім басэйне, Падмаскоўным раёне, на Урале, у Крывым Розе»;

або: «у Данбасе, Кузбасе, Ленінградзе, Чэрэмхаўскім раёне, і ў Кузьнецку, раёне Манчжурыі, Украйне».

Бачым шмат назваў; але няма тут самага галоўнага: ня выпуклены галоўныя раёны; няма, так сказаць, хрыбта ў ведах. Заўважаем адно цікавае зьявішча: вучні не разумеюць, што азначае такое слова, як Кузбас. Яны разумеюць Кузбас і Кузьнецк як 2 паасобныя месцы. Тое-ж самае паўтараецца шмат разоў з Донбасам: вучні поруч з Данбасам пішуць Данецкі басэйн. Далей, вучні не арыентыруюцца, што Кузбас знаходзіцца ў Зах. Сібіры. Адначасова з Кузбасам яны пішуць: «у Сібіры»; аднначасова з Данбасам пішуць—«на Украіне». Трэба зазначыць, што прыведзеныя прыклады зьяўляюцца не адзінымі, але паўтараюцца шмат разоў. Тыя-ж самыя факты выяўляюцца і ў адказах аб раёнах здабычы палезнай руды і нафты:

«Руду здабываюць на Каўказе, Крыму, Сібіры, на Урале».

«Руду здабываюць у Кузьнецкім басэйне, пад Масквой, Сібіры, Урале, у Крывым Розе».

«Руду здабываюць у Данбасе, Кузьнецку, Дан. басэйне».

«Руду здабываюць на Урале, Данбасе, Кузбасе».

«Нафту здабываюць у Баку, Данбасе, Грозным, Байкале, Батуме».

«Нафту здабываюць у Баку, Грозным, Батуме, Маскве, Ніжнім, Кузьнецку і Ленінградзе».

Усе прыведзеныя факты яскрава паказваюць асноўныя недахопы работы па геаграфіі:

1) Веды не сыстэматызаваны. У ведах вучняў няма чоткага разьмежаваньня паміж раёнамі, здабываючымі вугаль, руду і нафту. Вучні ня ўмеюць разьмеркаваць назвы раёнаў у акрэсьленым сыстэматычным парадку, а менавіта: па вуглі—Донбас, Кузбас, Падмаскоўе і Караганда; па рудзе—Крываког і Урал; па нафце—Баку, Грозны, Майкай, Эмба, Урал.

2) Веды не лёкалізаваны, г. зн. вучні канкрэтна не арыентыруюцца, дзе знаходзяцца гэтыя раёны; яны слаба разьбіраюцца па карце: Крынары—гэта дзесьці на Украіне, але дакладна паказаць дзе—ня могуць: блытаюць з Донбасам. Кузбас вісіць дзесьці ў паветры; замест «Падмаскоўны раён» пішуць «у Маскве» і г. д. Відаць, што недастаткова працавалі з картай, што ўсё гэта яны помняць толькі на чутках.

Характэрны дадатковы прыклад такой блытаніны мы маем у адказах на запытаньне аб раёнах здабычы нафты. Вучні часта паказваюць раёны здабычы нафты:

«Нафта здабываецца ў Баку, Батуме, Грозным, Туапсэ, на Урале, Маскоўскім, у Маскве».

Дзякуючы нафтаправодам Баку—Батум і Грозны—Туапсэ вучні лічылі—Батум, Туапсэ, як раёны здабычы нафты. Для поўнай характарыстыкі таго, аб чым мы гаварылі, прывядзем некаторыя дадзеныя, якія атрымалі пры падлічэньні ўсіх правільных і няправільных адказаў па вышэй адзначаных запытаньнях. Аказваецца, што на пытаньне аб рудзе вучні слаба ведаюць Крывырог: з агульнай колькасьці па 129 вучняў толькі 45 (35 проц.) адказалі—Крываког, у той час калі Урал паказала 106 вучняў; гэта значыць, што вучні слаба ведаюць раён здабычы руды, які і на сёнешні дзень грае галоўнейшую ролю, хаця на Урале штодзень павялічваецца здабыча руды. Разам з гэтым вучні даюць цэлы рад зусім няправільных адказаў: 55—Каўказ (43 проц.), 40—Сібір (31 проц.), 40—Донбас і Кузбас (31 проц.) і г. д. Вынік: Крывы рог у адказах вучняў нічым не адзначаецца па здабычы руды ад Каўказу, Сібіры, Донбасу і Кузбасу.

Падобная карціна атрымоўваецца пры падлічэньні адказаў па раёнах здабычы нафты, вугля і інш.

Мы больш затрымаліся па гэтых пытаньнях таму, што яны ўскрываюць тыповыя недахопы работы па геаграфіі ў 4-х групах, а таксама недакладнасьць нашых праграм. Праграмы 1932 году па геаграфіі пайшлі па шляху ўдакладненьня ведаў, якія павінны быць засвоены вучнямі ў 4-х групах. Цяпер мы павінны яшчэ больш удакладніць і ўдасканаліць нашыя праграмы, каб зьліквідаваць канчаткова тыя недахопы, аб якіх мы гаварылі.

Тыя-ж самыя зьявішчы мы бачым у адказах на запытаньні: 1) у якім раёне знаходзіцца Волхаўская гідраэлектрастанцыя і 2) Якія раёны абслугоўваюць Шатурская і Кашырская элек-

трастанцыі. Вялікая частка вучняў, аказваецца, не арыентыруецца, дзе знаходзяцца гэтыя станцыі. Апрача цэлага раду недакладных адказаў, як напрыклад: «Волхаўская станцыя знаходзіцца ў Ленінградзе» (замест у Ленінградзкай вобласьці), альбо: «Шатура знаходзіцца ў Маскве» (замест Маскоўскай вобласьці),—мы маем шмат проста няправільных і нават бяссэнсоўных адказаў:

«Шатурская і Кашырская асьвятляюць горад Баку».

«Шатурская на Урале на Донбасе».

«Шатурская абслугоўвае Маскву, Сталінград».

«Шатурская абслугоўвае Шатурскую вобласьць, Кашырская абслугоўвае Кашырскую вобласьць».

«Волхаўская станцыя знаходзіцца на рацэ Волзе, на Урале». «Волхаўская станцыя знаходзіцца ў Воршы, на Дняпры» і г. д.

З якой лёгкасьцю дзеці зьвязваюць паміж сабой далёкія раёны і як проста выходзіць у іх: Шатура абслугоўвае Урал і Донбас, або Маскву і Сталінград. Аб гэтых станцыях вучні, зразумела, чулі, але гэтыя веды не замацаваны: па-першае, вучні ня ведаюць, дзе гэтыя станцыі знаходзяцца, ня умеюць іх знаходзіць па карце; па-другое—вучні ня маюць прадстаўленьня, што такое электрастанцыя і якое значэньне яна мае; з тых некалькіх слоў настаўніка аб электрастанцыях вучні яшчэ ня выпрацавалі сабе сапраўдных уяўленьняў аб гэтых вялікіх пабудовах; гэта тлумачыцца, паміж іншым, тым,—што пры праходжаньні геаграфічнага матар'ялу, асабліва ў IV групе, не карыстаюцца літаратурным матар'ялам для выпрацоўкі лепшых прадстаўленьняў аб прадмеце. Пазьней мы яшчэ зьвернемся да гэтага моманту, а цяпер пакуль што падкрэсьлім, што прыведзеныя адказы сьведчаць аб мэханічным завучваньні назваў, якія ў большай колькасьці дзяцей не зьвязаны з канкрэтнымі прадстаўленьнямі. Мы павінны весьці барацьбу з гэтым зьявішчам, асабліва ў малодшых групах. Кожная геаграфічная назва павінна быць зьвязана з акрэсьленым месцам, якое вучань бачыць на геаграфічнай карце, і зьвязана з акрэсьленым зьместам і значэньнем данага аб'екту.

Каб завастрыць увагу настаўніка на гэты момант, прыводзім цікавыя прыклады па іншых тэмах. На запытаньні,—якое значэньне мае Турксіб для народнай гаспадаркі Сярэдняй Азіі і Сібіры,—адказалі больш-менш правільна ўсе вучні (аб Турксібе ведаюць усе дзеці), але зьмест раду адказаў вымушае нас падумаць аб тых прадстаўленьнях, якія вучні маюць: «Турксіб мае значэньне, з Турксіба вывозяць вугаль, а з Сібіру—хлапок»; «з Турксібу перавозяць бавоўну, а ад Украіны перавозяць у Турксіб хлеб». Вучні, як бачым, забылі, што Турксіб гэта Туркестана-Сібірская чыгунка, якая знаходзіцца далёка ад Украіны; вучні проста прымаюць Турксіб, як назву гораду, або якой-небудзь краіны, «адкуль вязуць бавоўну або вугаль». Мы павінны зжыць такое мэханічнае засваеньне ведаў ў школе.

Ёсьць моманты, якія не пад сілу да зразуменьня вучня IV-й групы: на запытаньне,—якую сілу мае Днепрагідрастанцыя,—

вучні даюць самыя абсурдныя адказы: «100 кв. гадзін, $1^{1}/_{4}$ міл. кв. г., міліард кв. у гадзіну, 24 кв. міліёны, $1^{1}/_{4}$ кв. км, 1000 кілёмэтраў, 100 конскіх сіл, 3339 к. сіл» і г. д. З 120 вучняў толькі адзін адказаў правільна—800.000 к. сіл. Гэта сьведчыць, што маем справу з занадта цяжкім прадстаўленьнем для дзяцей данага ўзросту. Хаця ў праграме вытворчага навучаньня IV-й групы і даецца вучням паняцьце—кілёват і кілёватгадзіна, аднак вучні яго не разумеюць і ніхто не прадстаўляе сабе сілы Дняпрадрэсу. Замест гэтага,—зьбіўчывыя лікі, якія ня маюць ніякай вартасьці для замацаваньня ведаў па электрыфікацыі СССР.

Нарэшце, яшчэ факт: мы задалі запытаньне—пералічыць галоўныя сац. гарады, якія цяпер будуем. На гэта вучні адказалі таксама бяссыстэмным способам; больш таго, вучні не разумеюць добра, што такое сац. горад і блытаюць з будовай наогул.

Даем табліцу ўсіх адказаў на памянёнае запытаньне:

Магнітагорск . . .	80 адказ.	Хібінагорск . . .	7 адказ.
Сталінград	39 „	Бобрыкі	9 „
Кузьнецк	26 „	Бабруйск	5 „
Кузбас	21 „	Бірабіджан	4 „
Дамбас	20 „	Ніжні Ноўгарад . . .	1 „
Урал	10 „	Саратаў	1 „
па рэчцы Дняпро . . .	21 „	Турксіб	1 „
Дняпрапятроўск . . .	12 „	Мурманск	1 „
		Краснадарск	1 адказ.

Праграма па данаму пункту вызначае засваеньне 4-х сацгарадоў: Магнітагорску, Кузьнецку, Бобрыкаў, Хібінагорску.

Табліца паказвае, што з 120 вучняў 80 ведае аб Магнітагорску, 26—аб Кузьнецку, 9 аб Бобрыках і 7 аб Хібінагорску. Заместа гэтага, вучні прыводзяць шмат іншых гарадоў і нават вобласьцяй. Табліца яскрава паказвае, што вучні ня маюць канкрэтнага прадстаўленьня аб сац. гарадох, што яны проста чулі ад настаўніка некалькі імён і мэханічна стараліся іх засвоіць; пазьней аднак вучні забылі іх і зблыталі з цэлым радам гарадоў наогул і нават іншых геаграфічных назваў.

Раней мы ўжо прыводзілі палажэньне, што няяснасьць праграмы прыводзіць да слабых вынікаў па лініі замацаваньня ведаў. Цяпер мы пацьвердзім гэтае палажэньне новымі фактамі. Праграма ў разьдзеле «Асноўныя сельскагаспадарчыя раёны СССР» вызначае:

«3. Сельскагаспадарчая культура (лён, каноплі, бавоўна, тытун, бульба, сланечнік, цукровыя буракі)».

«5. Рыбалоўства па буйных вазёрах і берагох мораў» [1]).

Як бачым, у праграме няма канкрэтнага зьместу, ня выпуклены

1) Праграмы НКА БССР для 1-4 груп, стар. 83. 32 (М-25-IV-6 5).

галоўныя моманты, якія характарызуюць паўднёвыя і сельскагаспадарчыя раёны (пшаніца—галоўная збожжавая культура, цукровы бурак, сланечнік—галоўныя тэхнічныя культуры). Такім чынам, настаўнік часта выкладаў наогул аб гэтых раёнах; атрымалася расплыўчатасьць, бясхрыбетнасьць, бяссыстэмнасьць у ведах вучняў. Падаем адказы вучняў па данаму пункту. На запытаньне—якая галоўная збожжавая культура расьце ў паўднёвых сельскагаспадарчых раёнах,—вучні пішуць: «Жыта, ячмень, проса, пшаніца», або—«авёс, пшаніца, лён, бавоўна, ячмень». Атрымоўваецца амаль што той самы сельскагаспадарчы профіль, што і ў БССР.

На прыведзенае запытаньне мы павінны былі мець адзін адказ—пшаніца. Фактычна аб пшаніцы ведаюць і пішуць амаль што ўсе вучні (85,2 проц.—93,7 проц.), але тлумачыцца гэта зусім проста: вучні пералічваюць рад збожжавых культур і, зразумела, пішуць таксама аб пшаніцы. Такіх-жа вучняў, якія-б падкрэсьлілі іменна пшаніцу і назвалі яе характэрнай збожжавай культурай для даных раёнаў—мала. Такім чынам, расплыўчатасьць праграм прывяла да, так сказаць, бясхрыбетнасьці ў ведах вучняў. Мы ня бачым у вучняў той чоткасьці ў самых элемэнтарных ведах, якія павінны даць праграма і дакладна акрэсьленым колам ведаў пры правільнай пастаноўцы мэтадаў работы.

Тое-ж самае атрымоўваецца і па пункту аб рыбалоўстве: настаўнік ня ведае, аб якіх галоўных месцах рыбнай лоўлі ў СССР трэба выкладаць—праграма аб гэтым не гаворыць. Таму—адказ вучняў па даным пытаньні—у якіх раёнах і морах ловім шмат рыбы—мае поўны разнабой: частка вучняў піша аб Волзе і Касьпійскім моры,—але ня ведае Дону, Азоўскага мора, Мурманску; іншыя пішуць аб Ахоцкім моры і забываюць Касьпійскае і Мурманск; некаторыя-ж ведаюць чамусьці толькі рэкі Дзясну і Паўночны Буг (замест Паўднёвы Буг); усе іншыя раёны адышлі на задні плян.

Зразумела, мы далёка ад тэй думкі, што толькі праграмы і іх пабудова ёсьць адзіная прычына такой безлабернасьці ў ведах вучняў. Прычына крыецца яшчэ ў арганізацыі, мэтадах работы і іншых умовах дзейнасьці школы; але-ж праграмы ў гэтых адносінах адыгрываюць не апошнюю скрыпку.

* * *

Да гэтага часу мы прыводзім факты геаграфічных ведаў, так сказаць, канстатуючага парадку. Вучні павінны былі ўспомніць тыя або іншыя геаграфічныя факты і іх запісаць, як-та: пералічыць межы СССР; напісаць, якія культуры растуць у асноўных сельскагаспадарчых раёнах; дзе здабываецца нафта, руда, вугаль і інш. Усе гэтыя адказы сьведчаць аб аб'ёме фактычнага матар'ялу, які вучні набылі. Але нас цікавіць яшчэ рад момантаў, —гэта, як вучні навучыліся зьвязваць геаграфічныя факты

з іншымі фактамі, як вучні навучыліся паясьняць тыя або іншыя геаграфічныя зьявы.

Мы не абмяжоўваемся выкладаньнем нават у малодшых групах толькі фактаў. Мы прывучаем дзяцей на пасільных задачах вырашаць тыя або іншыя прычынныя сувязі геаграфічных фактаў, прывучаем дзяцей падкрэсьліваць важнасьць якога-небудзь факту ў радзе іншых зьяў. Гэта павінна забясьпечыць сьвядомае успрыняцьце вучнямі геаграфічнага матар'ялу.

У сувязі з пералічэньнем галоўных гігантаў—заводаў сельскагаспадарчых машын, мы задалі пытаньне: «Чаму Ростсельмаш, Сталніградзкі Трактарны завод, Новасібірскі завод камбайнаў і інш. пабудаваны іменна ў гэтых раёнах?» Зразумела, дзеці ня могуць засвоіць усіх прычын разьмеркаваньня гэтых заводаў па паказаных мясцох. Мы дамагаліся ад вучняў IV-й групы элемэнтарнага паясьненьня, што сельскагаспадарчыя раёны патрабуюць шмат сельскагаспадарчых машын, а таму заводы будуюцца бліжэй да месца збыту гатовых машын. Цікава, якія адказы даюць вучні?

— «У гэтых раёнах пабудаваны заводы трактарныя, камбайнаў, аўтобусныя, плугавыя і г. д.»

Вучань ня здолеў ускрыць прычыну: прыступаючы да адказу, да высьвятленьня прычыны, ён паўтарае канстатуючую частку адказу і абмяжоўваецца гэтым.

Або адказ:

«Таму пабудаваны машыны».

Тут вучань ня сумеў дакончыць сваёй думкі. Відаць, што ёсьць некаторая думка аб неабходнасьці даных машын для сельскагаспадарчых раёнаў, але вучань ня змог аформіць гэтай думкі.

«Таму гэтыя заводы там, што-б бліжэй да сельскагаспадарчых раёнаў».

Або: «Таму, што добра разьвіваецца сельская гаспадарка».

Або: «Заводы пабудаваны таму, што калі-б ня было заводаў, то ў нас ня было-б чым апрацоўваць палі». «Таму што там добрая глеба».

Так пішуць амаль усе вучні, яны ня ўмеюць паясьняць данага зьявішча, нават не хапае ў запасе слоў для выражэньня больш-менш правільнай думкі. Трэба дабавіць, што з усіх абсьледаваных вучняў толькі 44 проц. адказалі на гэтае запытаньне; апошнія зусім ня справіліся з гэтай задачай.

Возьмем наступнае запытаньне,—чаму ў пералічаных раёнах—ЦЧО, Паўночным Каўказе, УССР, Паваложжы—добра разьвіваецца земляробства? У праграме на гэты момант зварачаецца ўвага; праграма патрабуе, каб вучні ведалі аб «умовах, спрыяючых заняцьцю земляробства»; але гэты пункт не расшыфраваны. Трэба было канкрэтна паказаць, аб якіх умовах настаўніку трэба растлумачыць дзецям. Мы патрабавалі ад вучняў тры ад-

казы: 1) таму, што глеба чарназёмная, добрая; 2) цёплае лета—шмат сонца; 3) стэп роўны, лёгкі да апрацоўкі.

Дзеці выявілі па гэтаму пункту 36—40 проц. ведаў. Большасьць вучняў ведае толькі аб аднэй прычыне—чарназёмнай глебе; часта яны проста пішуць: «добрая глеба». Аб апошніх момантах альбо зусім ня ведаюць, або маюць некаторае няяснае прадстаўленьне: «Там добра разьвіваецца земляробства, што раней былі стэпы, а цяпер чарназёмная зямля», «там глеба чарназёмная і спрыяе клімат»; альбо—«чарназёмная глеба і лесастэп».

У IV групе 25-й Менскай узорнай ФЗС гэтае пытаньне, як відаць, было лепш асьветлена; там досыць значны процант вучняў ужо не здавальняецца адным толькі тлумачэньнем глебай. Яны пішуць: «чарназёмная глеба і цёплы клімат, або—«чарназёмная глеба цёплае паветра», або—«чарназёмная глеба і што там стэпы». У гэтай групе з 32 вучняў—15 далі больш дакладны адказ. Аднак-жа, няма ніводнага вучня, які-б у сваім адказе пералічыў усе тры моманты, хоць яны павінны быць зразумелымі для вучняў і «лёгкімі для засваеньня».

Нарэшце прыводзім трэці прыклад: чаму ў горнай мясцовасьці трудна весьці земляробства?—Вучні таксама ня справіліся з поўным адказам: усяго 13,—33 проц. правільных адказаў. Вучні павінны былі-б прывесьці хаця-б два моманты: 1) зямля ў горах камяністая, 2) паверхня ня роўная. Вучні прыводзяць то адзін з гэтых фактаў, то другі, і больш паловы вучняў зусім ня ведае, або дае зусім неясны адказ:—«Трудна весьці земляробства ў горах, бо блізка к сонцу і там вельмі студзёна і ня можа быць ураджай», або «на горах трудна весьці земляробства, бо там няма чарназёму». Іншая група вучняў тлумачыць тым, што «на горах засуха», або—«холадна і іншы раз суш». Некаторыя паясьняюць, што яны разумеюць пад засухай: «бо калі будзе дождж, то ён не застанецца на гары, каб яе стачыць ён скідаецца на ніз»—Вучань хоча тут сказаць, што ў глебе і пад глебай не застаецца вады, а таму можа здарыцца засуха.

У IV групе 25-й Менскай ФЗС большасьць вучняў адказала: «земляробства трудна весьці на горах, што калі пойдзе дождж—змые ўсе пасевы». Зусім канкрэтна, але-ж ня поўнае тлумачэньне.

Такім чынам, мы бачым, што большасьць вучняў ня можа справіцца з такімі запытаньнямі тлумачальнага парадку. Запытаньні канстатуючыя даюць лепшыя вынікі, чым запытаньні тлумачальнага парадку; у тэй самай (25-й—IV-а групе) на пытаньне: «якія сельскагаспадарчыя раёны ты ведаеш»?—вучні пералічваюць больш-менш добра ад 54 да 80 проц. усіх дасьледаваных вучняў, а прыведзеныя прыклады тлумачальных запытаньняў далі ўсяго толькі 13, 29, 33 і максімум 48 проц.

Ці можна гэтае зьявішча тлумачыць выключна псыхолёгічнымі момантамі (што вучням лягчэй запамятаць фактычны матэр'ял, чым вылічыць прычыны)?

Зразумела—не. Справа тлумачыцца, па-першае, тым, што ў праграмах, як мы ўжо гаварылі, няма дэталёвых паказаньняў, як трэба выкладаць. Фактычны матар'ял паказан у праграмах больш дэталёва, чым моманты тлумачальнага парадку. Так аб асноўных сельскагаспадарчых раёнах сказана ў праграмах чотка, што трэба ведаць аб ЦЧО, Украіне, Паўночным Каўказе і г. д.; але там, дзе гаворыцца аб прычыннай сувязі,—такіх пытаньняў няма. Адсюль ясна, што настаўнік проста ня ведае, што ён павінен выкладаць. У выніку атрымоўваецца некаторага роду самацёк. Па-другое, для высьвеньня прычыны вучням—трэба настаўніку прымяніць больш актыўныя мэтады, трэба дасканальна прадумаць гутарку ў клясе, трэба падрыхтаваць чытальны матар'ял, а гэтага дабіцца трудней настаўніку, чым перадаваньне вучням толькі раду фактаў. Адсюль вучоба атрымоўваецца няцікавай, сухой, адцягнутай, у той час, калі такая дысцыпліна, як геаграфія, павінна зацікавіць вучняў, павінна пабуджаць і ўздымаць іх інтарэсы да літаратуры, да экскурсіі, да падарожжаў... На гэты бок трэба зьвярнуць увагу настаўніцтва і мэтадыстаў.

* * *

Сувязь паміж паасобнымі геаграфічнымі зьявамі можна ўстанавіць шляхам выпрацоўкі ў вучняў поўнага прадстаўленьня аб краі. Цэльнае прадстаўленьне аб ляндшафце дае дзецям правільнае ўразуменьне паасобных дэталяй. Для прыкладу возьмем прадстаўленьне вучняў аб тундры і Сярэдняй Азіі. Мы па гэтых тэмах далі рад запытаньняў для высьвятленьня, як вучні сабе прадстаўляюць далёкія ад нас краіны. Для добрага ўразуменьня настаўнік павінен карыстацца жывымі расказамі, мастацкімі апавяданьнямі і разборам розных карцін, кіно-фільмаў і г. д.

Трэба сказаць, што на практыцы мала карыстаюцца гэтым мэтадам і таму атрымоўваем дрэнныя вынікі. Дзеці часта маюць ілжывыя прадстаўленьні аб гарачых і халодных краінах, пераносяць элемэнты нашага ляндшафту ў паняцьце далёкіх краін. У Менскай 39-й ФЗС, у IV групе вучні, відавочна, прапрацавалі тэму «Тундра» больш-менш правільным шляхам, таму яны досыць правільна апісваюць тундру ў адказ на нашы запытаньні. Вось прыкладныя адказы:

«У тундры дрэнная расьліннасьць таму, што там мёрзлая зямля. Клімат халодны. Лета амаль што ня бывае, а калі бывае, дык на тыдняў восем. Але-ж выжыць у тундры можна таму, што, калі пойдзе многа сьнегу, дык ён разрывае нагамі сьнег і дастае там мох, ягель, нізкарослую бярозку (!), брусьніку, кару». «Насельніцтва займаецца ў тундры аленяводзтвам, ахотай на пясцоў».

Такіх прыкладаў у гэтай групе шмат, яны сьведчаць аб канкрэтных прадстаўленьнях, якія дзеці набылі. Мы тут ня бачым грубых памылак (апрача некаторых недакладнасьцяй). Але ў

многіх групах мы маем адказы, якія сьведчаць аб няправільных, або бедных прадстаўленьнях:

«У тундры зімой марозы бальшыя, дык вымярзае, а летам дужа сонца паліць дык выгарыць усё ад сонца».

«Бедная расьліннасьць таму, што там мох». «Таму што там мала ўгнаеньня». «Таму, што там холадна і дрэнная зямля». «Глеба тундравая, халодная», «там вечны сьнег».

Тут мы зноў бачым няўменьне растлумачыць прычыны, або вынік прымаць за прычыны (расьліннасьць бедная таму, што там мох), або тлумачыць агульнымі словамі («дрэнная зямля»), або даюць павялічальныя моманты («вечны сьнег» і г. д.).

У сувязі з гэтым дзеці даюць няправільныя і ілжывыя тлумачэньні на запытаньне,—чым займаецца насельніцтва ў тундры? Вось адказы:

— «Паляваньнем, рыбалоўствам і лесам», «аленяводзтвам, хлебаробствам», «земляробствам, аленяводзтвам, сплаўкай лесу»; «займаецца земляробствам».

Усе гэтыя адказы сьведчаць аб няправільным уразуменьні пытаньня пра ляндшафты і занядкі ў краі. Калі ў тундры бедная расьліннасьць і нічога не расьце апрача моху і нізкарослых кустоў—як-жа могуць займацца лесасплавам або земляробствам? Мы бачым у вучняў некаторае імкненьне перанесьці моманты нашага ляндшафту на тундру. Гэта мае месца выключна таму, што дзеці не атрымоўваюць канкрэтных прадстаўленьняў краявіду тундры. Настаўнік часта абмяжоўваецца сухім паясьненьнем, не выкарыстоўвае багатай літаратуры геаграфічных апавяданьняў, карцін і іншых момантаў для выпрацоўкі панятцяў і замацаваньня ведаў. Пры правільным разуменьні тундры вучні задумаліся-б над тымі супярэчнасьцямі, якія яны паказваюць у сваіх адказах.

Падобныя прыклады мы маем і па іншай тэме «Сярэдняя Азія». Вучні адказваюць на запытаньні аб тэхнічнай культуры: «Тэхнічная культура расьце ў Сярэдняй Азіі, такая: лён, бавоўна і г. д.»; або: «Тэхнічная культура расьце больш у Сярэдняй Азіі, такая: лён, хлапок, каноплі».

Аб ляндшафце Сярэдняй Азіі вучні пішуць, што «большая частка занята лесам», «большая частка занята земляробствам»; нарэшце: «большая частка занята лесам і стэпам». Нельга на сёнешні дзень лічыць, што большасьць тэрыторыі Сярэдняй Азіі занята земляробствам; бяссэнсоўна сказаць, што Сярэдняя Азія занята лесам. Такія адказы могуць атрымацца толькі дзякуючы слабым прадстаўленьні аб Казакстанскіх і Туркэстанскіх стэпах і пустынях, аб аазісах, аб жывёлагадоўлі і разьвядзеньні бавоўны. Трэба выпрацаваць у вучняў IV групы звычкі даваць у адказе самае галоўнае, самую сутнасьць. У тундры гэтым зьяўляецца аленяводства, паляваньне. У Сярэдняй Азіі аб ніякім лясным промысьле вучні не павінны гаварыць. Бо вучні IV групы не павінны ведаць падрабязна аб СССР. Яны павінны ве-

даць самае галоўнае, што характарызуе даны край. Вучань павінен ведаць гэткія стрыжнёвыя паняцьці, якія ён добра засвоіць і якія будуць служыць моцнай базай для далейшага больш падрабязнага вывучэньня СССР у старэйшых групах; але для гэтага трэба ўмела замацаваць у дзяцей такія асноўныя паняцьці, выкарыстоўваючы ўсякія актыўныя мэтады. Прыведзеныя факты гавораць, што ў гэтым напрамку шмат чаго яшчэ настаўнікамі не выкарыстоўваецца. Асабліва мала карыстаюцца мастацкай літаратурай, каб замацаваць правільныя прадстаўленьні вучняў аб розных частках СССР—аб ляндшафтах і занятках насельніцтва.

Прыводзім яшчэ адзін цікавы факт па лініі сац. будаўніцтва ў нашай краіне. Зразумела, што ўвесь курс геаграфіі ў IV групе прасякнуты момантамі сац. будаўніцтва. І так яно павінна быць. Але тут мы маем выпадкі, дзе настаўнікі, так сказаць, перабаршчылі. На запытаньне—што савецкая ўлада робіць для разьвіцьця паўночных народаў,—мы атрымалі рад такіх адказаў:

«У тундры адчынілі універсытэт, будуюць школы, тэхнікумы, прафшколы», «Арганізуюць клюбы, бібліятэкі, школы, кухні, калгасы і саўгасы»..., «будуе фабрыкі і заводы», «разьвівае сельскую гаспадарку і будуюць школы», «строіць для паўночных заводаў фабрыкі і заводы», «арганізуе там культбазы, універсытэт і наогул навучальныя ўстановы».

Аб чым гавораць гэтыя адказы?

Аб тым, што вучні выпрацоўваюць яшчэ ня зусім правільныя прадстаўленьні аб сучаснай тундры, што ўсё вышэйпералічанае нашай рэчаіснасьці, напрыклад, у Хібінагорскай тундры—гэта правільна, але нельга ўсё-ж такі ўтвараць у дзяцей такое ўражаньне, што ўся тундра ўжо заваявана намі, што там поўна фабрык і заводаў, электрастанцый, універсытэтаў, тэхнікумаў і г. д. Вучні зусім бесцырымонна перанесьлі будаўніцтва БССР ва ўмовы тундры.

Аўтару гэтых радкоў прышлося сядзець на аднэй такой лекцыі аб тундры, дзе настаўнік нарысаваў такую грандыёзную карціну будаўніцтва ў тундры—з шасэйнымі дарогамі, электрычным асьвятленьнем і г. д.,—аказалася, што тундра перастала быць ужо тундрай. Настаўнік павінен прытрымлівацца рэальных рамак; ня трэба фантазаваць, выдумліваць і прэўвялічваць памеры сац. будаўніцтва ў тундры. Наша будаўніцтва і так вялізарна, і ў часьці тундры і ва ўсім СССР, што можна захапіць дзіцёнка, ня ўжываючы такіх гіпербол і фантазій.

IV. Агульныя вынікі дасьледваньня

На гэтым мы канчаем аналіз ведаў вучняў па геаграфіі ў IV-х групах.

Аб чым гаворыць нам гэтае дасьледваньне? Мы прыходзім да двух наступных вывадаў:

1. Праграмы па геаграфіі для IV-х груп маюць шмат недахопаў. Перагрузка матар'ялам, даецца шмат ведаў, якія можна прайсьці ў старэйшых групах, напрыклад,—пяцігадовы плян разьвіцьця сельскай гаспадаркі. Будаўніцтва саўгасаў і калгасаў, недахоп аднаасобнай сялянскай гаспадаркі. Пяцігадовы плян разьвіцьця прамысловасьці і г. д. Неўдакладнены паасобныя часткі праграмы; ня ясна, што канкрэтна трэба прайсьці; праграмы павінны дакладна паказаць, якія сельскагаспадарчыя і прамысловыя раёны трэба прайсьці, якія гарады патрэбна ведаць вучням, якія галоўныя культуры растуць у тым або іншым раёне, якія галоўныя пабудовы ў СССР і г. д. Словам, трэба, каб праграма мела дакладны акрэсьлены аб'ём ведаў. У нашых праграмах гэтыя патрабаваньні яшчэ ня выкананы на 100 проц. Яны яшчэ маюць шмат занадта агульных палажэньняў.

Мы ўжо паказалі, як на практыцы гэта прыводзіла да самацёку ў выкладаньні, да разнабою, да недастатковага замацаваньня і засваеньня ведаў.

2. Важнейшай прычынай слабага засваеньня геаграфічных ведаў зьяўляецца няправільная мэтадычная прапрацоўка тэм настаўнікам. Мы бачылі, што вельмі мала ўжываюць геаграфічную карту. Настаўніку часта здавалася, што досыць будзе таго, што вучань прыгледзіцца да карты на сьцяне ў часе тлумачэньня. Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 25/VIII 32 г. гаворыць яскрава: «выкладчык павінен сыстэматычна, пасьлядоўна выкладаць сваю дысцыпліну», «прывучыць дзяцей да самастойнай работы». У зьвязку з гэтым трэба сказаць, што настаўнік вельмі мала практыкаваў самастойных заданьняў па геаграфіі, самастойнай індывідуальнай і калектыўнай прапрацоўкі карты. Нічога дзіўнага, калі вучні наслухаліся шмат рэчаў, не замацавалі іх, і потым пры праверцы блыталі,—накшталт таго, што раней было праведзена. Праца над картай, красьленьне карты, работа над контурамі, мадэлямі і г. д. зьяўляецца неабходнай часткай работы па геаграфіі. Далей, беднасьць і сухасьць прадстаўленьняў аб розных краінах нашага саюзу тлумачыцца недастатковым выкарыстаньнем кнігі і карціны пры паходжаньні геаграфічнага матар'ялу. Нельга атрымаць дакладнае, правільнае і жывое паняцьце аб тундры, аб стэпу і г. д.—толькі з некаторых слоў, якія вучань пачуе на працягу некалькіх хвілін. Настаўнік павінен сам падрыхтавацца па адпаведнай літаратуры, умець у форме жывога расказу перадаць малюнак ляндшафту. Настаўнік павінен кіраваць дзіцячым чытаньнем і выкарыстаць тую багатую апісальную геаграфічную літаратуру, якая ўжо маецца на сёнешні дзень, для выпрацоўкі яскравых прадстаўленьняў і замацаваньня ведаў. На жаль, настаўніцтва часта ня ведае, што такая літаратура існуе.

Толькі пры правільнай арганізацыі работы, пры правільнай пастаноўцы мэтадычнай работы, даны прадмет будзе пастаўлен на належную вышыню. Толькі тады мы зможам увесьці чоткасьць

і яснасьць у ведах вучняў. Задачай органаў нарасьветы і Навукова Дасьледчага Інстытуту Камвыхаваньня зьяўляецца канкрэтная распрацоўка пытаньняў мэтодыкі паасобных дысцыплін,—гэта адна з неадкладных задач нашай школы на сучасным этапе

А. Немцоў

Дапамога адстаючым у школах ФЗС і ШКМ

Слабая пасьпяховасьць некаторых вучняў у групе, у іншых—значнае адставаньне па таму ці іншаму прадмету, стварае, пачынаючы ўжо з ІІ кварталу, пагрозу для пасьпяховага засваеньня матар'ялу ўсёй групы. Настаўніку-выкладчыку той ці іншай дысцыпліны прыходзіцца крыху зьмяняць нармальны ход лекцый. Яму прыходзіцца альбо штучна тармазіць распрацоўку матар'ялу групы, каб даць магчымасьць падцягнуцца адстаючым, альбо, махнуўшы рукой на адстаючых, што зусім ужо няправільна, ісьці з групаю ўперад, паглыбляючы з кожнай лекцыяй разрыў паміж групаю і адстаючымі.

Урэшце, ужо з другога паўгодзьдзя намячаюцца кандыдаты на другагодніцтва, на тое другагодніцтва, якое вялікім цяжарам лажыцца на дзяржаву, прымушае затрату вялікіх сродкаў, вялікага часу.

Між тым, вельмі рэдка які настаўнік ведае сапраўдныя прычыны адставаньня вучня, спасылаючыся ў гэтых выпадках, звычайна, на «няздольнасьць» вучня, ня прымаючы пад увагу аніякіх іншых умоў працы вучня можа з-за адсутнасьцю часу, а можа не жадаючы заняцца гэтым пытаньнем.

На гэтыя-ж умовы варта было-б зірнуць, бо яны іншы раз нам растлумачаць адразу тое, што было незразумелым доўгі час і што пакідала вучня ў шэрагах адстаючых. Маючы справу з вучнем у школе на працягу 5—6 год, настаўнік, як быццам, павінен быў-бы за гэты час дасканала вывучыць яго, ведаць, як кажуць, «чым дыша вучань».

Але на справе гэта ня так, і прычына гэтага падае на несапраўдную «няздольнасьць» вучня. Гэтыя вучні патрабуюць дапамогі, пачынаючы ўжо з другога кварталу, бо калі на іх ня будзе зьвернута належная ўвага, ёсьць пагроза, што яны на справе ўвойдуць у лік другагоднікаў.

Пытаньне дапамогі адстаючым вучням трэба разглядаць з двух пунктаў гледжаньня: 1) вывучэньня прычын адставаньня; 2) дапамогі адстаючым.

Зусім зразумела, што аказваць дапамогу вучням, ня ведаючы прычын адставаньня, нельга: гэта падобна проста на лячэньне

без профіляктычных мерапрыемстваў. У шмат якіх выпадках дастаткова іншы раз зьнішчыць прычыну, выклікаючую адставаньне—і гэтым самым мы паменшым шэрагі адстаючых. Сюды трэба аднесьці адсутнасьць кніг, дрэнныя паводзіны на лекцыях, трату вялікага часу, выключна хатнія працы пасьля школы па заданьні бацькоў і інш.

Адсюль вынікае, што настаўнік павінен ведаць: 1) кароткі пэдалёгічны профіль вучня, 2) хатняе жыцьцё вучня і 3) яго вучэбную базу.

Да паняцьця «кароткі пэдалёгічны профіль» трэба аднесьці, прыкладна, наступнае: узрост, сацыяльнае становішча, фізычныя недахопы, здольнасьці вучняў, памяць, паводзіны на лекцыях і па-за школай, назіраньне за вучнем у мінулым—усё гэта дасьць матар'ял настаўніку для заключэньня, з кім настаўнік мае справу. Калі гаварыць аб групаводах, дык яны гэтыя зьвесткі накапляюць на працягу некаторага часу, займаючыся з сваёй групай; свае сумаваныя назіраньні яны павінны перадаць і выкладчыкам паасобных дысцыплін, калі вучань пераходзіць у другі канцэнтр. Фізычны недахоп патрабуе адразу рэзкага рэагаваньня—громкіх пытаньняў, пасадкі наперадзе і інш.

Вывучэньне хатняга жыцьця павінна паказаць настаўніку, у якіх умовах прыходзіцца жыць і працаваць яго выхаванцу. Асабліва важна ведаць, як праводзіць свой час вучань па-за лекцыямі, бо іншы раз патрэбна своечасова спыніць позьняе хаджэньне вучня, даведацца колькі часу займаецца вучань дома, колькі ён траціць часу на хатнія працы па заданьню бацькоў Ня менш важна ведаць і ўмовы хатняга жыцьця—сон, абставіны самастойных заняткаў, хатняе абсталяваньне.

Пад тэрмінам «вучэбная база» трэба разумець весткі аб ліку кніг у вучня, сшыткаў і інш. прылад, як займаўся вучань у папярэднія гады, з якім «багажом» вучань перайшоў, з якімі таварышамі, або сам займаецца. Гэта трэба ведаць і таму, што часта бываюць выпадкі, калі вучань ня мае сшыткаў, або якой-небудзь кнігі, і ў той-жа час, амаль штодзённа, прыносіць з сабою ў клясу семячкі, купленыя ім на рынку. У тым-жа выпадку, калі ў вучня ня знойдзецца кнігі, трэба імкнуцца зараз-жа ліквідаваць гэты прарыў, шляхам дапамогі з боку школы.

Другая частка пытаньня, самая дапамога вучням, раскладаецца на дзьве часткі: дапамога можа быць двох відаў—простая і ўкосная. Зусім зразумела, што прымяняць гэтыя віды дапамогі трэба абодвы.

Простая дапамога—гэта ёсьць заняткі з адстаючымі вучнямі ў па-за лекцыйны час. Але ёсьць яшчэ цэлы шэраг мерапрыемстваў, якія трэба аднесьці да ўскоснай дапамогі.

Ускоснай дапамогай трэба лічыць:

1. Перагрупоўку вучняў—адстаючых да адстаючых, у асобную групу. Тутака ёсьць і шэраг супярэчнасьцей, але ўрэшце

зьмена мэтадаў заняткаў з поўнай аднароднай групай павінна даць станоўчыя вынікі.

2. Работу з бацькамі—пэдагагізацыю бацькоў. Гэтаму пытаньню ў нас аддаюць зусім мала ўвагі, а між тым пытаньне надзвычайна важнае. Трэба дамагацца, каб бацькі ўявілі, што выхаваньне працягваецца і дома; інакш усё тое, аб чым гаворыцца ў школе, можа адразу быць разбурана дома; трэба дамагацца, каб запатрабаваньні школы былі і запатрабаваньнямі дома, а для гэтага бацькі павінны ведаць работу і жыцьцё школы. Пэдагагізацыя насельніцтва павінна ісьці цераз мэтавыя сходы, прыцягненьне бацькоў у розныя школьныя камісіі—вучком, самакіраваньне групы, камсод, насьценгазэта, гарачыя сьнеданьні і г. д.

3. Арганізацыю «ціхага» пакою, які адчыняецца ў школе на 1-2 гадзіну ўвечары, дзе вучні, няма͏ючыя па тых ці іншых прычынах магчымасьці заняцца дома, маглі-б падрыхтаваць лекцыі ў «ціхім» пакоі, у прысутнасьці чарговага дзяжурнага настаўніка.

4. Стварэньне прадметных бібліятэк. У сучасны момант няма ніводнага адпавядаючага свайму прызначэньню падручніка; прыходзіцца карыстацца шэрагам кніг, даведнікаў, часопісаў і г. д. Калі-ж у школе будуць «прадметныя» бібліятэкі, гэта значна аблегчыць працу вучняў, бо яны маюць магчымасьць кожную лекцыю карыстацца адпаведнымі кнігамі і часопісамі.

5. Прымацаваньне больш здольных вучняў да адстаючых у старэйшых групах, якія пад кіраўніцтвам настаўніка маглі-б зьдзейсьніць «шэфства» над адстаючымі.

6. Асобны падыход да адстаючых—уважлівае тлумачэньне, частыя запытаньні, асаблівая ўвага ў час самастойнай прапрацоўкі матар'ялу, дача асобных заданьняў—павінен паступова выцягнуць вучня з шэрагаў адстаючых.

Вось галоўныя этапы дапамогі вучням. Як бачна, справа ня ў тым, каб займацца з адстаючымі, і, галоўнае, «ствараць» іх, а трэба папераджаць утварэньне гэтых кадраў, для чаго неабходна з пачатку ўжыць шэраг «профіляктычных» мер.

АБМЕН ВОПЫТАМ ПРАЦЫ

В. Зайцаў

Адна з перадавых

Год упартай барацьбы за рэалізацыю гістарычнага рашэньня ЦК партыі аб пачатковай і сярэдняй школе не прашоў бясьсьледна для 12 Менскай нацыянальнай яўрэйскай ФЗС. Школа закончыла мінулы навучальны год з вялікай перамогай,—ва Ўсебеларускім конкурсе на лепшую палітэхнічную школу 12-ай ФЗС прысуджана другая прэмія, яна выйшла на лінію перадавікоў у барацьбе з «карэнным недахопам», у барацьбе за ператварэньне школы ў сапраўды палітэхнічную.

Высокая ўзнагарода мабілізавала школьны калектыў 12-ай яўрэйскай ФЗС на барацьбу за далейшыя перамогі ў справе будаўніцтва палітэхнічнай школы. Гэта і зразумела, да гэтага абавязвала ганаровая назва перадавой.

У аснову далейшай работы кладуцца пастановы ЦК партыі аб школе і рашэньні сакавікоўскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б аб культурным будаўніцтве БССР. Школьны калектыў, на чале з загадчыкам—энтузіястам-асьветнікам тав. Радштэйнам, узброены гэтымі важнейшымі дакумэнтамі партыі—бальшавіцкай праграмай пабудовы палітэхнічнай школы Маркса-Леніна-Сталіна, з яшчэ большым уздымам уступіў у новы бягучы навучальны год.

Яшчэ летась калектыў 12-ай ФЗС здолеў зацікавіць школьнай работай усю грамадзкасьць фабрыкі «Камунарка», да якой ФЗС прымацована. Фабрычныя арганізацыі дапамаглі школе сустрэць новы навучальны год ва ўсеўзброеньні. Рабочыя «Камунаркі» ня толькі дапамаглі, але за некалькі дзён да першага верасьня вылучылі брыгаду паглядзець і праверыць рабочым вокам—ці ўсё ў школе гатова да пачатку заняткаў.

Напярэдадні «дню вучобы» на агульна-фабрычным сходзе рабочая брыгада коратка, але ясна далажыла:

— Рамонт закончан...
— Рабочы пакой даабсталяваны...
— Адкрыт новы прыродазнаўчы габінэт...
— Дзетвара забясьпечана навучальнымі прыладамі...
— Настаўнікамі і дзецьмі школа ўкамплектавана...
— Могуць пачаць заняткі...

Рабочы сход даў наказ: **зрабіць упор на якасьць вучобы, біцца за поўную рэалізацыю дырэктыў ЦК партыі аб школе.**

31 жніўня школа наладжвае пробны дзень вучобы. 100-працэнтная яўка настаўнікаў і вучняў. На агульных сходах дзетвары першага і другога канцэнтру ў папулярнай форме пэдагогі растлумачваюць дзецям сэнс і значэньне пастановы ЦК партыі ад 25 жніўня. Дзетвара ў адказ на гэта рашэньне адказвае разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва, якое да кастрычніка ахоплівае амаль усю школу. У школе 9 груп, 285 вучняў. На сёнешні дзень у 12-ай ФЗС усе настаўнікі ўдарнікі, 188 вучняў ударнікаў з канкрэтнымі абавязацельствамі на лепшую рэалізацыю рашэньня ЦК партыі. Уцягнем у рады ўдарнікаў вучобы і астатніх,—гавораць школьнікі.

У «Дзень вучобы»—першага верасьня—школа пачала нармальную работу, пачалася ўпартая сыстэматычная барацьба за рэалізацыю рашэньняў ЦК партыі аб школе. Кожны з настаўнікаў прышоў у школу ўжо з распрацаваным дэкадным плянам. У гэты-ж дзень на пэдагагічным савеце дэталёва прапрацоўваецца пастанова ЦК УсеКП(б) ад 25 жніўня і настаўніцкі калектыў абавязуецца:

— Прапрацаваць у мэтбюро пытаньні аб увязцы выкладаньня моў з грамадазнаўствам і дакладнымі навукамі...

— Распрацаваць дакладны плян па палітэхнізацыі, уключыўшы ў яго экскурсіі на розныя прадпрыемствы...

— Даць дэталёвы плян за семестр...

— Завесьці ў выглядзе вопыту асабовы рахунак на кожнага вучня ў 4 групе...

— Прыходзіць на лекцыю добра падрыхтаванымі, ліквідаваць «карэнны недахоп», наладзіць мэтадычную дапамогу падшэфнай ШКМ і г. д. і г. п.

З першых-жа дзён занятак у школе пачала рэгулярна выдавацца штодзённая насьценгазэта «Працаваць па новаму». Насьценгазэта апэрацыйна са дня ў дзень змагаецца за падняцьце якасьці вучобы, за сьвядомую дысцыпліну, за палепшаньне ў школе санітарыі, за разгортваньне грамадзкай работы. Гэта яна, насьценгазэта, давяла да Кастрычніцкіх сьвят колькасьць ударнікаў школьнікаў да 188 чалавек, зьмяшчаючы на сваіх старонках выклікі, правяраючы выкананьне ўдарнікамі абавязацельстваў, выкрываючы ілжэўдарнікаў. Рабята любяць сваю насьценгазэту.

— Яна ў нас баявая... Яна ў нас агітатар і арганізатар... Яна б'е ня ў брыў, а ў вока,—гавораць дзеці. 30 проц. вучняў школы—актыўныя насьценкоры—гэта адно з вялікіх дасягненьняў насьценгазэты.

Да Кастрычніцкіх сьвят школа падвяла ітогі за першы семестр. Якія-ж вынікі, як настаўніцкі і вучнёўскі калектыў рэалізаваў свае абавязацельствы, з чым школа ўступае ў другі семестр?

З першага-ж дню занятак у 12-ай ФЗС арганізавана школьнае мэтбюро. Яно вылучыла тры мэтадычных камісіі: I канцэнтра, гуманітарных і дакладных навук. За гэты, параўнальна-кароткі пэрыод, у школе праароблена досыць значная мэтадычная работа. Распрацавана асобна для першага і другога канцэнтраў плянаваньне і вучот работы, абгавораны справаздачы аб мэтадах і арганізацыі працы ў першай і чацьвертай групах, распрацаваны пытаньні антырэлігійнага і інтэрнацыянальнага выхаваньня, сьвяткаваньня рэвалюцыйных сьвят у першым канцэнтры. Мэтадкамісія прыступіла да распрацоўкі такога важнейшага пытаньня, як мэтодыка выкладаньня матэматыкі ў першым канцэнтры. Мэтадычныя камісіі другога канцэнтра таксама праапрацавалі рад актуальных мэтадычных пытаньняў і праграмы. Да апошніх унесена рад заўваг і выпраўленьняў, якія перадаюцца ў гарана.

У мінулым навучальным годзе ў 12-ай ФЗС налічвалася 7 проц. адстаючых рабят. Школьнае мэтадбюро распрацавала спэцыяльную анкету для абсьледваньня вучняў на даму, з мэтай высьвятленьня прычын адставаньня. На сёнешні дзень дасьледвана ўжо больш 50 проц. дзяцей. Высьветлілася, што ў радзе выпадкаў кепскія жыльлёвыя ўмовы перашкаджаюць дзецям праапрацоўваць матар'ял у хаце. Школа ўжо арганізавала спэцыяльны пакой для кансультацыі адстаючым дзецям і заданьні на дом будуць праапрацоўвацца вучнямі ў гэтым пакоі.

Абавязацельства мець дэталёвы плян на семестр, настаўнікамі, калі можна так сказаць, перавыканана. Плян гэты ёсьць у кожнага настаўніка, кожны з іх мае дэкадныя пляны, якія ў групах другога канцэнтру вывешваюцца на спэцыяльных дошках. Школа працуе па строгім раскладзе. Заходзячы ў клясны пакой, вы бачыце на дошцы ня толькі цьвёрды расклад лекцый на год, але і дэкадныя пляны па кожнай дысцыпліне. Дзеці вітаюць гэта мерапрыемства настаўніцкага калектыву. Яны ведаюць, якая ім прадстаіць работа на працягу бліжэйшых дзесяці дзён і ўважліва правяраюць самі выкананьне свайго «прамфінпляну».

— Мы свой плян выканалі добра і можам ісьці далей,—гаворыць з гонарам рабята, правяраючы ітогі за дэкаду.

Незаўсёды ў школе ўсё добра з выкананьнем акадэмічнага «прамфінпляну». У 5 групе быў вялікі прарыў—з прычыны дэзарганізатарскай работы асобных вучняў. На ліквідацыю прарыва мабілізуецца школьная грамадзкасьць і бацькі. Склікаецца сход настаўнікаў і вучняў гэтай групы сумесна з бацькамі, супольна абгаварваецца пытаньне аб прарыве, намячаюцца меры для яго ліквідацыі. Агульнымі намаганьнямі прарыў у акадэмічным «прамфінпляне» ліквідуецца і нават некаторыя з недысцыплінаваных вучняў становяцца актыўнымі ўдзельнікамі ў гэтай барацьбе. Бацькі заходзяць у школу, пытаюцца — ну як прарыў ліквідаваны.

Дарэчы, аб рабоце школы з бацькамі. Школа перайшла на практыку скліканьня клясных вытворчых нарад вучняў сумесна з бацькамі. На вытворчых нарадах абгаварваюцца пытаньні, якія зьвязаны з жыцьцём і акадэмічнай работай данай клясы. Вынік—у нарадах з кожным разам актыўны ўдзел прымае ўсё большая колькасьць бацькоў.

Мэтбюро і мэтадычная камісія школы падвялі вынікі работы вучняў за першы семестр. Мэтадычныя камісіі дэталёва абгаварвалі посьпехі кожнага вучня і кожнаму з вучняў дана падрабязная ацэнка. У школе ўжо няма абязьлічкі мінулых гадоў. Настаўнік вядзе сыстэматычны вучот прапрацоўкі матар'ялу кожным вучням.

Вось вынікі семестра. У сёмай групе толькі трое вучняў адстаюць у адносінах граматнасьці. Астатнія ўсе прапрацавалі матар'ял праграмы здавальняюча. За семестр у гэтай групе толькі 13 прагулаў, з іх большасьць па ўважлівых прычынах.

Ударнікі ў першых радах. Вось ударніца вучаніца 7 групы **Гіта Ліпкінд.** «За семестр ніводнага прагула. Сур'ёзныя і адказныя адносіны да работы, здольнасьці сярэднія, па трох прадметах пасьпявае добра, па астатніх здавальняюча, праграму семестра выканала»,—дае ацэнку Гіце мэтадычная камісія.

— **Апраўдала сябе ў якасьці ўдарніка,**—канстатуе агульнаклясны сход вучняў супольна з прымацаваным настаўнікам, правяраючы самаабавязацельствы Ліпкінд Гіты.

Лейба Сітэрман—вучань шостай клясы—у мінулым годзе быў адным з самых недысцыплінаваных вучняў. Падымалася нават пытаньне аб прыстасаваньні да яго «вышэйшай меры пакараньня»—выключэньня.

Гэта было летась. Сёлета Лейба ў адказ на пастанову ЦК партыі аб школе абвяшчае сябе ўдарнікам, бярэ канкрэтныя абавязацельствы і змагаецца за іх рэалізацыю. **Лейба Сітэрман** ужо не «бузацёр», ён старшыня кляскому і лепшы ўдарнік. За семестр Лейба не прапусьціў ніводнай лекцыі, ні разу не спазьніўся на заняткі, па ўсіх прадметах выканаў праграму больш чым здавальняюча. Клясны сход і школьком вылучаюць Лейбу, як лепшага ўдарніка і ў Кастрычніцкія сьвяты ён прэміруецца школай.

У шостай групе таксама толькі трое адстаючых, але з іх двое гультаёў—Шварцберг і Каплан. Мы думаем, што энтузіязм спаборнічаючых дзяцей захопіць і гэтых двух. Па прыкладзе Лейбы Сітэрмана яны могуць і павінны быць сапраўднымі ўдарнікамі вучобы.

Наогул, калектыў 12-ай ФЗС за першы семестр зрабіў крок наперад у барацьбе з «карэнным недахопам», вучні здавальняюча ўсвоілі праграму і адстаючыя налічваюцца адзінкамі. Але... наперадзе яшчэ шмат крокаў для таго, каб поўнасьцю рэалізаваць дырэктыву ЦК партыі, ліквідаваць карэнны недахоп, усвоіць асновы навук.

У барацьбе за рэалізацыю рашэньня ЦК УсеКП(б) аб школе настаўніцкі калектыў 12-ай ФЗС не адзінокі. Перавыбары органаў школьнага дзіцячага самакіраўніцтва праходзяць пад лёзунгам мабілізацыі дзетвары на лепшую рэалізацыю дырэктыў партыі. Кожная сэкцыя дзіцячага самакіраваньня ўзяла на сябе канкрэтныя самаабавязацельствы, спаборнічаюць сэкцыя з сэкцыяй, кляском з кляскомам, група з групаю. Дзеці вядуць вялікую работу. Возьмем да прыкладу вучэбна-вытворчую сэкцыю. Члены сэкцыі даводзяць акадэмічныя дэкадныя пляны да кожнай клясы, вядуць бюлецені пасьпяховасьці, улік наведваньня, арганізуюць дапамогу адстаючым, афармляюць і вядуць улік сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Клясныя саветы змагаюцца за ўкараненьне сьвядомай дысцыпліны, «бузацёраў» выклікаюць на паседжаньні кляскому, школькому, шырока скарыстоўваецца насьценгазэта.

Рабяты ў сваёй барацьбе таксама не адзінокія. Да кожнай сэкцыі, кожнага кляскому і да школькому прымацаваны для дапамогі настаўнікі.

Калектыў 12-ай ФЗС уключыўся ва Ўсесаюзны конкурс на чысты сшытак. Пачынаючы з малышэй першага канцэнтру і канчаючы старэйшымі рабятамі,—усе змагаюцца за першае месца на конкурсе. Да Кастрычніцкіх сьвят ужо выяўлены лепшыя змагары за чысты сшытак і ў канцы другога сэмэстру будзе праведзена прэм'яваньне.

У школе 160 піянэраў, 60 акцябрат і 12 камсамольцаў. Вузкім месцам школы была слабая работа піянэрарганізацыі. Да 15 кастрычніка піянэрбаза была без кіраўніка. З паловы кастрычніка ён быў прыслан і работа пачала разгортвацца. Піянэрбаза зьявілася ініцыятарам унутрышкольнага конкурсу на лепшую групу па акадэмічнай пасьпяховасьці. Піянэрыя школы змагаецца за сьвядомую дысцыпліну, да слаба пасьпяваючых піянэраў прымацоўваюць акадэмічна больш мацнейшых таварышоў. Паміж зьвеньнямі, атрадамі і клясамі разгорнута сацспаборніцтва на лепшае і поўнае скарыстоўваньне лекцый і выкананьне вучэбнай праграмы.

Камсамольская ячэйка школы зусім не працавала. Менскі гарком камсамолу сакратара ячэйкі перакінуў на іншую работу, а новага ня далі.

12-ая яўрэйская ФЗС садружствуе з 31 беларускай ФЗС. Школы спаборнічаюць на лепшую рэалізацыю рашэньня ЦК УсеКП(б) ад 25 жніўня, заключан сацдагавор. Гэта садружаства ўзмацняе інтэрнацыянальна-клясавае выхаваньне ў абодвых школах. Вучні першага канцэнтру школ арганізоўваюць узаемныя наведваньні для абмену вопытам барацьбы з «карэнным недахопам». Малодшыя групы гэтых школ разам сьвяткавалі XV гадавіну Кастрычніка. Рабяты старэйшага канцэнтру абменьваюцца прадстаўнікамі па лініі дзіцячага самакіраваньня, наладжвалі супольны вечар і таксама разам сьвяткавалі Кастрычніцкія

сьвяты. 3-я група 12-ай ФЗС завязала пісьмовую сувязь з 3-ай жа групай адной з ШКМ Маскоўскай обласьці. У школе працуюць ячэйкі МОПР'а, АЗЭТ, Ваяўнічых бязбожнікаў, Асоавіяхіму, якімі ахоплены ўсе дзеці.

Было-б вялікай памылкай, калі-б мы абайшлі моўчкі і рад тых недахопаў і асобных прарэх, на ліквідацыю якіх школьны калектыў павінен мабілізавацца. Настаўнікі на першым паседжаньні школьнага савету абавязаліся распрацаваць плян па палітэхнізацыі, уключыўшы ў яго экскурсіі на розныя прадпрыемствы Менску. Плян выпрацаван, але толькі па мацярынскім прадпрыемстве (ф-ка «Камунарка»), экскурсіі на іншыя прадпрыемствы Менску ў плян яшчэ ня ўключаны і гэта зьяўляецца вялікім недахопам. Слаба настаўніцкі калектыў ажыцьцяўляе мэтадычную дапамогу падшэфнай Ждановіцкай ШКМ,—тут яшчэ пакуль толькі амаль адны пляны і меркаваньні. Калектыў настаўнікаў абавязан зьвярнуць асаблівую ўвагу на дапамогу маладым настаўнікам падшэфнай школы. Пэдагагічны калектыў абавязаўся арганізаваць марксысцка-ленінскі гурток, узьняць барацьбу за падвышэньне кваліфікацыі. З гуртка нічога не атрымалася. У Менскім пэдагагічным габінэце пачалася палітвучоба, якая ідзе... з пятага ў дзесятае... Пэдгабінэт дагэтуль ніводнага разу не сабраў выкладчыкаў літаратуры.

Малавата зроблена школай і ў галіне пазашкольнага выхаваньня дзяцей. Дысцыпліна ў школе таксама яшчэ не паднята на належную вышыню. Вялікі мінус калектыва, што ў яго барацьбе за рэалізацыю рашэньня ЦК аб школе ня было відаць твару і ролі мясцкому працасьветы, фактычна ён бязьдзейнічаў, бо былы старшыня ўшоў на іншую работу, а члены мясцкому, відаць, думалі, што трэба наогул закінуць прафэсіянальную работу. Ня так даўно адбыліся перавыбары мясцкому, але новы мясцком пакуль-што толькі раскачваецца.

Калектыў настаўнікаў і вучняў 12-ай ФЗС абавязан у самай бліжэйшай будучыне ўсе гэтыя недахопы зжыць. Яшчэ больш настойлівасьці, яшчэ вышэй тэмпы барацьбы за пасьпяховую і поўную рэалізацыю дырэктыў ЦК УсеКП(б) і рашэньняў сакавікоўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б. 12-я ФЗС абавязана ўпарта змагацца за захаваньне за ёй ганаровай назвы перадавой, змагацца за першае месца ў другім Усебеларускім конкурсе на лепшую палітэхнічную школу, які Наркамасьветы мяркуе абвясьціць у студзені месяцы.

МАСАВАЯ ПРАЦА

М. С.

Тэхпрапаганда праз паліт-асьветныя ўстановы

„Тэхніка ў пэрыяд рэканструкцыі рашае ўсё“ (т. Сталін).

„Бальшавікі павінны аўладаць тэхнікай“ (т. Сталін).

Аднэй з асноўных умоў перамогі ў справе арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў, у іх цяперашняй арцельнай стадыі, перабудовы работы саўгасаў, зьяўляецца рэалізацыя паказаньняў тав. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай, выкананьне ва ўсёй штодзеннай рабоце 6-ці гістарычных умоў т. Сталіна. Дырэктывы партыі ў галіне падвышэньня якасьці работы сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі, у галіне барацьбы за высокі ўстойлівы ўраджай, ня могуць быць выкананы бяз шырокага распаўсюджваньня ў масах агратэхнічных ведаў і практычнага прымяненьня гэтых ведаў у рабоце кожнага калгасьніка і рабочага саўгасу.

«Шырокае ўжываньне сельскагаспадарчых машын, навейшыя дасягненьні агратэхнікі патрабуюць новага работніка—тэхнічна-пісьменнага, які ўладае гэтай тэхнікай. Таму агратэхнічная прапаганда і вучоба павінны быць накіраваны на падвышэньне ўзроўню агратэхнічных ведаў калгасьнікаў і рабочых саўгасаў, азнаямленьне іх з пабудовай і работай сельскагаспадарчых машын і трактароў з правіламі догляду, падрыхтоўку новых кадраў, работнікаў па розных галінах сельскае гаспадаркі, падвышэньне агратэхнічных ведаў усяго складу агратэхнічнага пэрсаналу» **(з пастановы ЦК КП(б)Б).**

«Канчатковая ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў», «Ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бяскласавага сацыялістычнага грамадзтва», «завяршэньне рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі», «стварэньне навейшай тэхнічнай базы для ўсіх галін народнае гаспадаркі»—гэткія асноўныя задачы, пастаўленыя партыяй у 2-ой пяцігодцы. Рэалізацыя гэтай задачы патрабуе вялізарнейшай работы па далейшым уздыме культурнага ўзроўню працоўных мас. Тэхнічная і агратэхнічная прапаганда скла-

даюць важнейшую частку гэтае работы. XVII партыйная канфэрэнцыя паставіла перад сельскай гаспадаркай у якасьці цэнтральнай задачы ў другой пяцігодцы падвышэньне ураджайнасьці калгасных і саўгасных палёў і бальшавіцкае вырашэньне пытаньняў аб барацьбе з засухай» **(з пастановы XVII парт. канфэрэнцыі).**

Павысіць ураджайнасьць можна толькі шырокім унядрэньнем у саўгасную і калгасную вытворчасьць агратэхнікі.

У другую пяцігодку калгасы павінны дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны па вышыні ўраджайнасьці з гэктара. Для гэтага калгасы маюць усе магчымасьці, якія створаны і ствараюцца буйнай сацыялістычнай гаспадаркай і поўнай мэханізацыяй с/гасп. вытворчасьці.

«Пленум ЦК КП(б)Б адзначае буйнейшыя посьпехі ў рэканструкцыі сельскай гаспадаркі БССР, якія дасягнуты ў выніку пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі. На аснове росту калгасаў і саўгасаў і ўкараненьня ў вялізарных разьмерах машыннай тэхнікі, калгасы і саўгасы БССР у 1933 г. засеялі 60 проц., усёй пасеўнай плошчы, машынаўзброенасьць сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі БССР павялічылася за апошнія чатыры гады ў 4 разы. Арганізавана 57 МТС. На базе росту саўгасаў і калгасаў пасеўная плошча БССР у параўнаньні з даваенным часам павялічылася на 1.240 тыс. га.

Такім чынам на аснове гэтых посьпехаў завершана першая стадыя ўздыму сельскай гаспадаркі—найбольшае пашырэньне пасеўных плошчаў. У галіне сельскай гаспадаркі перад партыйнымі, савецкімі і зямельна-калгаснымі арганізацыямі паўсталі новыя задачы, якія вызначаюцца наступным указаньнем ЦК УсеКП(б) і ўраду: «Наступіў час, калі ад росту гаспадаркі ў шырыню шляхам павялічэньня пасеўных плошчаў, неабходна паварнуць да барацьбы за лепшую апрацоўку зямлі, да барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці, як галоўнай і цэнтральнай задачы ў галіне сельскай гаспадаркі на данай стадыі разьвіцьця».

Барацьба за павышэньне ўраджайнасьці і якасьці сельскагаспадарчай вытворчасьці шляхам укараненьня і аўладаньня агратэхнікай, ва ўмовах поўнай перамогі саўгасаў і калгасаў—ёсьць працяг разгорнутага сацыялістычнага наступленьня ў вёсцы, разгортваньне на больш шырокай аснове барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасных мас, за сацыялістычнае перавыхаваньне іх, за выхаваньне ў калгаснай масе сацыялістычных адносін да грамадзкай уласнасьці, разгортваньне барацьбы з рэшткамі кулацтва і кулацкім уплывам. У барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці вядучая роля належыць МТС і саўгасам.

Задача павышэньня ўраджайнасьці набывае асабліва актуальнае значэньне ва ўмовах БССР—рэспублікі галоўным чынам інтэнсыўных культур» (З пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б).

Пленум з усёй сілай падкрэсьлівае важнасьць і неабходнасьць аўладаньня агразоотэхнікай і тэхнікай буйнай сацыялістычнай сельскагаспадарчай вытворчасьці, без чаго немагчыма конкрэтнае і глыбокае кіраўніцтва сельскай гаспадаркі, немагчыма разгортваньне бальшавіцкай барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў».

(З пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б).

Роля палітыка-асьветнае ўстановы ў справе ўздыму ўраджайнасьці, разгортваньня агратэхнічнай прапаганды вельмі вялікая. Трэба барацьбу за высокі ўраджай, за аўладаньне працоўнымі тэхнікай сацыялістычнае сельскае гаспадаркі паставіць у цэнтры работы п/асьветных установ. «Трэба рашуча змагацца з недаацэнкай аўладаньня тэхнікай, як аднаго з важнейшых вучасткаў клясавай барацьбы, супроць праваапартуністычнай практыкі раўнаньня на самацёк, а таксама супроць «лявацкіх» загібаў падмены тэхнічнай прапаганды голым адміністраваньнем».

(З пастановы ЦК КП(б)Б).

Клясавы вораг—кулак будзе і. надалей імкнуцца ўсімі мерамі шкодзіць справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, справе будаўніцтва сацыялізму. Наша задача—узмацніць клясавую пільнасьць, своечасова разаблачаць контррэволюцыйную дзейнасьць клясавага ворага, наносіць зьнішчальны ўдар па кулаку і яго агентуры, мабілізуючы ўвагу і сілы мас калгасьнікаў навакол пытаньняў клясавай барацьбы.

Кожная п/асьветная ўстанова—ДСК, саўгасныя і калгасныя клюбы павінны як мага шырэй разгарнуць агратэхнічную прапаганду сярод працоўнага насельніцтва, зрабіўшы гэтую працу штодзеннай, плянавай. Неабходна ўсю агратэхпрапаганду падпарадкаваць задачам саўгасаў, калгасаў і МТС, задачам выкананьня іх вытворчых пляпаў арганізацыйна-гаспадарчаму замацаваньню. Практыка работы некаторых п/асьветных устаноў сьведчыць, што слабая пастаноўка агратэхпрапаганды тлумачыцца, галоўным чынам, недаацэнкай гэтае работы, адсутнасьцю плянавасьці, несыстэматычнасьцю, адсутнасьцю ўвязкі ў гэтай рабоце з адпаведнымі мясцовымі ўстановамі і арганізацыямі, адсутнасьцю згуртаванага актыву.

Выходзячы з дырэктывы партыі і ўраду ў галіне сацыялістычнай рэканструкцый сельскай гаспадаркі і задач агратэхпрапаганды—ДСК, калгасныя і саўгасныя клюбы безадкладна павінны прыступіць да разгортваньня агратэхпрапаганды. Работа па агравытворчай прапагандзе, увязаная з вытворчымі задачамі па сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі, падвышэньне ўраджайнасьці і разгортваньне жывёлагадоўлі павінна праводзіцца ў гаспадарках сацыялістычнага сэктару (саўгасах, МТС, калгасах).

Таму ўсе мерапрыемствы па агравытворчай прапагандзе (курсы, гурткі, лекцыі, вопытная работа, экскурсыі і г. д.), павінны праводзіцца праз гаспадаркі сацсэктара з ахопам і ўцягненьнем у гэтую работу акаляючых адзінаасобнікаў—беднякоў і серадьнякоў. «У барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці вядучая роля належыць МТС і саўгасам». (З пастаноў сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б). Пры гэтым цэнтр цяжкасьці ўсёй агравытворчай прапаганды неабходна перанесьці ў вытворчую брыгаду калгасу і саўгасу, у мэтах цясьнейшай увязкі агравытворчай вучобы з практычнай работай калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і ў мэтах узмацненьня на гэтай аснове вытворчай брыгады, як важнейшага зьвяна ў арганізацыі працы калгасаў.

Арганізаваць работу калгаснай брыгады такім чынам, каб у ёй асяроджвалася ажыцьцяўленьне конкрэтных мерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці (масавая агрападрыхтоўка брыгадзіраў, вытворчыя нарады ў брыгадах і агранарады ўсяго складу брыгады). Іменна калгасная брыгада будзе галоўным чынам вырашаць задачу ўздыму ўраджайнасьці. Выходзячы з гэтага, неабходна сканцэнтраваць увагу калгасаў на пытаньнях усямернага ўзмацненьня вытворчых брыгад і замацаваньня іх сталага складу. У прыватнасьці, перад выхадам на веснавую сяўбу кожная брыгада павінна атрымаць і дасканала прапрацаваць канкрэтныя заданьні па ўздыме ўраджайнасьці асобных культур. (З пастаноў сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б).

Выключную ролю ў справе агравытворчай прапаганды маюць МТС і саўгасы, узброеныя машыннай тэхнікай і вядучыя сваю гаспадарку на аснове прымяненьня агранамічнае навукі.

Кожная МТС, кожны саўгас, электрастанцыя ў сельскіх мясцовасьцях павінны быць асяродкамі прапаганды агратэхнікі сярод шырокіх працоўных мас. Для таго каб наладзіць і разгарнуць агратэхпрапаганду як сьлед, п/асьветныя ўстановы павінны правесьці адпаведную падрыхтоўчую работу, зьвязацца з мясцовымі ўстановамі і арганізацыямі МТС, саўгасамі, калгасамі. Супольна з імі, выходзячы з мясцовых умоў і адзінага культпляну—распрацаваць сталы канкрэтны плян мерапрыемстваў па агравытворчай прапагандзе. Згрупаваць актыў гэрояў саўгаснае і калгаснае вытворчасьці, ударнікаў сацыялістычных адносін да гэтае вытворчасьці, камсамол, мясцовых культпрацаўнікоў, спэцыялістых, вучняў, ШКМ, ВРШ. З ліку іх падрыхтаваць аграармейцаў, правёўшы адпаведную работу—сходы, канфэрэнцыі, гутаркі з распрацоўкай на іх пытаньняў аб чарговых задачах калгаснага будаўніцтва, аб агравытворчай прапагандзе. Згуртаваньне навакол пытаньняў агравытворчай прапаганды актыву, падрыхтоўка з лепшых саўгасьнікаў і калгасьнікаў аграармейцаў павінна заняць адно з важнейшых месц у працы п/асьветных устаноў. Але, мабілізаваць аграармейцаў—гэта яшчэ ня ўсё, што патрэбна для пасьпяховага разгортваньня агравытворчай прапаганды. Для таго, каб аграармейцы спраў-

ляліся з сваімі абавязкамі, іх трэба падрыхтаваць і дапамагаць у штодзённай працы. Формамі падрыхтоўкі могуць быць—канфэрэнцыі, гурткі, зьлёты і кансультацыя.

Канфэрэнцыі праводзяцца пяцідзённыя і дэкадныя. У праграму гэтых канфэрэнцый павінны ўваходзіць такія пытаньні:

1) Задачы калгаснага будаўніцтва ў 2-й пяцігодцы і агравытворчая прапаганда.

2) Падвышэньне ўраджайнасьці—цэнтральная задача сельскай гаспадаркі.

3) Роля аграармейцаў у справе калгаснага будаўніцтва, палепшаньні калгаснае і саўгаснае вытворчасьці і ліквідацыі агравытворчай няпісьменнасьці.

Прапрацаваўшы гэтыя пытаньні, удзельнікі канфэрэнцыі падзяляюцца на брыгады, сэкцыі па спэцыяльнасьці: арганізатары гурткоў і курсаў, экскурс-арганізатары і кіраўнікі, арганізатары сацспаборніцтва і ўдарніцтва, арганізатары прасоўваньня агравытворчай літаратуры ў масы і г. д., дзе прапрацоўваць канкрэтныя пытаньні працы.

Для правядзеньня такіх канфэрэнцый п/асьветныя ўстановы рыхтуюцца загадзя—складаецца плян-праграма, вызначаюцца дакладчыкі, кіраўнікі работай сэкцыі, падрыхтоўваюцца патрэбныя дапаможнікі і інш.

У працэсе работы п/асьветныя ўстановы склікаюць сыстэматычныя (1 раз у месяц) зьлёты, нарады аграармейцаў, дзе побач з прапрацоўкай пытаньня чарговых задач і працы заслухоўваюцца справаздачы аб праробленай працы, наладжваецца памен вопытам.

Вельмі важным і патрэбным у працы з аграармейцамі трэба лічыць арганізацыю для іх кансультацыі. Гэтую працу п/асьветныя ўстановы даручаюць аграному, настаўніку ШКМ, па арганізацыйна-мэтадычных пытаньнях праводзяць самі п/асьветныя працоўнікі. Аб дні, часе і месцы кансультацыі своячасова паведамляюцца аграармейцы. Кола абавязкаў аграармейцаў.—Яны дапамагаюць п/асьветнай установе ў арганізацыі агравытворчых гурткоў, куткоў і музэяў, арганізацыі каротка-тэрміновых курсаў, агратэхгадзін, прыцягваюць рабочых і калгасьнікаў на курсы, гурткі, завочнае навучаньне, канфэрэнцыі і вядуць вучот навучаньня. Дамагаюць у арганізацыі гутарак, дакладаў, лекцый па пытаньнях агратэхнікі, дапамагаюць арганізоўваць вытворчыя выстаўкі, распаўсюджваньні агравытворчай літаратуры.

Праводзяць экскурсіі ў МТС, саўгасы, калгасы, электрастанцыі і г. д., дапамагаюць у набыцьці і маляваньні лёзунгаў плякатаў. Арганізоўваюць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, дапамагаюць у наладжваньні судоў над тымі працаўнікамі, якія нядбайна адносяцца да машын, ухіляюцца ад аўладаньня агратэхнікай. Кожнаму паасобку аграармейцу даручаецца пэўнае кола абавяз-

каў, за што ён і нясе адказнасьць (арганізатар гурткоў і курсаў, арганізатар экскурсіі і г. д.).

Ва ўсёй рабоце аграармейцаў павінна быць разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Калі патрэбна, арганізуюцца і гурткі асобна для аграармейцаў; праграма гэтых гурткоў будуецца выходзячы з вытворчых задач калгасаў, саўгасаў. Але неабходна дабіцца, каб усе аграармейцы былі ахоплены вучобай у гутарках, завочным навучаньнем, курсамі.

Формы і мэтады работы

Побач з усёй падрыхтоўчай работай па наладжваньні агравытворчай прапаганды і ўнядрэньні агратэхнікі ў масы працоўных п/асьвет установам неабходна разгрануць шырокую агітацыйна-растлумачальную кампанію аб значэньні агратэхнікі і неабходнасьці аўладаньня тэхнікай сацыялістычнае сельскае гаспадаркі ўсімі працоўнымі, задачах падвышэньня ураджайнасьці.

Правёўшы шэраг сходаў з пастаноўкай на іх дакладаў, гутарак, галосных чытак адпаведнае літаратуры, газэт і г. д., усю работу па тлумачэньні задач аўладаньня агравытворчай тэхнікай трэба ўвязваць з арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў, арганізацыяй і паляпшэннем работы брыгад, разгортваньнем сацыялістынчага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Асноўнымі формамі і мэтадамі агравытворчай прапаганды будуць наступныя:

А г р а к а л г а с п а х о д. Гэта калектыўная форма агравытворчай прапаганды. Паход усіх калгасьнікаў, рабочых, саўгасаў, спэцыялістых, культпрацаўнікоў за аўладаньне агратэхнікай, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за ўздым ураджайнасьці, за бальшавіцкае выкананьне вытворча-гаспадарчых плянаў. Для кіраўніцтва агракалгаспаходам утвараюцца штабы цэнтральны і раённы, пры с/сав. з удзелам партыйных і камсамольскіх арганізацый, зямельных органаў, нарасьветы і культпрацаўнікоў, калгасьнікаў і рабочых саўгасаў. Перад тым як распачаць агракалгасны паход, трэба правесьці шырокую падрыхтоўчую работу. Мабілізаваць навакол гэтага мерапрыемства ўсю масу калгасьнікаў і рабочых саўгасаў. Распрацаваць дэталёва плян правядзеньня агракалгаспаходу па раёну, с/савету, калгасу. Згуртаваць актыў, замацаваць да кожнага вучастку падрыхтаваных таварышоў, падпарадкаваўшы задачам агракалгаспаходу ўсю п/асьветную работу, мабілізаваўшы ўвесь актыў, друк, бібліятэку, кіно, радыё, самадзейныя гурткі і г. д.,—Ставячы перад сабой асноўную задачу— ліквідацыю агратэхняпісьменнасьці барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, лепшую арганізацыю працы брыгад, уздым ураджайнасьці, выкананьне вытворча-гаспадарчых плянаў гаспадарак і г. д.,

цесна ўвязаўшы і падпарадкаваўшы агракалгаспаход задачам сацрэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Першым этапам агракалгаспаход можа мець такія заданьні: стварэньне штабу і яго ячэек па асобных вучастках работы, выпрацоўка апэрацыйнага пляну паходу і канкрэтных заданьняў па кожным вучастку. Мабілізацыя актыву аграармейцаў, падрыхтоўка яго праз нарады, конфэрэнцыі і прымацаваньне да асобных вучасткаў з пэўным колам абавязкаў. Далейшае заданьне агракалгаспаходу—агітацыйна-растлумачальная работа і мабілізацыя працоўных на ліквідацыю агратэхняпісьменнасьці. Разгарнуць шырокую растлумачальную работу сярод працоўных мас—задач і значэньня агракалгаспаходу, задач і значэньня аўладаньня тэхнікай для сацыялістычнага будаўніцтва і падвышэньня ўраджайнасьці, давёўшы гэтую растлумачальную работу да кожнага саўгаса, калгаса, фэрмы, брыгады, да кожнага саўгасьніка і калгасьніка; для гэтага пры ўсіх п/асьветных установах (ДСК, клюбы, чырвоныя куткі), саўгасах, МТС, калгасах, правесьці сходы з пастаноўкай дакладаў на тэму агракалгаспаходу, арганізаваць цэлы шэраг гутарак.

Пры ўсіх п/асьветных установах наладзіць выстаўкі агравытворчай літаратуры, прасоўваючы яе ў масы саўгасьнікаў і калгасьнікаў. Мабілізаваць раённы друк, мясцовыя насьценныя газэты, падпарадкаваўшы гэтаму пытаньню асобныя разьдзелы газэт і выданьне спэцыяльна прысьвечаных насьценгазэт.

Разгарнуць шырокую справачную работу пры ўсіх п/асьветных установах на час агракалгаспаходу.

Разгарнуць абслугоўваньне агракалгаспаходу мастацкай работай—пастаноўкай драмгурткамі адпаведных п'ес і мастацкіх форм, вылучэньне мастацкіх брыгад для абслугоўваньня асобных вучасткаў, арганізацыя пастаноўкі цэлага раду кіно-фільмаў, шырока выкарыстоўваючы ва ўсёй рабоце радыё. Арганізаваць цэлы шэраг экскурсій; арганізаваць сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў правядзеньні агракалгаспаходу.

Наладзіць сыстэматычнае асьвятленьне агракалгаспаходу праз друк, дошкі інфармацыі, якія сыстэматычна вывешваць на відных мясцох.

Далейшы этап агракалгаспаходу павінен мець ужо задачу выкананьня канкрэтных пунктаў пляну ў галіне ліквідацыі агратэхняпісьменнасьці.

Арганізацыя курсаў, агратэхгадзіны ў брыгадах, школах для малапісьменных, лікпунктах, арганізацыя гурткоў. Правядзеньне лекцый, гутарак па агратэхпрапагандзе. Арганізацыя экскурсіі, абсталяваньне кутка, музэя па агратэхпрапагандзе; укамплектаваньне бібліятэк агравытворчай літаратурай і распаўсюджваньне гэтае літаратуры; вярбоўка на завочныя курсы і с/гаспадарчыя навучальныя ўстановы, дапамога ў наладжваньні работы вытворчых нарад. Арганізацыя справачнае работы, кансультацыі, пля-

навага слуханьня радыё-перадач па агратэхніцы і г. д. Пры гэтым п/асьветныя ўстановы не павінны адрываць агракалгаспаходу ад палітычна-клясавага выхаваньня. Клясавую пільнасьць працоўных трэба ўзьняць на вышэйшую ступень. Клясавы вораг-кулак будзе шкодзіць у праьядзеньні такога важнага мерапрыемства, як агракалгаспаход. Своечасова выкрываць вылазкі клясавага ворага, наносячы па ім зьнішчальны ўдар.

Курсы і гурткі. Апошнія павінны заняць адно з відных месц у сыстэме паглыбленай агравытворчай падрыхтоўкі калгаснага і саўгаснага актыву, у ліквідацыі агратэхнічнай няпісьменнасьці сярод працоўнага насельніцтва. Сельскагаспадарчыя курсы і с.-г. вытворчыя гурткі павінны будаваць сваю работу, выходзячы з гаспадарча-вытворчых задач саўгаса, калгаса. У адпаведнасьці з гэтым яны павінны будавацца як агра-вытворчыя, ставячы перад сабою задачу праапрацоўкі канкрэтных вытворчых пытаньняў і спэцыялізавацца па паасобных галінах сельскае гаспадаркі. Гурткі могуць быць—паляводаў, трактарыстых, жывёлаводаў, гароднікаў, гурткі вынаходцаў і г. д.; курсы падрыхтоўкі брыгадзіраў, трактарыстых, жывёлаводаў, ільнаводаў і г. д. Своечасова п/асьветнай установе неабходна вылучыць кіраўніка гуртка (добра падрыхтаванага для гэтае справы, пажадана агранома,-настаўніка), падрыхтаваць адпаведныя падручнікі, прылады ў залежнасьці ад напрамку працы гуртка; пры дапамозе агрaпэрсаналу падрыхтаваць праграму, прадугледзеўшы апрача тэарэтычных пытаньняў практычную работу, экскурсыі; падшукаць памяшканьне.

На першым арганізацыйным сходзе гуртка пасьля азнаямленьня ўдзельнікаў з задачамі працы, праграмай і распарадкам штодзённай працы—абіраецца бюро гуртка. Бюро выпрацоўвае плян працы; трымае сувязь з адпаведнымі арганізацыямі і ўстановамі, клапоціцца аб своечасовым забесьпячэньні членаў гуртка падручнікамі прыладамі, дагаварваецца аб экскурсыях, склікае сходы гуртка, вядзе вучот работы, наведваньне і г. д. З першых дзён работы члены гуртка падзяляюцца на сталыя брыгады, шырока разгарнуўшы ў штодзеннай рабоце сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Асноўны мэтад работы—разгорнутая жывая гутарка, практычныя заняткі, заданьні і іх прапрацоўка, экскурсыі. Задача кіраўніка—дабіцца актыўнага ўдзелу ў працы кожнага члена гуртка.

Побач з гэтым п/асьветныя ўстановы сумесна з дырэкцыяй саўгасу, праўленьнем калгасу павінны забясьпечыць у кожнай брыгадзе, л.-п. школе, м.-п. правядзеньне 1—2 разы ў дэкаду агратэхгадзіны, што зьяўляецца вельмі важным момантам барацьбы за аўладаньне агратэхнікай, за ўздым працы ў брыгадзе, саўгасе, калгасе. Для кіраўніцтва агратэхгадзінай павінны быць выкарыстаны аграномы, брыгадзіры, падрыхтаваныя аграармейцы.

Завочнае навучаньне. Вялікую ролю ў справе падрыхтоўкі кадраў для сацыялістычнае сельскае гаспадаркі адыгрывае завочнае навучаньне. Навучаньне дзесяткаў тысяч калгасьнікаў тэхніцы с/гасп. вытворчасьці зьяўляюцца вялізарнейшай задачай, з якой адна стацыянарная сетка навучальных устаноў ня справіцца. Аднэй з форм ажыцьцяўленьня гэтай задачы павінна зьявіцца завочнае навучаньне. Завочнае навучаньне адрозьніваецца ад стацыянарнага тым, што яно пабудавана без адрыва ад вытворчасьці.

Кожная п/асьвет. установа павінна разгарнуць шырокую работу па папулярызацыі завочнага навучаньня, дамагаючыся найбольшага ахопу рабочых саўгасаў, калгасаў, МТС. Трэба забясьпечыць кожную п/ асьвет. установу справачнымі матар'яламі—умовы прыёму ў завочн. с.-гасп. установы: дзе, калі, якім чынам. Арганізаваць консультацыю для завочнікаў пры дапамозе агранома, настаўніка, студэнтаў с.-гасп. навуч. устаноў, практыкантаў.

Праз бібліятэку забясьпечыць завочнікаў патрэбнай літаратурай.

Даклады, лекцыі і гутаркі. У мэтах ліквідацыі агратэхнічнай няпісьменнасьці сярод працоўных п/асьв. установам неабходна выкарыстоўваць у сваёй працы і такія віды масавай работы як правядзеньне лекцыі, дакладаў і гутарак па пасобных пытаньнях калгаснага будаўніцтва, зьвязаных з агразоотэхнікай.

Перад тым як наладжваць адно з гэтых мерапрыемстваў, неабходна—вылучыць дакладчыка, лектара, або кіраўніка гутаркі, у залежнасьці ад віду работы. Шырока папулярызаваць гэтае мерапрыемства сярод саўгасьнікаў і калгасьнікаў, апавясьціць аб часе і месцы сходу. Падрыхтаваць адпаведныя дапаможныя матар'ялы для ілюстрацыі даклада, лекцыі, або гутаркі—сьветавы ліхтар, дыапазытывы, табліцы, плякаты, экспонаты і г. д. Пасьля правядзеньня лекцыі, а асабліва гутаркі, неабходна разгарнуць шырокае абгаварэньне закранутага пытаньня, абмен вопытам і г. д., з тым, каб гэтая работа насіла актыўны характар і праводзілася з актыўным удзелам прысутных. Лекцыі і гутаркі павінны праводзіцца плянава і паступова, закранаць пытаньні агразоатэхнікі, цесна ўвязаныя з вытворчымі задачамі калгасу, саўгасу і МТС, з чарговымі задачамі сацбудаўніцтва.

Бібліятэчная праца. Бібліятэка, як магутны фактар мабілізацыі працоўных мас на выкананьне гаспадарча-палітычных задач і мерапрыемстваў, павінна адыграць вельмі вялікую ролю ў справе ліквідацыі агразоатэхняпісьменнасьці.

Бібліятэкам патрэбна зараз-жа перагледзець с.-г. аддзелы, выкінуць застарэлыя шкодныя кніжкі, папоўніўшыя ўсімі навінкамі с.-гасп. літаратуры. Абсталяваць сталую выстаўку літаратуры «за ўздым ураджайнасьці, за авалоданьне агразоатэхнікай сацыялістычнай сельскай гаспадаркі», сыстэматычна вывешваць

на відных мясцох рэкамендацыйныя сьпісы літаратуры па пытаньнях аўладаньня агравытворчай тэхнікай, тэхнікай калгаснага і саўгаснага будаўніцтва.

Пажадана ў гэтым сьпісе даваць кароткую характарыстыку рэкамэндуемай кніжкі. Апрача таго рэкамэндуецца праводзіць чыткі і гутаркі з чытачамі, наладжваць віктарыны і г. д., выходзячы з канкрэтных умоў, задач і падрыхтаванасьці працоўных-чытачоў.

Самым магутным сродкам набліжэньня кнігі да чытача зьяўляецца кнігаността, якое прыцягвае шырокія колы чытачоў і павялічвае процант прасоўваньня палітычнай і агратэхнічнай літаратуры.

Але выканаць гэтую задачу, бібліятэка павінна згрупаваць навакол гэтае працы актыў бібармейцаў, кніганош і культармейцаў з ліку калгасьнікаў, рабочых саўгасаў, вучняў ШКМ, школ м.-н., пачатковых школ, праз іх індывідуальна і брыгадамі сыстэматычна прасоўваць кніжку ў масы працоўных, калгасьнікаў, рабочых саўгасаў.

Бібліятэка выканае пастаўленыя перад ёю задачы толькі пры ўмове павароту ўсёй работы тварам да вытворчасьці—брыгады, фэрмы, паасобнага калгасьніка і рабочага саўгаса.

К у т к і і м у з э і а г р а т э х н і кі. Музэі або куткі агразоатэхнікі павінны быць створаны пры кожнай п/асьветнай установе.

Матар'ялы і экспонаты гэтых музэяў і куткоў павінны наочна паказваць перавагу сацыялістычнае сельскае гаспадаркі, дапамагаць калгаснаму і саўгаснаму будаўніцтву, адлюстроўваць дасягненьні калгасаў і саўгасаў, садзейнічаць арганізацыйна-гасп. змацаваньню калгасу, садзейнічаць падвышэньню ўраджайнасьці, аўладаньню агразоатэхнікай працоўнымі. Матар'ял такіх музэяў і куткоў павінен складацца з наступнага: лёзунгі, вытрымкі з пастаноў, рэзалюцыі зьездаў партыі і ўраду, XVII партканфэрэнцыі, прамоў тав. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай, 6-ці гістарычных умоў тав. Сталіна, задач калгаснага будаўніцтва, асноўных задач 2-ое пяцігодкі, вытрымкі з плянаў калгасаў і саўгасаў, «за якія паказчыкі будзе змагацца калгас, або саўгас у 2-ой пяцігодцы».

Упрыгожыць куток партрэтамі правадыроў.

Для кутка неабходна набыць шэраг плякатаў—дапаможнікаў па аўладаньні тэхнікай шэрагу с.-гасп. працэсаў—догляд за жывёлай, праца трактара, меры барацьбы з пустазельлем, як і чым лепш угнойваць глебу і г. д., догляд за садам, гародам і г. д.

Набыць шэраг мадэляй.

Забясьпечыць куток экспанатамі вытворчасьці калгасу, саўгасу, а таксама экспанатамі з суседніх калгасаў і саўгасаў.

Аддзелы музэя і кутка павінны быць падпарадкаваны вытворча-гаспадарчым задачам саўгасу, калгасу і будавацца ў залежнасьці ад вытворчага напрамку калгасу, саўгасу (паляводзтва, жывёлагадоўлі, вэтэрынарыі і заатэхнікі, садаводзтва і гароднiцтва, с.-г. шкоднiкаў і хвароб расьлін і меры барацьбы з імі, с.-гасп. машын, прылад і г. д.).

Для абсталяваньня музэяў і куткоў трэба запрасіць мясцовага агранома, настаўніка, вучняў, саўгасны і калгасны актыў.

Апрача іншых разьдзелаў музэю абавязкова патрэбна ўтварыць аддзел вынаходзтва і рацыяналізацыі, дзе паказаць узоры вынаходзтва і рацыяналізацыі, паказаць эфэкт, атрыманы ад гэтых мерапрыемстваў і г. д. Згуртаваць вакол гэтага кутка вынаходцаў, рацыяналізатараў актыў, наладзіўшы з імі штодзенную работу і дапамогу.

Апрача ўтварэньня куткоў і музэяў, пры п/асьветных установах неабходна наладжваць с.-г. выстаўкі. Такія выстаўкі ў большасьці выпадкаў дапасоўваюцца да дня ўраджаю і калектывізацыі.

Важна да працы ў кутку музэя прыцягнуць актыў, гурткі, школы, зрабіўшыя гэтыя куткі і музэі сапраўднымі лябараторыямі аўладаньня тэхнікай сацыялістычнае сельскае гаспадаркі.

Экскурсыі. Для падвышэньня вытворчай кваліфікацыі рабочых саўгасаў, МТС, калгасьнікаў, для ўвязкі ўсёй работы па агратэхпрапагандзе, асабліва вялікую ролю павінны адыгрываць экскурсыі ў саўгасы, калгасы, МТС, электрастанцыі, дасьледчыя с.-г. станцыі.

Кожная экскурсыя павінна суправаджацца гутаркай або лекцыяй. Гурткі і курсы праводзяць экскурсыі ў пачатку прапрацоўкі таго альбо іншага пытаньня.

У першую чаргу да кожнай экскурсыі, неабходна падрыхтавацца самому кіраўніку, папярэдня абсьледаваўшы прыпадна-сімы экскурсантам матар'ял.

Кожную экскурсію неабходна падзяляць на такія асноўныя моманты: а) падрыхтоўка да экскурсыі, б) правядзеньне экскурсыі і в) прапрацоўка атрыманага на экскурсыі матар'ялу. Ня трэба абмяжоўвацца ў часе экскурсіі толькі назіраньнем і выслухоўваньнем кіраўніка—неабходна ўсё цікавае і новае запісваць, каб потым прапрацаваўшы прымяніць лепшыя дасягненьні ў сваім калгасе, саўгасе.

У часе экскурсіі ўдзельнікі зьбіраюць лепшыя ўзоры вядзеньня гаспадаркі, якія потым перадаюцца ў музэі і куткі.

Газэта ў барацьбе за аўладаньне агразоатэхнікай. Мясцовы друк (райгазэта і насьценная газэты) павінен адыгрываць вялікую ролю ў справе барацьбы за агратэхніку. П/асьветным установам неабходна ўсю работу па агратэхпрапагандзе ўвязаць з мясцовай газэтай, сыстэматычна асьвят-

ляючы ход агратэхпрапаганды, мабілізуючы працоўных на ліквідацыю агразоаняпісьменнасьці, выкрываючы і наносячы зьнішчальны ўдар па клясавым ворагу-кулаку і яго агэнтуры—якія будуць шкодзіць у гэтай справе.

Насьценныя газэты п/асьветных устаноў, калгасаў і саўгасаў павінны быць таксама мабілізаваны на штодзённы ўдзел ў агратэхпрапагандзе. Сыстэматычна зьмяшчаючы матар'ялы па агратэхпрапагандзе, трэба пры сьценгазэтах вылучыць куток «Аўладаем тэхнікай сацыялістычнай сельскай гаспадаркі», дзе зьмяшчаць ня толькі справаздачна-інфармацыйны матар'ял, але-ж забясьпечыць зьмяшчэньне ў парадку памену вопытам лепшых узораў работы па агратэхніцы і спэцыяльных артыкулаў, падмацаваных практыкай калгасу, асобных брыгад, саўгасу.

Для вывучэньня лепшае пастаноўкі агравытворчай прапаганды ў асобных калгасах, саўгасах, гуртках, брыгадах з мэтаю перанясеньня лепшага вопыту на ўсе вучасткі работы, для мабілізацыі працоўных на ліквідацыю агравытворчай няпісьменнасьці, п/асьветныя ўстановы праводзяць конкурсы і пераклічкі. Удзел у гэтай справе мясцовага друку і насьценгазэт надзвычайна вялікі. Неабходна сыстэматычна наладжваць пераклічкі як праз райгазэту, так і насьценныя газэты, уцягваючы ў гэтую справу саўгасы, калгасы, гурткі, брыгады, чырвоныя куткі і г. д. Праз пераклічкі асобныя вучасткі работы знаёмяць працоўных з дасягненьнямі ў сваёй працы і недахопамі, мабілізуюць працоўных на ліквідацыю агравытворчай тэхнікі, дзеляцца вопытам, разгортваюць у сваёй рабоце сацспаборніцтва і ўдарніцтва, робячы выклікі праз друк.

Конкурсы праводзяцца на лепшы саўгас, калгас, брыгаду і п/асьветную ўстанову па разгортваньні агравытворчай прапаганды, на лепшы гурток, школу, аграармейца і г. д.

Важна, каб усе гэтыя мерапрыемствы садзейнічалі выкананьню задач, пастаўленых партыяй у галіне рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, разгортваньня агравытворчай прапаганды.

Р а д ы ё, к і н о, м а с т а ц к а я р а б о т а. Побач з іншымі відамі палітыка-асьветнае работы для справы ліквідацыі агразоаняпісьменнасьці, павінны быць выкарыстаны радыё, кіно і мастацкая работа.

Па лініі выкарыстоўваньня радыё п/асьветным установам неабходна максымальна скарыстаць радыёперадачы па пытаньнях агратэхнікі для калектыўнага слуханьня. Каб забясьпечыць прысутных слухачоў, неабходна загадзя апавяшчаць калгасьнікаў і саўгасьнікаў аб чарговых радыё-перадачах, вывешваючы для гэтага на відных мясцох аб'явы, апавяшчаць аб перадачах на гуртках, сходах, праз л.-п. школы, асабліва вялікую ролю радыё павінна адыграць для завочнікаў.

Мастацкая работа павінна штодзенна дапамагаць справе ліквідацыі агразоаняпісьменнасьці сярод працоўнага насельніцтва. Драмгурткам неабходна ўключыць у пляны свае работы пастаноўку адпаведных п'ес, арганізацыю вечароў, прысьвечаных пытаньням агратэхнікі.

Праца кіно-перасоўкі таксама павінна садзейнічаць ня толькі агітацыі за агратэхніку, але-ж змагацца з агратэхняпісьменнасьцю шляхам пастаноўкі фільмаў спэцыяльнага характару.

Перад дэманстраваньнем фільму і пасьля праводзіцца ўступная і заключная гутаркі. Дэманстраваньне фільму суправаджаецца тлумачэньнем.

Справачная работа і консультацыя. Справачная работа ў кожнай п/асьвет установе павінна быць разгорнута на ўвесь час. У справачным стале побач з іншымі матар'яламі справачнага характару трэба мець матар'ялы па пытаньнях агратэхнікі, завочнага навучаньня, умоў прыёму ў гэтыя ўстановы і г. д., час ад часу арганізоўваючы вечары пытаньняў і адказаў па пытаньнях агратэхпрапаганды. Апрача гэтага абавязковым трэба лічыць арганізацыю пры п/асьвет установе кансультацыі для брыгадзіраў, завочнікаў, вынаходцаў. У гэтым мерапрыемстве трэба выкарыстаць с.-гасп. спэцыялістых саўгасаў, МТС і калгасаў, настаўнікаў, студэнтаў, практыкантаў.

Вытворчыя нарады ў калгасах і саўгасах, як форма агравытворчай прапаганды. Вытворчыя нарады ў саўгасах і калгасах зьяўляюцца адным з важнейшых мерапрыемстваў уцягненьня саўгасьнікаў і калгасьнікаў у гаспадарчае будаўніцтва калгасу. Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў у вялікай меры залежыць ад унядрэньня ў шырокія масы калгасьнікаў накопленага вопыту па арганізацыі і тэхніцы вядзеньня калектыўнае вытворчасьці ў калгасах.

Задачай вытворчых нарад зьяўляюцца калектыўнае абмеркаваньне і рашэньне пытаньняў кіраўніцтва і палепшаньня гаспадаркі. Для найбольшай прадукцыйнасьці вытворчых нарад неабходна ўцягваньне ў іх работу калгасьнікаў, зьвязаных паміж сабой аднолькавымі вытворчымі інтарэсамі. Аб важнасьці ўдзелу мас у вытворчых нарадах гаворыцца ў тэзісах тав. Швэрына, зацьверджаных па дакладу на XVI зьезьдзе УсеКП(б).

«Разгортваючаеся сацыялістычнае наступленьне патрабуе яшчэ больш актыўнага і непасрэднага ўдзелу ў кіраўніцтве гаспадарчым будаўніцтве дзесяткаў і соцень тысяч перадавых пралетараў і ўцягненьня мільённых мас рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх мас калгаснага сялянства ў практычную работу сацыялістычнага будаўніцтва. Работа вытворчых нарад зьяўляецца адным з важнейшых відаў агравытворчай прапаганды».

Палітыка-асьветныя ўстановы павінны прыняць самы актыўны ўдзел у арганізацыі і наладжваньні работы вытворчых нарад калгасаў і саўгасаў.

Кожная палітыка-асьветная ўстаноўка праз даклады, гутаркі, насьценную газэту, бібліятэку, мабілізацыю культарміі павінна растлумачыць масам саўгасьнікаў і калгасьнікаў значэньне вытворчых нарад і мабілізаваць іх для актыўнага ўдзелу ў працы вытворчых нарад.

Неабходна цесна ўвязаць работу вытворчых нарад з працай п/асьветных устаноў, штодзённа дапамагаць у гэтай рабоце, праз мясцовы друк і насьценную газэту асьвятляць ход работы вытворчых нарад, іх дасягненьні і г. д.

Крытыка і бібліяграфія

Міх. Цыганаў

„Маятнік"

Пад гэтай назвай Юндзетсэктар Белдзяржвыдавецтва зусім нядаўна выдаў кніжку Баркоўскага і Муськіна. Яна перакладзена з украінскай мовы.

Ня гледзячы на тое, што кніжка была разьлічана для дзяцей, яна па сваім зьмесьце настолькі актуальна, што знаёмства з ёй ня толькі неабходна, але і абавязкова, у першую чаргу, для настаўнікаў і бацькоў.

Нарадзілася кніжка досыць цікава, што лішні раз падкрэсьлівае актуальнасьць тэмы.

Ва ўкраінскую газэту «На зьміну» ад Рамана Качэтава паступіў ліст.

Хто такі Качэтаў?

Іх шмат. Сам ён піша наступнае: «Я вучыўся ў працоўнай школе. Бацька мой токар, маці—хатняя гаспадыня» (стар. 35).

Ліст Раман напісаў таму, што яму «цяжка зараз», ён «ня ведае, да каго зьвярнуцца за парадай» (заўважайце), таму што «сям'я—багна; а ён «паміж сям'ёю і школай, як маятнік».

Гэты настрой і няведаньне, што і як рабіць вынікаюць з трагэдыі, якую перажывае Раман Качэтаў. Атрымаўся разрыў паміж выхаваўчым працэсам школы і асяродзьдзем, у якім ён знаходзіцца. Матка яго—рэлігійная, цёмная, палітычна зусім няпісьменная. Яна часта скардзіцца бацьку, што «Савецкая ўлада адбірае ад яе дзяцей. Сямён загінуў на фронце, а Рамана адбірае школа. Ён слухае больш свайго важатага, чым маці. Яго ніяк не ўгаварыць хоць адзін раз пайсьці ў царкву» (стар. 36).

Бацька Рамана «ў бога ня верыць», але—«у каляды ён узяў у ашчадкасе дваццаць пяць руб. і аддаў іх маці. Маці купіла і засмажыла гусака. Гэты дзень быў у нас не такі, як заўжды». (стар. 37).

Нізкі культурны ўзровень сям'і, пабоі, цемната бацькоў, рэлігійнасьць маткі, давіць усё на тое, што Раман атрымлівае ў школе, у выніку чаго ў яго вырываецца крык адчаю:

«Дарагія мае таварышы. Я ня ведаю ў каго зараз прасіць дапамогі. Я ня веру ў бога, але ў школе мне заўсёды гавораць адно, а дома зусім іншае. Я ведаю: маці мая

несьвядомая. Яна нічому ня вучылася. Я хацеў нават зусім пайсьці з дому, але куды я пайду і як я буду жыць. Мне шкада глядзець як перажывае маці. Я ведаю: рана ці позна— я сам уцяку ад маткі. У нашым доме мне не хапае паветра» (стар. 39, курсыў мой. Мік. Ц.).

Але кінуць матку ў Рамана не хапае сілы. Чаму?—Перашкаджае ўнутранае пачуцьцё.

Матка памыляецца дзякуючы няпісьменнасьці, але яна любіць яго, ахвяравала сабой дзеля дзяцей. «Пад час голаду,—піша Раман,—маці сама не даядала, каб накарміць мяне і сястру, якая ў той год памерла. Як-жа я пайду з дому? Яна будзе хадзіць за ўсімі і глядзець сумнымі вачыма, як глядзела Вянэрка, калі ў яе забралі шчанят» (стар. 39).

Настаўнікі, бацькі, уся грамадзкасьць павінны задумацца над словамі Качэтава Рамана: зразумець, што павінна рабіць школа, каб ня было «маятнікаў».

З просьбай абгаварыць становішча Рамана, рэдакцыя надрукавала ліст ў газэце.

З усіх бакоў пасыпаліся лісты, частка якіх і складае рэцэнзуемую кніжку.

Аб чым кажуць яны?

Асноўнае—Раман Качэтаў не адзін. З Радзівонаўкі Чапурыла, сын бедняка-селяніна, піша: «У мяне справа значна горшая, як у Рамана Качэтава. **У мяне разлад ня толькі ў рэлігіі, але і ва ўсім палітычным жыцьці»** (стар. 41, падкр. мной. Мік. Ц.), а далей: «Усе сілы я паклаў на тое, каб пераканаць бацьку, але дарэмна. Колькі бацька мяне лаяў. Ён зрабіўся вельмі злосны, глядзіць на мяне, як на ворага, маці таксама нездаволена» (стар. 42).

Зьмітра Бобрыкаў з вёскі Варава адзначае: «Я на становішчы «Маятніка»... Бацькі ў мяне няма... Чытаючы пра разьвіцьцё Савецкага Саюзу я радуюся. У мяне шмат энэргіі, але я ня ведаю куды дзяваць яе, поруч з гэтым матка гасіць маю энэргію.

Дзе шлях, якім я павінен пайсьці» (стар. 45).

Гэта яскравы прыклад, як рэлігійнасьць падаўляе ініцыятыву дзяцей, ставіць іх у становішча такое што паяўляецца адчай, пэсымістычныя настроі, разлад паміж школай і асяродзьдзем.

У некаторых дзяцей становішча горшае. Напрыклад, у Максіма Бандуры бацька баптыст. Максіму прыходзіцца хаваць ад бацькі тое, што ён піянэр. За чытаньне антырэлігійных кніжак брату: «бацька так пабіў, што кроў заліла галаву. Сярод зімы бяз вопраткі я быў выкінуты на вуліцу. Пасьля гэтага я захварэў. За дапамогаю яшчэ ні да каго не зьвярнуўся, але бачу, што самому мне выхаду не знайсьці» (стар. 45—46).

Вось яскравы прыклад зьверства, да якога прыводзіць рэлігія.

Амплітуду хістаньня «маятнікаў» неабходна зьнішчыць.

Гэта. баявая задача ў справе камуністычнага выхаваньня падрастаючага пакаленьня.

У кніжцы досыць яскрава паказана, як папы і сэктанты імкнуцца адарваць дзяцей ад сацыялістычнага будаўніцтва і дасягаюць гэтага, часта, ня толькі праз бацькоў, але і непасрэдна. Вось прыклад: Рыгор Хрушчакоў «папаў пад ўплыў эвангелістаў яшчэ ў дзяцінстве. Чатыры гады сьпяваў ён боскія псальмы, пакуль, як і Мікола Кірэпка, не папаў на піянэрскі сход» (стар. 106), пасьля якога пачуў няжыцьцёвасьць сваёй працы, пачуў клясавую варожасьць папоў і сэктантаў супроць сацыялістычнага будаўніцтва.

У кніжцы багата сабрана матар'ялу, які паказвае барацьбу дзяцей супроць рэлігіі, посьпехі гэтай барацьбы. Напрыклад, у Ліпецкім раёне «піянэры выкрылі пяць сэктанцкіх груп» (стар. 90), але побач з гэтым аўтары далі шмат матар'ялу-лістоў з парадамі, як Раману Качэтаву, выбрацца з становішча, у якім ён апынуўся. У гэтых лістох побач з парадай,—змагайся супроць рэлігійнасьці бацькоў упарта шляхам растлумачальнай працы, шляхам падвышэньня іх культурнага ўзроўню,—ёсьць і памылковыя парады (кінь бацькоў); але ўсё-ж адчуваецца бадзёрасьць і вера ў перамогу над рэлігіяй, над клясавымі ворагамі—папамі і сэктантамі.

Яшчэ раз прыдзецца падкрэсьліць, што з кніжкай павінны азнаёміцца, у першую чаргу, пэдагогі і бацькі, зрабіць з яе належныя вывады. Пэдагогу яна пакажа на неабходнасьць ўзмацненьня антырэлігійнай працы, на неабходнасьць сталага наладжваньня працы з бацькамі, на ўласныя памылкі ў працы (стар. 115). На канкрэтных і жывых прыкладах пакажа барацьбу папоў і сэктантаў за дзяцей, барацьбу апошніх (дзяцей) супроць рэлігіі, вынікі барацьбы і дасьць мажлівасьць сьмела і правільна кіраваць антырэлігійснай працай дзяцей.

Кніжка падкрэсьлівае неабходнасьць ўзмацненьня камуністычнага выхаваньня. Яна прымушае настаўніка глыбока заглянуць ў працу, выявіць «маятнікаў» і прыняць крокі да канчатковага зьнішчэньня разрыву паміж школай і асяродзьдзем дзіцяці.

Кніжка «Маятнік» надта цікавая.

ІНФАРМАЦЫЯ

Пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту Асьветы БССР ад 10-XII-1932 г.

Аб выкананьні пастановы ЦВК СССР аб праграмах і рэжыме ў ВНУ і тэхнікумах

У мэтах поўнага ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў, вызначаных у пастанове ЦВК СССР і канкрэтызаваных пастановай Калегіі НКА ад 29/XI 1932 г., Калегія НКА пастанаўляе:

1. З вынікамі праверкі выкананьня пастановы ЦВК СССР аб праграмах і рэжыме ў ВНУ і тэхнікумах—згадзіцца.

2. Абавязаць ДВС на працягу 5-ці дзён распрацаваць канкрэтны плян з вызначэньнем тэрмінаў пераапрацоўкі і здачы ў друк праграм і навучальных плянаў, устанавіўшы адказнасьць за выхад кожнае праграмы.

3. Даручыць Кваліфікацыйнай Камісіі з сэкцыяй навуковых працаўнікоў правесьці сталы, дыфэрэнцыраваны па яго спэцыяльнасьцях, вучот навуковых працаўнікоў БССР.

4. Т. т. Вольфсону, Гальбрайху і Чмялеўскаму распрацаваць праект разьмеркаваньня прафэсарска-выкладчыцкіх сіл паміж наркаматамі з мэтай рацыянальнага іх скарыстаньня.

Праект праз калегію НКА унесьці на абмеркаваньне Савету Народных Камісараў БССР.

5. Сэктару кадраў і ДВС на працягу дэкады распрацаваць для ўсіх ВНУ і тэхнікумаў дыфэрэнцыраваны, па тыпах устаноў, плян разгорнутых, дэталізаваных мерапрыемстваў, як арганізацыйнага, гэтак і мэтадычнага парадку, па практычнаму правядзеньню ў жыцьцё пастановы ЦВК у разрэзе рашэньняў апошняга пленуму КП(б)Б.

6. Абавязаць ДВС на працягу бліжэйшых дзён распрацаваць палажэньне аб катэдрах, а інстытуты, на грунце палажэньня,—распрацаваць парадак работы катэдр.

7. Дырэктарам інстытутаў і пэдтэхнікумаў устанавіць суровы кантроль за нармальным ходам заняткаў (зьнішчэньне спазьненьняў і прагулаў з боку студэнтаў і выкладчыкаў), не дапушчаючы зрываў заняткаў.

8. Устанавіць сыстэматычны кантроль з боку сэктароў кадраў НКА і ДВС за ажыцьцяўленьнем навучальнымі ўстановамі паста-

новы ЦВК СССР, з гэтай мэтай ў 1-м квартале 1933 г. арганізаваць пэрыядычныя даклады і абсьледваньне працы інстытутаў і тэхнікумаў (выбарчым гарадкам).

9. Сэктару кадраў і ДВС кожную дэкаду дакладваць наркому аб ходзе ажыцьцяўленьня пастановы ЦВК СССР.

10. Даручыць сэктару кадраў безадкладна праверыць работу выкладчыкаў ВПІ тт. Александрова і Загорскага і прыняць у адносіне да іх адпаведныя захады.

11. ДВС адмяніць няправільныя мейсцы ў пастановах Сэсіі ДВС, разгарнуўшы ў друку шырокую крытыку памылковых установак.

Нам. Наркома Асьветы *Вольфсон*

Сакратар калегіі НКА *Абрамова*

Зацьверджаю:
Нам. Наркома Асьветы БССР т. Рудніцкі
2/X—1932

ПАЛАЖЭНЬНЕ АБ КІРАЎНІЦТВЕ ШКОЛАЙ, ПРАВАХ І АБАВЯЗКАХ ЗАГАДЧЫКА, ЯГО НАМЕСЬНІКА ДЫ ІНШЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ ШКОЛЫ

І. Агульная частка

> «НКА саюзных рэспублік забясьпечыць ажыцьцяўленьне адзінаначальля ў кіраўніцтве школай, прафсаюзным арганізацыям аказаць у гэтай справе неабходную дапамогу органам народнае асьветы» (пастанова ЦК УсеКП(б) ад 5/IX-31 г.).

У адпаведнасьці з дырэктывай ЦК партыі аб устанаўленьні адзінаначальля ў кіраўніцтве школай і строгай, выключаючай абязьлічку, адказнасьці за даручаную працу, НКА БССР устанаўляе наступнае разьмеркаваньне функцый адміністрацыйна-гаспадарчага, пэдагагічнага і абслугоўваючага пэрсаналу ў адзінай, працоўнай савецкай палітэхнічнай школе.

II. Загадчык школы, яго правы і абавязкі

1. Загадчык школы кіруе ўсім вучэбным, выхаваўчым і адміністрацыйна-гаспадарчым жыцьцём школы і нясе, на аснове адзінаначальля, поўную адказнасьць за пастаноўку працы школы.

2. Загадчык школы прызначаецца гарадзкім або раённым аддзелам народнае асьветы, у веданьні якога знаходзіцца школа.

3. Загадчык школы мае права:

а) прадстаўляць АНА да назначэньня і звальненьня намесьнікаў загадчыка і выкладчыкаў, прымаць на працу і звальняць тэхнічны пэрсанал, у даручанай яму школе;

б) зацьверджаць гадавыя вытворчыя пляны і ўсе рабочыя пляны, устанаўляць належны кантроль за іх выкананьнем;

в) заключаць ад імя школы ўмовы з прадпрыемствамі ды іншымі ўстановамі;

г) устанаўляць адпавядаючыя канкрэтным умовам школы, формы і мэтады вучэбнай і выхаваўчай працы ў адпаведнасьці з рашэньнямі партыі і дырэктывамі НКА;

д) зацьвярджаць пастановы школьнага савету і, у выпадку свае нязгоды з пастановай апошняга, спыняць правядзеньне іх у жыцьцё і давядзеньнем на вырашэньне АНА спрэчных момантаў;

е) правяраць працу педагогаў шляхам асабістага наведваньня вучэбных заняткаў у клясах, майстэрнях, працоўных пакоях, лябараторыях, габінэтах і на прадпрыемствах;

ж) распускаць асобныя камісіі і вучнёўскія гурткі, калі апошнія сваёй працай не адпавядаюць вучэбна-выхаваўчым мэтам школы;

з) устанаўляць правілы ўнутранага распарадку школы і накладаць на працаўнікоў і вучняў школы спагнаньні за парушэньне іх;

і) выключаць са школы бяз права паступленьня ў школу тэрмінам ад аднаго да трох год, «нейсправных з вучняў, хуліганствуючых і зьняважаючых вучашчы пэрсанал, парушаючых распараджэньне адміністрацыі школы і пэдагогаў, ламаючых школьны рэжым, псуючых ці расхішчаючых маёмасьць школы». (Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 25/VIII-32 г.).

4. Загадчык школы непасрэдна распараджаецца ўсімі крэдытамі школы, як бюджэтнымі, гэтак і спэцыяльнымі ў межах існуючых законапалажэньняў.

5. На загадчыка школы ўскладаецца адказнасьць:

а) за сваячасовы пачатак навучальнага году, за сваячасовае і поўнае ўкамплектаваньне школы вучнямі, поўны ахоп дзяцей школьнага ўзросту, якія жывуць у раёне школы і за акуратнае наведваньне вучнямі школы.

б) за падбор і мэтазгоднае скарыстаньне працаўнікоў школы— намесьнікаў загадчыка, настаўнікаў, тэх. пэрсаналу і інш.;

в) за сваячасовую прапрацоўку вучэбнага матар'ялу, дабраякаснае, поўнае і цьвёрдае засваеньне вучнямі кожнай групы і ўсёй школы ў цэлым ведаў, якія ўстанаўляюцца праграмамі НКАсьветы БССР;

г) за арганізацыю вытворчага навучаньня і грамадзкай працы вучняў, на аснове падначальваньня грамадзка-вытворчай працы вучэбным і выхаваўчым мэтам школы і за поўную рэалізацыю умовы паміж школай і прадпрыемствам;

д) за складаньне і прапрацоўку гадавога вытворчага пляну школы, за прыняцьце мер, якія забясьпечваюць выкананьне пляну;

е) за арганізацыю працы школьнага савету, прыцягненьне рабочае грамадзкасьці да ўдзелу ў працы школы, арганізацыю, пры апоры на Камсод, працы з бацькамі і вядзеньне праз школу сярод рабочых прадпрыемства, калгасьнікаў і працоўнага насельніцтва пэдагагічнай прапаганды;

ж) за становішча працы вучнёўскіх арганізацый;

з) за пастаноўку камуністычнага выхаваньня ў школе і правільную арганізацыю актыўнага ўдзелу школы ў сацыялістычным будаўніцтве;

і) за своечасовае абсталяваньне школы вучэбным і клясным інвэнтаром, прыладамі, інструмантамі, падручнікамі, дапаможнікамі, за матар'яльны стан школьных будынкаў, своечасовае правядзеньне рамонту, снабжэньне школы апалам і падрыхтоўку школы да заняткаў;

к) за становішча ў школе працоўнай дысцыпліны вучняў і выкладчыкаў;

л) за выкананьне ўстаноўленага рэжыму ў школе, унутранага распарадку школы і ўстанаўленьне нагрузкі дзяцей у адпаведнасьці з пастановай Ураду і НКАсьветы БССР;

м) за санітарыю ў школе і гігіену вучняў;

н) за становішча інвэнтару і вучнёўскай сталовай, арганізацыю забесьпячэньня вучняў вопраткай, абуткам і гарачымі сьнеданьнямі;

о) за арганізацыю спрыяючых умоў для працы вучняў школы—дзяцей рабочых, калгасьнікаў і бяднейшых пластоў працоўнага насельніцтва і забесьпячэньне ім дапамогі і ўвагі з боку ўсяго пэдкалектыву;

п) забесьпячэньне ўмоў для павышэньня кваліфікацыі пэдагогаў, арганізацыю перападрыхтоўкі настаўніцтва школы;

р) за своечасовае і мэтазгоднае разьмеркаваньне і скарыстаньне сродкаў, за становішча грашовых і матар'яльных кніг, прыбыткова-выдатковых дакумантаў і ўсяго фінансава-матар'яльнага вучоту.

6. Загадчык школы пры садзейнічаньні піянэр-арганізацый уцягвае праз агульна-вучнёўскія арганізацыі ўсю масу школьнікаў у вучэбна-вытворчую і грамадзка-палітычную працу школы, арганізуючы вучняў на барацьбу за якасьць вучобы і палітэхнізацыю школы, за сьвядомую дысцыпліну, выкананьне рэжыму школы, беражлівыя адносіны да школьнае маёмасьці і за санітарна-гігіенічны стан школы.

7. Загадчык школы, праводзячы ўсе неабходныя мерапрыемствы па ўзмацненьні працы школы, павышэньні вытворчай дысцыпліны, павінен у той-жа час арганізаваць і ўзначаліць разьвіцьцё творчага пачыну, ініцыятывы і самадзейнасьці пэдагога, тэхпэрсоналу і вучняў школы, у максымальнай меры чула адно-

сіцца да паказаньняў працаўнікоў і вучняў школы па арганізацыйных, мэтадычных і гаспадарчых недахопах школы і прымаць меры для ліквідацыі адзначаных недахопаў.

8. Загадчык школы ўсямерна дапамагае ў працы вытворчых нарад, праводзіць у жыцьцё тыя пастановы вытворчых нарад, якія зьяўляюцца карыснымі для школы.

9. Загадчык школы дапамагае разгортваньню сац. спаборніцтва і ўдарніцтва ўнутры школы з прадпрыемствамі ды іншымі школамі.

10. Загадчык школы праз Камсод мабілізуе бацькоў дзяцей на ажыцьцяўленьне і кантроль за выкананьнем пастаноў Партыі і Ўраду па правядзеньні ўсеагульнага абавязковага навучаньня, палітэхнізацыі школы; склікае бацькоўскія сходы, вядзе азнаямленьне бацькоў з праграмамі, плянамі і мэтадамі працы школы, арганізуе азнаямленьне з вынікамі працы вучняў і абгаварэньне мерапрыемстваў па ўтварэньні спрыяючых умоў у сям'і для працы вучняў; прымае разам з Камсодам меры па адшуканьні дадатковых да бюджэту грамадзкіх сродкаў, неабходных для правядзеньня мер па палепшаньні ўнутры-школьнага быту (гарачыя сьнеданьні, гарбата, арганізацыя клюбнае працы, разумны адпачынак і г. д.), абсталяваньня габінэтаў, майстэрняў, працоўных пакояў, набыцьця дапаможнікаў і школьных прылад.

11. Загадчык школы арганізуе пэрыядычную справаздачу школы аб яе працы ў цэлым ці па асобных разьдзелах перад дзяржаўнымі ўстановамі, грамадзкімі арганізацыямі і шырокай пралетарскай грамадзкасьцю, асьвятляе працу школы ў агульным і насьценным друку.

III. Намесьнік загадчыка школы

1. Намесьнік заг. школы па вуч. частцы нясе адказнасьць перад заг. школай за становішча вучэбна-вытворчай, праграмна-мэтадычнай і выхаваўчай працы, сталы расклад школьных заняткаў; складае плян вучэбна-вытворчай працы і арганізуе праграмна-мэтадычную працу праз школьнае мэтадычнае бюро, цыклявыя і групавыя мэтадычныя камісіі; наладжвае працу выкладчыкаў па складаньні імі вытворчых і рабочых плянаў па дысцыплінах, групах; складае цьвёрды расклад заняткаў, правілы ўнутранага распарадку ў габінэтах, лябараторыях, майстэрнях, працоўных пакоях, бібліятэках, на прадпрыемстве і інш.; арганізуе вытворчае навучаньне на прадпрыемствах, у калгасе, саўгасе, на вопытным вучастку і г. д. арганізуе вучот працы вучняў, дапамагае ім у плянаваньні працы, разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва; арганізуе і вядзе вучот школьнае вучэбна-вытворчай працы, як колькасны, так і якасны па асобных

канцэнтрах і па ўсёй школе, кіруе працай групаводаў і групавых арганізатараў.

2. Намесьнік заг. школы па вуч. частцы абавязан:

а) арганізаваць па-за школьную працу вучняў, выходзячы з устаноўленых норм нагрузкі вучняў, устанавіць сувязь з камсамольскімі, піянэрскімі і вучнёўскімі арганізацыямі школы па ўсіх пытаньнях вучэбна-выхаваўчай працы школы;

б) арганізаваць абсталяваньне габінэтаў, лябараторый, бібліятэк, майстэрняў, рабочых пакояў і г. д.;

в) разьмеркаваць вучняў па групах, падрыхтоўваць пытаньні аб парадку іспытаў пры пераводах і выпусках вучняў, уносячы свае прапановы па гэтых пытаньнях у школьны савет і заг. школы;

г) арганізоўваць працу па азнаямленьні пэдагогаў з асновамі вытворчасьці, праводзячы вытворчыя экскурсіі на ф-кі, заводы, саўгасы, калгасы і інш. і сыстэматычнаму вывучэньню вытворчасьці, складаць плян пэдагагічнае прапаганды сярод рабочых, калгасьнікаў, інжынэрна-тэхнічнага і агранамічнага складу і ажыцьцяўляць гэты плян сіламі школы;

д) інструктаваць пэдагогаў па пытаньнях арганізацыі пэд. працэсу, ужываньня асобных, спрабаваных на практыцы мэтадаў працы, вядзеньня выхаваўчай работы і па ўсіх астатніх пытаньнях вучэбна-выхаваўчай работы школы.

IV. Настаўнікі

1. Настаўнікі школы нясуць адказнасьць:

а) за выкананьне вучэбных плянаў і праграм школы ў групе і па сваёй дысцыпліне;

б) за якасьць навучаньня і выхаваньня вучняў сваёй групы;

в) за пасьпяховасьць вучняў па вучэбных дысцыплінах, якія яны выкладаюць;

г) за правільна-арганізаваную сыстэму камуністычнага выхаваньня дзяцей у групе;

д) за арганізацыю выхаваўчае работы сярод вучняў, за ўмацаваньне сьвядомай дысцыпліны;

е) за вывучэньне сацыяльна-бытавых умоў жыцьця вучняў;

ж) за вядзеньне вучоту ведаў, грамадзкай нагрузкі вучняў у адпаведнасьці з існуючымі дырэктывамі;

з) за санітарнае становішча групы і прышчапленьне навыкаў асабістай гігіены вучняў;

і) за разгортваньне сац. спаборніцтва і ўдарніцтва ў групе.

2. У абавязкі кожнага настаўніка ўваходзіць:

а) складаць вытворчыя і рабочыя пляны;

б) вывучаць вытворчасьць, да якой прымацавана школа, арганізоўваць вытворчае палітэхнічнае навучаньне і скарыстоўваць да прадукцыйнай працы ў групе кіно-перасоўкі, музэі, выстаўкі ды інш.;

в) праводзіць сыстэматычную працу па прывучэньні дзяцей да самастойнай працы, сачыць за выкананьнем вучнямі рэжыму дню, наладзіць пасільную нагрузку вучняў вучэбнай і грамадзкай працай;

г) арганізоўваць дзяцей на выкананьне правіл унутранага распарадку ў школе, наладзіць унутраны распарадак у групе, выхоўваць у дзяцей беражлівыя адносіны да школьнае маёмасьці, весьці настойлівую выхаваўчую работу сярод вучняў, змагаючыся з парушаючымі школьны парадак; прыцягваць да справы выхаваньня дзяцей грамадзкія арганізацыі, бацькоў вучняў, камсамольскія і піянэрскія арганізацыі;

д) сачыць за санітарным становішчам у клясе, прышчапляць вучням культурна-гігіенічныя навыкі асабістай гігіены вучняў;

е) арганізаваць дапамогу адстаючым вучням;

ж) дапамагаць у правядзеньні плянавай працы (органаў дзіцячага самакіраваньня ў групе;

з) праводзіць агульна-школьныя мерапрыемствы (рэалізацыя пазыкі, правядзеньне кампаній і г. д.);

і) праводзіць бацькоўскія сходы.

V. Групавыя арганізатары

1. Да кожнай групы II канцэнтру ФЗС і ШКМ прымацоўваецца групавы арганізатар з ліку пэдагогаў данае групы. Кандыдатура групавога арганізатара зацьвярджаецца заг. школы.

2. Групавыя арганізатары нясуць адказнасьць:

а) за выкананьне вучэбных плянаў і праграм у групе;

б) за якасьць вучобы вучняў, за пасьпяховую прапрацоўку вучнямі праграмнага матар'ялу;

в) за правільную арганізаваную сыстэму камуністычнага выхаваньня ў групе;

г) за выхаваньне сярод вучняў сьвядомай дысцыпліны;

д) за выкананьне вучнямі рэжыму дню і правілу ўнутранага распарадку школы;

е) за санітарнае становішча групы; за прышчапленьне вучням культурна-гігіенічных звычак;

ж) за разгортваньне ў групе сац. спаборніцтва і ўдарніцтва.

3. Групавыя арганізатары абавязаны:

а) разам з пэдагогамі і самімі вучнямі арганізоўваць вучэбную работу ў групе, выхоўваць у вучняў навыкі самастойнай працы; дабівацца, каб кожнаму вучню была зразумела мэта кожнае працы, каб праца была цікавай і пасільнай, выхоўваць адказнасьць за выкананьне вучэбнай работы, арганізоўваць праверку выкананьня кожным вучням даручанай яму работы;

б) наладзіць сталую сыстэматычную работу па барацьбе з адсевам і другагодніцтвам, дзеля чаго рэгулярна сачыць за ра-

ботаю кожнага вучня па ўсіх разьдзелах работы, своечасова ўлічваць адставаньне, ненаведваньне школы, прымаць своечасовыя меры да зьнішчэньня прычын, перашкаджаючых вучобе, арганізаваць дапамогу адстаючым вучням;

в) разам з пэдагогамі групы, самакіраваньнем і піянэрскімі і камсамольскімі арганізацыямі праводзіць сыстэматычную працу па ўмацаваньні сьвядомай дысцыпліны ў групе;

г) сачыць за выкананьнем вучнямі групы рэжыму дню і правіл унутранага распарадку школы, выхоўваць беражлівыя адносіны да школьнае маёмасьці;

д) наладзіць раўнамерную і пасільную нагрузку вучняў грамадзкай працай, выхоўваць сумленныя адносіны да выконваемай грамадзкай працы;

е) вывучыць і ведаць кожнага вучня сваёй групы з пункту гледжаньня пасьпяховасьці ў вучобе, грамадзкай працы, матар'яльна-бытавых умоў і г. д., у патрэбных выпадках наведваць вучняў і іх бацькоў на даму, арганізоўваць своечасовае аказаньне дапамогі як матар'яльнай, так і ў вучобе вучняў з найменш забясьпечаных сямей;

ж) праз старасту групы склікаць агульныя сходы вучняў для абгаварэньня вучэбна-выхаваўчых пытаньняў групы;

з) дапамагаць органам дзіцячага самакіраваньня, піянэрскай і камсамольскай арганізацый у разгортваньні камуністычных форм працы—сац. спаборніцтва і ўдарніцтва між групамі і асобнымі вучнямі;

і) склікаць і праводзіць сходы бацькоў вучняў сваёй групы ў мэтах інфармацыі іх аб працы вучняў, становішча дысцыпліны і прапаганды ідэй камуністычнага выхаваньня сярод бацькоў;

к) па пляну, устаноўленаму заг. школы, склікаць нарады выкладчыкаў данае групы для прапрацоўкі агульнага пляну работы ў групе і правядзеньня мерапрыемстваў па палепшаньні якасьці вучобы і ўмацаваньні сьвядомай дысцыпліны;

л) разам са школьным урачом праводзіць мерапрыемствы па ахове здароўя дзяцей (мэд. агляд, лячэньне, лягеры, дамы адпачынку, санаторыі і г. д.);

м) пэрыядычна дакладваць заг. школы аб становішчы работы ў групе.

VI. Школьны бібліятэкар

1. Школьны бібліятэкар нясе адказнасьць:

а) за своечасовае кампдектаваньне і папаўненьне школьнай бібліятэкі адпаведнай літаратураю, за своечасовую выпіску газэт і часопісаў;

б) за парадак і цэласьць бібліятэчнай маёмасьці;

в) за акуратнае вядзеньне кніжнага інвэнтару;

г) за склад бібліятэкі.

2. Школьны бібліятэкар абавязан:

а) вызначыць пэўныя гадзіны работы школьнай бібліятэкі;

б) выпрацаваць правілы ўнутранага распарадку бібліятэкі і сачыць за выкананьнем іх;

в) падбіраць літаратуру да прапрацоўваемых тэм па асобных дысцыплінах у мэтах забесьпячэньня лепшага засваеньня вучнямі праграмнага матар'ялу;

г) разам з ДСК і піянэр-арганізацыямі праводзіць масавую работу з кнігай, дзеля таго, каб заахвоціць дзяцей да чытаньня кнігі, шляхам арганізацыі выставак, літ. вечароў, рэкамендацыйных сьпісаў, плякатаў і інш.;

д) праводзіць сыстэматычную работу сярод дзяцей дзеля таго, каб навучыць іх чытаць кнігу, карыстацца ёю, а таксама выхоўваць навыкі самастойнай працы з кнігай;

е) дапамагаць настаўніку ў справе камуністычнага выхаваньня дзяцей шляхам рэкамэндацыі літаратуры для пазашкольнага чытаньня і наладжваньня праверкі чытаемай літаратуры;

ж) падбіраць адпаведную літаратуру і праводзіць масавыя мерапрыемствы (выстаўкі кніг, віктарыны, літмантаж, чытка і г. д. да ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній і рэвалюцыйных сьвят;

з) весьці вучот чытаемасьці кніг школьнікамі.

VII. Школьны доктар

1. У абавязкі школьнага доктара ўваходзіць:

а) праводзіць асабіста ці праз мясцовыя лячэбна-санітарныя ўстановы сталы сыстэматычны целесны мэдычны агляд дзяцей ня менш 1-го раза ў м-ц і больш паглыблены нагляд ня менш 2-х разоў у год; у пачатку (верасень—лістапад) і ў канцы навучальнага году;

б) арганізаваць нагляд за станам здароўя вучняў;

в) устанавіць сыгналізацыйны вучот эпідэмічных захворваньняў сярод вучняў і забясьпечыць сваячасовую і належную дэзынфэкцыю школьных памяшканьняў;

г) устанавіць пэрыядычны санітарны нагляд школьных памяшканьняў ня менш 2-х раз у м-ц;

д) ажыцьцяўляць непасрэдна або праз адпаведныя лячэбныя ўстановы кантроль над заняткамі фізкультурай;

е) кіраваць працай школы па аздараўленьні акаляючага школьнага асяродзьдзя і ўмоў хатняга быту вучняў;

ж) арганізаваць прафіляктычныя мерапрыемствы па ахове школы і дзяцей ад інфэкцыйных захворваньняў;

з) прымаць удзел ва ўсёй працы школы па ўрэгуляваньні рэжыму (праца і адпачынак дзяцей, вучэбная і грамадзкая нагрузка);

і) ажыцьцяўляць непасрэднае кіраўніцтва ўсімі аздаравіцельнымі мерапрыемствамі;

к) праводзіць кантроль над працай дзяцей у майстэрнях, рабочых пакоях, на прадпрыемствах, саўгасах, калгасах і інш.;

л) прымаць удзел у складаньні рацыянальнага мэню для вучняў і назіраць за становішчам школьнае кухні, сталовай і за якасьцю яды;

м) весьці рэгулярную працу з бацькамі шляхам арганізацыі лекцыі, гутаркі, кансультацый ды інш.;

н) арганізоўваць і весьці сярод дзяцей школы прапаганду за санітарыю, гігіену і здаровы быт у школе і сям'і.

VIII. Загадчык гаспадаркі

1. Адказвае перад загадчыкам школы за ўзорнае становішча ўсяе школьнае гаспадаркі, школьных будынкаў, школьнага двара, мэблі, інвэнтару, за санітарны стан школьных памяшканьняў.

2. Праводзіць абсталяваньне школьных майстэрняў па зацьверджаных заг. школы плянах, праводзіць закупку дапаможнікаў, вучэбных прылад, школьнае мэблі і г. д.

3. Наладжвае забесьпячэньне школы вадою, апалам і асьвятленьнем і адказвае перад заг. школы за нармальную тэмпэратуру ў школе і нармальнае асьвятленьне клясных пакояў, габінэтаў і г. д.

4. Арганізуе забесьпячэньне дзяцей абуткам, вопраткай, гарачымі сьнеданьнямі, прыцягвае грамадзкую ўвагу і ініцыятыву ў гэтай справе, вядзе ўсю працу ў цеснай сувязі і пры канкрэтным удзеле Камсоду.

5. Праводзіць інвэнтарызацыю школьнае маёмасьці і сочыць за яе ахоўвай; праводзіць рамонт і дабудову будынкаў.

6. Расстаўляе сілы тэхнічных працаўнікоў, разьмяркоўвае між імі працу і ўстанаўляе распарадак для тэхн. пэрсаналу.

Увага. У тых школах, дзе няма заг. гаспадаркі, або камэнданта, усе функцыі яго выконвае заг. школы сваімі сіламі або праз адпаведны тэхнічны пэрсонал школы.

IX. Тэхнічны пэрсанал

1. Падрыхтоўвае школу для заняткаў: падмятае і мые падлогу, паліць печы, кіпяціць ваду, праветрывае клясы, прыводзіць у парадак клясныя памяшканьні пасьля заняткаў, адказвае за парадак на двары, каля школы.

2. Сочыць за парадкам і ахоўвай маёмасьці, дае званкі і выконвае асобныя даручэньні заг. школы, або заг. гаспадаркі, выходзячы з устаноўленага распарадку дню для тэхпэрсоналу.

Зацьверджаю: Нам. Наркома
Асьветы БССР Рудніцкі
14-XII—1932 г.

ПАЛАЖЭНЬНЕ АБ ШКОЛЬНЫМ САВЕЦЕ ФЗС, ШКМ БССР

1. У мэтах ідэалегічнага і палітычнага ўзьдзейнічаньня арганізаванай пралетарскай грамадзкасьці на жыцьцё і працу школы, у мэтах шырокага прыцягненьня працоўных мас да актыўнага ўдзелу ва ўсіх справах школы—пры кожнай школе арганізуецца школьны савет.

У задачы школьнага савету ўваходзіць:

а) Абмеркаваньне ўсіх асноўных пытаньняў школьнага жыцьця і праектаў мерапрыемстваў, якія накіраваны на забесьпячэньне нармальнай працы школы, на падвышэньне якасьці яе работы, на яе палітэхнічную перабудову ў сапраўдную школу Маркса—Леніна, на барацьбу з усялякімі спробамі сказіць Маркысцка-Ленінскае выхаваньне, прышчапіць вучням элемэнты антыпралетарскай ідэалёгіі, адлучыць палітэхнізацыю школы ад сыстэматычнага і цьвёрдага засваеньня вучнямі навук.

б) Абмеркаваньне праграм, вытворчых і навучальных плянаў, мэтадаў работы і барацьба за правядзеньне генэральнай лініі партыі ў практыцы работы школы.

в) Выпрацоўка мерапрыемстваў па забесьпячэньні поўнага выкананьня школай яе плянаў, як з вучэбнага боку, гэтак і з боку ўцягненьня школы ў грамадзкае жыцьцё раёну, гораду, прадпрыемства, саўгаса, калгаса, МТС, у прыватнасьці выпрацоўка мерапрыемстваў па нармальнай нагрузцы вучняў грамадзка-карыснай работай.

г) Абмеркаваньне і правядзеньне ў жыцьцё паказаньняў і распараджэньняў цэнтральных і мясцовых кіруючых (партыйных, дзяржаўных, прафэсыйных і грамадзкіх) органаў па пытаньні народнай асьветы.

д) Прыняцьце мер да палепшаньня матар'яльна-бытавых умоў вучняў і арганізацыя спэцыяльнай дапамогі вучням з бяднейшых колаў насельніцтва.

е) Прыняцьце мер да павышэньня кваліфікацыі настаўніцтва і палепшаньня яго матар'яльна-бытавога становішча.

ж) Абмеркаваньне важнейшых пытаньняў матар'яльна-гаспадарчага і санітарнага становішча школы і ўцягненьня грамадзкіх і гаспадарчых арганізацый і мас працоўных у справу палепшаньня матар'яльнага становішча школы.

з) Ажыцьцяўленьне грамадзка-пралетарскага кантролю на ўсіх вучастках жыцьця і працы школы.

2. Школьны савет зьяўляецца дарадчым органам і працуе пад непасрэдным кіраўніцтвам загадчыка школы, які зьяўляецца старшынёю школьнага савету і які адзінаасобна адказвае за ўсю работу школы.

3. У адпаведнасьці з гэтым уся праца школьнага савету праводзіцца ў напрамку аказаньня дапамогі загадчыку школы, замацаваньня адзінаначальля ва ўсёй сыстэме кіраўніцтва школай, барацьбы з абязьлічкай, узмацненьня адказнасьці кожнага супрацоўніка школы за даручаны яму вучастак работы.

4. Школьны савет складае гадавы плян сваёй работы, які зьяўляецца сустаўной часткай агульнага вучэбна-вытворчага пляну школы.

5. Удзельнічае ў складаньні вучэбна-вытворчага пляну школы.

6. Ставіць справаздачы настаўнікаў, урача і прадстаўнікоў вучняў аб выкананьні імі пляна сваёй працы і дасягнутых вынікаў працы, як на нарадах школьнага савету, гэтак і перад бацькамі і пралетарскай грамадзкасьцю свайго раёну.

7. Садзейнічае разьвіцьцю сац. спаборніцтва і ўдарніцтва ў школе і прэміруе за лепшае выкананьне пляна.

8. Вядзе кантроль за тым, каб заняткі ў школе праводзіліся на падставе строга пэўных, дасканала распрацаваных праграм, навучальных плянаў і па строга складзенаму раскладу заняткаў.

9. Вядзе кантроль за правядзеньнем цеснай сувязі паміж тэарытычным навучаньнем, вытворчай працай і грамадзкай работай вучняў на такой падставе, каб уся грамадзка-вытворчая праца дзяцей была падпарадкавана навучальным і выхаваўчым мэтам школы.

10. Садзейнічае ўвядзеньню ў школе сьвядомай дысцыпліны і захаваньню рэжыма працы школы сярод вучняў мерамі грамадзка папярэджваючага характару на падставе вывучэньня матар'яльна-бытавых умоў вучняў, стану іх здароўя, іх інтарэсаў і г. д.

11. Садзейнічае ўзмацненьню работы органаў дзіцячага самакіраваньня, прымацоўвае да гэтых органаў сваіх прадстаўнікоў.

12. Прыцягвае шырокія масы рабочых і калгасьнікаў, у першую чаргу рабочых і калгасьнікаў-ударнікаў, інжынэрна-тэхнічны пэрсонал прадпрыемства, калгаса, саўгаса, МТС, гаспадарнікаў і г. д. у справу палітэхнізацыі школы (абсталяваньне, забесьпячэньне інструктарамі ў парадку сац. саўмясьціцельства і г. д.).

13. Аказвае дапамогу пры заключэньні дагавароў паміж школай і шэфствуючай арганізацыяй і прадпрыемствам.

14. Садзейнічае арганізацыі вытворчае працы вучняў як у майстэрнях, рабочых пакоях, гэтак і на прадпрыемстве.

15. Пэрыядычна правярае выкананьне дагавароў паміж школай і прадпрыемствам.

16. Садзейнічае ажыцьцяўленьню пытаньняў, якія высунуты школай перад кіруючымі органамі.

17. Вылучае членаў школьнага савету для сталай дапамогі загадчыку школай па кіраўніцтву паасобнымі вучасткамі работы

па асобных групах, самакіраваньню, мэтадычным аб'яднаньням і г. д. і для ажыцьцяўленьня найбольш важных мерапрыемстваў, паляпшаючых работу школы.

18. Арганізуе брыгады, альбо вылучае асобных членаў школьнага савету для вывучэньня па заданьню загадчыка школы па асобных вучасткаў школьнай работы ў мэтах вучоту дасягненьняў, альбо скасаваньня недахопаў.

19. Пастановы школьнага савету праводзяцца ў выкананьне пасьля зацьвярджэньня іх загадчыкам школы. Калі загадчык школы ня згодзен з пастановай школьнага савету, ён спыняе яго выкананьне і адначасова даводзіць аб гэтым да ведама адпаведнага аддзелу народнае асьветы. Апошні не пазьней 3-х дзён па атрыманьні аб гэтым зьвестак павінен вынесьці сваё рашэньне па спрэчных пытаньнях, якое зьяўляецца канчатковым.

20. У склад Школьнага Савету ўваходзяць:

а) Прадстаўнікі мясцовага савету альбо выканаўчага камітэту, мясцовых партыйных і камсамольскіх арганізацый, мясцовай прафарганізацыі саюзу Працасьветы, фабрычна-заводзкага камітэту, рабочага камітэту альбо праўленьня калгасу, шэфствуючай над школай арганізацыі, атраду юных піянэраў—па аднаму ад кожнай арганізацыі і сацсумясьціцелі, якія працуюць у школе.

б) Абраныя на спэцыяльных сходах рабочыя і калгасьнікі таго прадпрыемства, да якога прымацавана школа ў ліку ад 1 да 5 асоб.

в) Выкладчыкі школы, піянэр-важатыя, прадстаўнікі тэхпэрсаналу школы ад 1-го да 5-ці асоб, школьны ўрач, пэдолёг.

г) Прадстаўнікі ад груп вучняў, пачынаючы з III году навучаньня і 1 прадстаўнік ад агульна-школьнага воргану самакіраваньня вучняў.

д) 1—3 прадстаўнікі ад бацькоў па выбару Камсода.

21. Кожны член школьнага савету, акрамя наведваньня паседжаньняў, нясе практычную работу па школе па вызначэньні школьнага савету, альбо яго прэзыдыума.

22. Школьны савет склікаецца яго старшынёй ня менш аднаго разу ў месяц.

23. Для папярэдняй прапрацоўкі пытаньня абіраецца прэзыдыум школьнага савету ў складзе 3—5 членаў, уключаючы старшыню (загадчыка школы) і сакратара школьнага савету. Прэзыдыум зьбіраецца па меры патрэбы ў вызначаныя ім тэрміны.

24. У мэтах барацьбы з абязьлічкай у рабоце школьнага савету і павышэньня адказнасьці паасобных яго членаў за выкананьне даручаных ім заданьняў школьны савет і яго прэзыдыум па кожнай пастанове намячае адказную асобу, альбо брыгаду з ліку членаў школьнага савету і грамадзкага актыву, прыцягнутага да ўдзелу ў працы школы.

25. Пад кіраўніцтвам школьнага савету працуюць наступныя сталыя школьныя арганізацыі:

а) Камітэт садзейнічаньня (камсод), які зьяўляецца бацькоўскім аб'яднаньнем пры школе і які працуе на падставе асобнага аб ім палажэньня.

б) Камісія па арганізацыі вытворчае працы вучняў, як у школьных майстэрнях і рабочых пакоях, гэтак і на прадпрыемствах, саўгасе, калгасе, МТС і г. д.

в) Камісія па грамадзка-палітычнай рабоце школы на прадпрыемстве, саўгасе, калгасе, МТС, раёне.

Увага. Памянёныя ў п. п. «б» і «в» камісіі могуць быць аб'яднаны ў адну.

26. Тэхнічнае абслугоўваньне работы школьнага савету і яго прэзыдыума ўскладаецца на канцылярыю школы, прычым патрэбныя на гэта выдаткі прадугледжваюцца каштарысам школы.

Зацьвярджаю: Нам. Наркома Асьветы БССР Рудніцкі 2-X—1932 г.

ПАЛАЖЭНЬНЕ АБ КАМІТЭТАХ САДЗЕЙНІЧАНЬНЯ ПРЫ ЎСТАНОВАХ САЦЫЯЛЬНАГА ВЫХАВАНЬНЯ

I. Агульная частка

1. У мэтах згуртаваньня навакол устаноў сацыяльнага выхаваньня грамадзкасьці, садзейнічаньня пасьпяховаму правядзеньню ў жыцьцё ўсеагульнага абавязковага навучаньня, палітэхнізацыі школы таксама належнай пастаноўцы навучальна-выхаваўчай працы, палепшаньня матар'яльнага дабрабыту школы, матар'яльна-бытавых умоў вучняў,—пры ўстановах сацыяльнага выхаваньня арганізуюцца Камітэты Садзейнічаньня.

2. Камітэты Садзейнічаньня арганізуюцца на год у пачатку навучальнага году.

3. Для правядзеньня выбараў у Камітэты Садзейнічаньня, установы склікаюць агульныя сходы бацькоў дзяцей данае ўстановы, прадстаўнікоў партыйных і савецкіх і прафэсыянальных арганізацый, а таксама і грамадзян (рабочых, калгасьнікаў, сялян беднякоў і сераднякоў) жадаючых падтрымаць матар'яльную базу ўстановы.

Увага. У Камітэт Садзейнічаньня могуць быць абраны толькі тыя грамадзяне, якія маюць выбарчыя правы, паводле канстытуцыі БССР.

4. У склад Камітэту Садзейнічаньня ў гарадох і паселішчах гарадзкога тыпу ўваходзіць 9—21 чал.:

а) загадчык установы;

б) прадстаўнік ад гарадзкога ці местачковага савету;

в) прадстаўнік ад прадпрыемства, з якім зьвязана школа;

г) прадстаўнік ад райкому ЛКСМ;

д) прадстаўнік мясцкому, або селькому саюзу Працасьветы;

е) 3—15 прадстаўнікоў ад агульнага сходу бацькоў;

ж) прадстаўнікі ад дзіцячай самаарганізацыі (арганізацыі піянэраў, самакіраваньне);

5. У сельскіх мясцовасьцях Камітэты садзейнічаньня складаюцца з 9—15 чал.:

а) Загадчыка ўстновы;

б) прадстаўніка ад сельскага савету;

в) прадстаўніка ад мясцкому, ці селькому саюзу Працасьветы;

г) прадстаўніка ад прадпрыемства, саўгаса ці калгаса, да якіх прымацавана ўстанова;

д) прадстаўніка ад каапэрацыі;

е) прадстаўніка ад яч. ЛКСМ;

ж) 3—9 прадстаўнікоў ад агульнага сходу бацькоў;

з) прадстаўніка ад дзіцячых самаарганізацый (арганізацыі піянэраў, самакіраваньня).

6. Камітэт Садзейнічаньня абірае з свайго складу старшыню, сэкратара і скарбніка.

Увага. Загадчык установы зьяўляецца намесьнікам старшыні камітэту.

II. Абавязкі камітэтаў садзейнічаньня

8. У абавязкі і задачы Камітэту Садзейнічаньня ўваходзіць:

а) арганізацыя бацькоў на дапамогу ўстанове па правядзеньні ўсеагульнага абавязковага навучаньня, павышэньню якасьці вучобы, арганізацыі лябараторыяў, майстэрняў, габінэтаў, рабочых пакояў ды інш., мерапрыемстваў па палітэхнічнай падрыхтоўцы вучняў, дапамога кіраўніцтву ўстановы і пэдагагічнага пэрсаналу ў ёй у наладжваньні камуністычнага выхаваньня дзяцей, і складаньня навокал установы актыву з рабочых, калгасьнікаў і працоўнага насельніцтва.

б) Садзейнічаньне бесьперабойнаму вядзеньню заняткаў і своечасоваму пачатку і скончэньню навучальнага году.

в) Аказаньне дапамогі загадчыку ўстановы і пэдагогам у працы па ўмацаваньню сярод вучняў сьвядомай дысцыпліны, выхаваньня беражлівых адносін да школьнае маёмасьці, устанаўленьне ў школе правільнага рэжыму, у выкананьні вучнямі правіл унутранага распарадку ў школе, дзеля чаго Камітэт аргані-

зуе дзяжурствы культармейцаў бацькоў і прадстаўнікоў грамадзкасьці.

г) Адшуканьне дадатковых сродкаў для палепшаньня дабрабыту навучальнае ўстановы.

д) Папаўненьне школьнага фонду беднаты і дапамога ў арганізацыі пры школе інтэрнату, падвозу дзяцей ў школы, забесьпячэньне бяднейшых дзяцей вопраткай, абуткам і вучэбнымі прыладамі.

е) Дапамога загадчыку школы ў арганізацыі гарачых сьнеданьняў у школе ў часе заняткаў.

ж) Дапамога ў правядзеньні ў жыцьцё санітарнага мінімума і аздаравіцельных мерапрыемстваў.

з) Дапамога ўстанове ў высьвятленьні матар'яльнага стану дзяцей для правільнага разьмеркаваньня сродкаў на дапамогу бяднейшым дзецям.

і) Садзейнічаньне рэгулярнаму выпаўненьню з боку насельніцтва дагавароў гаспадарчага характару на карысьць навучальнае ўстановы.

к) Дапамога кіраўніцтву ўстановы ў правядзеньні агульных групавых сходаў бацькоў.

л) Арганізацыя мерапрыемстваў па распаўсюджваньню пэдагогічных ведаў сярод бацькоў.

9. Камітэт Садзейнічаньня выдзяляе сваіх прадстаўнікоў у школьны савет, вучкомы, мэтадычныя камісіі, вытворчыя нарады ды інш.

10. На сваіх паседжаньнях Камітэт Садзейнічаньня па меры патрэбы заслухоўвае даклады і інфармацыі загадчыка і пэдагогаў і членаў камітэту аб становішчы вучэбна-выхаваўчай працы, вытворчага навучаньня, дысцыпліны ў школе і па групах, грамадзка-палітычнай працы дзяцей, матар'яльна-бытавым абслугоўваньні дзяцей ды інш.

11. Два разы ў год Камітэт робіць справаздачу аб сваёй працы на сходзе бацькоў і дзяцей данае ўстановы.

12. Камітэт Садзейнічаньня праводзіць сваю работу па пляну, зацьверджанаму агульным сходам бацькоў.

13. Камітэт Садзейнічаньня карыстаецца па меры патрэбы тэхнічным апаратам, штампам і пячаткай данай установы.

III. Абавязкі і зьмест працы членаў камітэту садзейнічаньня

14. Камітэт Садзейнічаньня разьмяркоўвае сваю працу паміж паасобнымі членамі, паводле іх жаданьня, выдзяляючы ў патрэбных выпадках камісіі.

15. Члены Камітэту Садзейнічаньня выкарыстоўваюць сходы (ва ўстановах і прадпрыемствах, саўгасах, калгасах ды інш.) для інфармацыі іх аб працы Камітэту і для абмеркаваньня пытань-

няў, якія стаяць перад Камітэтам, для атрыманьня паказаньняў грамадзян на недахопы ў працы ўстановы і пажаданьняў.

16. Члены Камітэту Садзейнічаньня павінны бываць на паседжаньнях Камітэту і выконваць іх даручэньні.

Увага. У выпадку, калі член Камітэту ня можа быць на паседжаньні, або выканаць яго даручэньні, павінен загадзя паведаміць аб гэтым Камітэт.

IV. Сродкі камітэтаў садзейнічаньня

17. Адшуканьне дадатковых сродкаў у фонд палепшаньня матар'яльнага дабрабыту ўстановы Камітэт праводзіць шляхам: а) дабраахвотных пэрыядычных узносаў, як з боку бацькоў дзяцей данае ўстановы, так і з боку паасобных грамадзян; б) дабраахвотных узносаў з боку прафэсыйных арганізацый, каапэрацыі, камітэтаў Узаемадапамогі, кас узаемадапамогі, т-ва «Прыхільнік Дзяцей», шэф-таварыстаў і г. д.; в) пастаноўкі спэктакляў, канцэртаў, лекцый ды інш.

18. Усе сродкі Камітэту паступаюць у фонд дапамогі ўстанове і бяднейшым дзецям данае ўстановы і трацяцца выключна на палепшаньне дабрабыту ўстановы, матар'яльна-бытавое абслугоўваньне дзяцей: а) будаўніцтва; б) рамонт; в) арганізацыю майстэрняў; г) габінэтаў; д) рабочых пакояў; е) інтэрнатаў, ж) гарачых сьнеданьняў; з) на дапамогу бяднейшым вучням вопраткай, абуткам, падручнікамі, прыладамі і інш.

19. Агульны сход бацькоў устанаўляе дабраахвотныя ўзносы натураю ў фонд данае ўстановы і інш. віды дапамогі: а) дастаўка апалу; б) будаўнічых матар'ялаў; в) падвоз вучняў з далёкіх насельных пунктаў; г) прадуктаў для гарачых сьнеданьняў ды інш.

20. Плян выдаткаваньня сродкаў складае старшыня Камітэту і ставіць на зацьверджаньне Камітэту.

21. Усе сродкі, сабраныя Камітэтам Садзейнічаньня, зьяўляюцца сродкамі ўстановы і расходуюцца загадчыкам па складзенаму Камітэтам пляну, які зацьвярджаецца загадчыкам установы.

Адказны рэдактар
У. І. ХОМО

1964 г.

B000000 1525540